WHITERUTHENIAN ISTITUTE OF ARTS AND SCIENCES

ANDREJ BAHROVIČ

POPULATION OF THE BYELORUSSIAN SSR
in the 1959 Census

PUBLISHED BY KREČEUSKI FOUNDATION, INC.
NEW YORK — MÜNCHEN 1962

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАВУКІ Й МАСТАЦТВА

АНДРЭЙ БАГРОВІЧ

ЖЫХАРСТВА БЕЛАРУСКАЕ ССР

у сьвятле перапісу 1959 году

КОШТАМ ФУНДАЦЫІ ІМ. ПЁТРЫ КРЭЧЭЎСКАГА

НЬЮ ЁРК – МЮНХЭН 1962

Druck: „LOGOS", Buchdruckerei u. Verlag, G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14.

ЗЬМЕСТ

CONTENTS

SUMMARY

It was generally known, that as a consequence of the World War Two, party terror and mass deportations Byelorussia suffered severe population losses. But only after the figures of the 1959 census were published was it possible to give these losses in more exact numbers. The Sowjet census of January 15, 1959 found the population within the borders of the Byelorussian SSR to be 8 055 000. Twenty years before, at the beginning of 1939, within the same territory there lived a population of 9 344 000. This indicates a decrease of 1 289 00, or 13.4%. While publishing figures of the last census the Central Statistical Office of the USSR gave for 1939 the lower figure of 8 910 000 with apparent aim to conceal the extent of depopulation in the republic. All previously published Sowjet population figures for the same territory in 1939 were much higher than 8 910 000.

It is important to keep in mind, that the decrease of 1 289 000 does not reveal all the actual demographic losses. Also the normal expected natural yearly increase of population disappeared entirely. The typical rate of the yearly natural population growth in Byelorussia in the 20th Century was 2%. On this basis from 9 344 000 of 1939 in 1959 we would expect 13 878 000, and with an addition of 222 000 known immigrants for the same period of time, even 14 100 000. Since the census revealed only 8 055 000, it means, that the twenty years demographic deficit of the republic is 6 045 000. One third of that, 2 000 000, are direct or indirect World War Two losses. Two thirds, or 4 000 000, are direct or indirect consequences of political terror, mass deportations and forcible resettlements to the remote, mostly Asian, lands of the Sowjet empire.

Population losses not originated by the war consist of four main groups: 1) losses due to the permanent decrease of the birth rate under the Sowjet system, approximatly 1 000 000; 2) losses due to the political terror, approx. 500 000; 3) losses due to the mass deportations and forcible ressetlements, approx. 1 500 000, and 4) political refugees, now in Poland, West European and other countries of the World, approx. 1 000 000. With the depopulation of the republic the density decreased also from 45 per square kilometer in 1939, to 38.8 in the 1959. Depopulation in the western territories of the Byelorussian SSR, which were under Polish administration before World War Two, is twice higher than that of the eastern parts of the republic.

The 1959 census revealed also a very low grade of urbanization in the Byelorussian SSR, if we compare it with the urbanization of other republics of the USSR. This was partially caused by the severe war destructions of the Byelorussian cities, but the main reason is in Moscow's policy to keep industrialization of the republic low with the purpose to have free peoples for mass deportations and resettlements to the other colonial lands of Empire. Since 1927 Sowjet official sources have never published figures of vital statistics for the Byelorussian SSR with the clear intention to conceal demographic consequences of Moscow's policy in Byelorussia and the full extent of depopulation. But generally it is known that the birth rate in Byelorussia dropped sharply from 40 per 1000 in the 1920's.

The census also revealed great changes in the nationality composition of the republic's population. The figures for 1959, according to the Central Statistical Office of the USSR were as follows:

Byelorussians	6 532 000	81.1%
Russians	659 000	8.2%
Poles	539 000	6.7%
Jews	150 000	1.9%
Ukrainians	133 000	1.7%
Others	42 000	0.5%

In comparisson with the pre war status Byelorussians retained their percentage, Russians increased to about 3%, and Jews dropped more than 6%, mainly as a consequence of Nazi mass exterminations during World War Two.

The Russian minority, while not very strong in percentage is highly priviliged politically and economically. Nearly all higher party and governemental posts of the republic are in the hands of the Russian colonial administration. It is the same with all industrial enterprises and even collective farms. With the help of its Russian minority Moscow is attempting the russification of the Byelorussians. Most publications in Byelorussia appear now in Russian. Even the proceedings of the parliament, the Sowjet of the Byelorussian SSR, ar held not in the language of the nominal hosts of the republic, but in Russian.

The Sowjet census registered only a small number of Byelorussian deportees, scattered now throughout all the territories of the USSR, as Byelorussians. And Byelorussians of the large Byelorussian ethnic territories, which were incorporated into Russian SFSR, as for example the District of Smolensk, are totally registered as Russians. In this way the census registered only 1 381 000 Byelorussians in the USSR outside the BSSR. According to the census, on January 15, 1959 in the entire USSR, including the BSSR, there lived 7 913 000 Byelorussians.

During Khrushchev's dictatorship, by means of mass deportations, Moscow has been depleting the Byelorussian SSR of all natural yearly increase of population. The economical explanation for the mass deportations from Byelorussia, as for example the cultivation of the virgin lands, usually given by the Sowjet sources, is not the main reason. More important for Moscow are the political considerations, with the genocidal aim to scatter, denationalize and russify all non Russians of the USSR and to subordinate all republics totally to the rulling nationality of the empire, the Russians. In this way Moscow is attempting to consolidate its empire nationally and politically, to strengthten it economically and militarily, and to come nearer to its final goal — domination and rule over the whole world.

УВОДЗІНЫ

Дакладны поўны абраз усіх дэмаграфічных зьменаў і стратаў жыхарства тэрыторыі Беларусі за гады панаваньня на ей Масквы савецкае зможа даць толькі будучыня, тады, калі гісторыя здыме замкі сакрэтнасьці із савецкіх архіваў і статыстычных установаў.

Але й перапіс 1959 году, некаторыя дадзеныя якога апублікаваў савецкі друк, дае, калі й не ўсебаковае й поўнае, дык усё-ж дастаткова яскравае ўяўленьне аб памерах таго нязвычайна вялікага ўбытку жыхарства Беларусі, які скрывала доўгімі гадамі ўпорыстым маўчаньнем савецкая дэмаграфічная статыстыка. Лікі вось гэтага перапісу й разгледжаныя ў працы ў супастаўленьні зь гістарычнымі падзеямі й фактамі ды існуючымі дадзенымі папярэдніх перапісаў тэрыторыі.

Аддаючы ў рукі чытачоў гэты кароткі нарыс дэмаграфічнага стану Беларускае ССР, аўтар пачуваецца да абавязку выказаць сваю глыбокую ўдзячнасьць д-р Вітаўту Кіпелю за аказаную выдатную дапамогу цэннымі заўвагамі ды патрэбнымі статыстычнымі й дэмаграфічнымі матарыяламі.

ПЕРАПІСЫ ЖЫХАРСТВА БЕЛАРУСКАЕ ТЭРЫТОРЫІ

Усесаюзны савецкі перапіс жыхарства зь 15 студзеня 1959 году прынёс цэлую чараду цікавых статыстычных дадзеных, важных для выяўленьня як сучаснага дэмаграфічнага стану Беларускае ССР, так і разьвіцьця яе жыхарства на працягу 20-ці міжперапісных гадоў. Два магутныя дзейнікі фармавалі й дэфармавалі дэмаграфічную структуру рэспублікі ў міжперапісным дваццацігодзьдзі. Адзін з гэтых дзейнікаў, гэта дэструкцыйны імпат Другое Сусьветнае Вайны, дзеяньні якое гадамі ахаплялі ўсю беларускую нацыянальную тэрыторыю. Другі, і яшчэ важнейшы сваімі катастрафальнымі для жыхарства БССР вынікамі, гэта панаваньне на землях Беларусі камуністычнае расейскае дыктатуры, з масавым тэрорам, масавымі дэпартацыямі, дый сталымі прымусовымі масавымі высяленьнямі.

Пад камбінаваным узьдзеяньнем вось гэтых двух гістарычных фактараў і зайшлі паважныя адхіленьні ў ранейшым дэмаграфічным разьвіцьці тэрыторыі. У выніку, паўсталі й вялікія зьмены ў лічбах натуральнага руху, у вышыні агульнага ліку жыхарства рэспублікі, у нацыянальным і рэлігійным яго складзе, у гушчыні засяленьня, ступені урбанізацыі, структуры паводля веку, паводля полу, дый іншыя. Сам факт вялікіх, грунтоўных пераменаў, што зайшлі ўва ўсіх галінах дэмаграфічнае статыстыкі Беларускае ССР у часе ад пачатку Другое Сусьветнае Вайны, дэмографам быў агульна ведамы. Дый да перапісу 1959 году ня было аніякое аб'ектыўнае статыстычнае базы для ўняцьця гэтых пераменаў у канкрэтныя лічбовыя вялічыні й гэтак выяўленьня запраўдных іх памераў. Даводзілася абмяжоўвацца аднымі дагадкамі й дапушчэньнямі.

Справу пагаршала тое, што да перапісу 1959 году на працягу ўсяго XX ст. ніякіх ня толькі паваенных, але й міжваенных, дый даваенных перапісаў жыхарства, якія абыймалі-б адначасна ўсю тэрыторыю сучаснае Беларускае ССР, наагул не існавала. Першы агульны перапіс жыхарства Расейскае імпэрыі, праведзены яшчэ ў XIX ст., бо ў 1897 годзе, задалёкі ў часе ад сучаснае гістарычнае запраўднасьці, каб лічбовымі яго дадзенымі можна было шырэй карыстацца для азначэньня цяперашняга дэмаграфічнага стану тэрыторыі.[1] Савецкі-ж перапіс 17 сьнежня 1926 году абыймаў толькі тэрыторыю даваеннае Беларускае ССР, гэта значыць прастору бяз усіх тых земляў былое Заходняе Беларусі, якія тады ўваходзілі ў склад тагачаснае павэрсальскае Польшчы. Па сваей вялічыні, тэрыторыя гэтая станавіла ўсяго каля 60% сучаснае тэрыторыі рэспублікі. Хоць дадзеныя гэтага перапісу былі пазьней апублікаваныя, і яны вельмі важныя для азначэньня тагачаснага дэмаграфічнага стану рэспублікі, дый усё-ж у іх ня змог яшчэ адбіцца, а навет паважней і зазначыцца, кірунак усіх тых дэмаграфічных пераменаў, якія прыносіла із сабою для тэрыторыі Беларусі новая, камуністычная форма расейскага панаваньня.[2]

---

[1] Падсумаваньні вынікаў перапісу 1897 году апублікаваныя ў: Общий свод по империи результатов разработки данных всеобщей переписи населения произведенной 28 января 1897 года. Под редакцией Н. А. Тройницкого. Том I і II. С.-Петербург, 1905. Дадзеныя аб роднай мове жыхарства беларускае тэрыторыі ў томе II, б. 5, таксама табл. XIIа. Крытычны разгляд лікаў перапісу 1887 году датычных Беларусаў, і іх карэктуру на аснове моваведных фактаў, правёў Я. Карскі ў першым томе сваіх «Беларусаў»: Е. Ф. Карский — Белоруссы, т. I. Варшава, 1903, б. 185—195. Поўныя вынікі перапісу 1897 году выдадзеныя тады-ж у 89 тамох: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года. Под. ред. Н. А. Тройницкого. Центральная Статистическая Комиссия. Тт. I—89. С.-Петербург, 1898—1905.

[2] Дадзеныя перапісу 1926 году апублікаваныя ў: Всесоюзная перепись населения 1926 года. Тамы I—56. Москва, 1928—1933. Дадзеным зь Беларускае ССР адведзеныя тамы: X. Белорусская Советская Социалистическая Республика. Отдел I. Народность, родной язык, возраст, грамотность. Москва, 1928. Том XXVII. Отдел II. Занятия. Москва, 1928. Том XLIV. Отдел II. Семейное состояние, месторождение и продолжительность проживания. Увечность. Москва, 1929. Центральное Статистическое Управление СССР. Отдел переписи. Ёсьць статыстычныя лікі аб Беларускай ССР, або Беларусах, і ў іншых тамох гэтае публікацыі. Падсумаваньні вынікаў гэтага-ж перапісу ў сэрыі: Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 года. Краткие сводки. Выпуск I—VII. Москва, 1928—1933. Пра нацыянальны склад жыхарства Беларускае ССР і Беларусаў на тэрыторыі СССР паза БССР, у вып. IV гэтае сэрыі: Народность и родной язык населения СССР. Издание Центрального Статистического Управления. Москва, 1928.

1926 год, гэта быў час гэтак званага НЭП'у, калі сама новая палітычна-сацыяльная сыстэма Савецкае імпэрыі была яшчэ толькі ў зачатках свайго фармаваньня, і дзеля гэтага пара гэтая была яшчэ зусім нехарактэрная для існасьці таго савецкага палітычна-сацыяльнага ладу, які свае асноўныя свомасьці сталінскага тыпу выявіў і разьвіў толькі пачынаючы ад пачатку трыццатых гадоў. Тады гэта, з заведзеным масавым партыйным тэрорам, пачалося й тарнаваньне дэпартацыяў, як пэрманэнтнага мерапрыемства для перакіданьня масаў жыхарства на далёкія тэрыторыі імпэрыі. Мэтад гэты й па сяньня застаўся характэрнаю асаблівасьцяй палітычнага рэжыму расейскага камунізму, тарнаваньне якога дае Маскве магчымасьць у даволі кароткім часе паважна мяняць дэмаграфічны стан паасобных нацыянальных рэспублікаў і акругаў СССР. Другі ўсесаюзны савецкі перапіс з 17 студзеня 1939 году таксама абыймаў толькі тэрыторыю ў межах даваеннае Беларускае ССР. Дый перапіс гэты ня шмат узбагаціў лічбовымі дадзенымі дэмаграфічную статыстыку навет і тагачаснае малое БССР, бо толькі даслоўна колькі й вельмі агульных лічбаў гэтага перапісу аб ліку жыхарства рэспублікі, аб яго нацыянальным складзе й роднай мове, было пазьней апублікавана. Усе іншыя дадзеныя гэтага перапісу аб рэспубліцы ня былі друкаваныя й па сяньня засталіся недаступнымі для дасьледнікаў.[3]

Апрача самых агульных лікаў па нацыянальнасьці й роднай мове жыхарства СССР і яе рэспублікаў, выяўленых савецкім перапісам 1939 году, апошнімі дзесяцігодзьдзямі сталінскае пары ніякіх іншых важнейшых статыстычных, ані перапісных, ані няперапісных дадзеных аб Беларускай ССР, як і СССР наагул, не публікавалася. Толькі посьле сьмерці Сталіна, у 1956 годзе, паказалася першая паваенная афіцыяльная савецкая статыстычная публікацыя зь некаторымі ў ей і дэмаграфічнымі дадзенымі. Быў гэта статыстычны зборнік СССР, складзены й выдадзены Цэнтральнаю Статыстычнаю Управаю пры савеце міністраў СССР.[4] У ім ёсьць некаторыя лічбы й аб жыхарстве Беларускае ССР. Дэмаграфічныя лічбы гэтага зборніка, калі ходзіць аб стан на 1956 год, былі, аднак-жа, ня перапіснага паходжаньня й вартасьці, а толькі адбівалі лічбы афіцыйнае ўрадавае савецкае ацэны.

На тэрыторыі заходніх акругаў сучаснае Беларускае ССР, на былых землях Заходняе Беларусі, землях, што ў міжваенныя гады знайходзіліся ў межах Польскае дзяржавы, апошні даваенны перапіс жыхарства праводзіўся 9 сьнежня 1931 году. Лічбы гэтага перапісу датычныя дэмаграфічнага стану былога Наваградзкага, дый тых частак Віленскага, Беластоцкага й Палескага ваяводзтваў, што сяньня ўходзяць у склад Беларускае ССР, і бу-

---

[3] Некаторыя агульныя лікі перапісу 1939 году апублікаваныя ў: «Правда» і «Известия», 2. 6. 1939 і 29. 4. 1940. Таксама ў: Сообщения Государственной Плановой Комиссии Союза ССР об итогах всесоюзной переписи населения СССР 1939 г. Некаторыя канчатковыя лікі ў «Вестник статистики», № 6, 1956, б. 89—96. Даволі абшырны аналіз дэмаграфічнае статыстыкі СССР да пары Другое Сусьветнае Вайны можна знайсьці ў выданьні Лігі Народаў: Frank Lorimer — The Population of the Soviet Union. History and Prospects. League of Nations. Geneva, 1946.

[4] Народное хозяйство СССР. Статистический сборник. Центральное Статистическое Управление при Совете Министров СССР. Москва, 1956.

дуць тымі апошнімі існуючымі перапіснымі дадзенымі для гэтае тэрыторыі да часу перапісу 1959 году.[5]

З вышэйшага агляду перапісаў можна бачыць, што перапісная статыстыка ў галіне дэмаграфічнай для заходняе часткі сучаснае тэрыторыі Беларускае ССР, былых земляў Заходняе Беларусі, існуе толькі з часу польскага перапісу жыхарства 9 сьнежня 1931 году. Для ўсходняе-ж часткі сучаснае Беларускае ССР, для тэрыторыі ў даваенных межах рэспублікі, перапісныя дадзеныя ў галіне дэмаграфічнае статыстыкі пераважна яшчэ старэйшыя, бо ў бальшыні паходзяць з часу савецкага перапісу 17 сьнежня 1926 году.

Вось дзеля ўсіх вышэй прыведзеных мяркаваньняў, даводзіцца з асаблівою ўвагай аднесьціся да тых новых статыстычных лікаў, якія абвешчаныя ўжо савецкім друкам як дадзеныя, выяўленыя перапісам жыхарства 15 студзеня 1959 году. Некаторыя агульныя тымчасовыя вынікі гэтага перапісу датычныя й Беларускае ССР, ужо апублікаваныя Цэнтральнаю Статыстычнаю Управаю пры савеце міністраў СССР. У першай публікацыі гэтае Управы, якая была зробленая 10 травеня 1959 году,[6] былі пададзеныя перапісныя лічбы агульнага ліку жыхарства СССР і паасобных яго рэспублікаў у супастаўленьні з такімі-ж лічбамі 20 гадоў раней, паводля стану на 1939 год. Адначасна былі пададзеныя лікі агульныя й у працэнтах меставога й неместавога жыхарства па рэспубліках і па іх акругах, лікі жыхарства местаў СССР з жыхарствам больш 50 000, або й меншых адміністрацыйных цэнтраў, у супастаўленьні зь лікамі для тых-жа местаў у 1939 годзе. Адначасна былі дадзеныя агульныя лікі структуры жыхарства ўсяго СССР па полу дый прыведзеныя агульныя сярэднія лічбы натуральнага руху жыхарства для ўсяго СССР, г. зн. сярэднія гадавыя лічбы нараджэньняў і сьмерцяў, а таксама сужэнстваў. Апошнія лічбы пададзеныя, аднак-жа, толькі сярэднія для ўсяе тэрыторыі СССР, без адпаведных лічбаў для паасобных рэспублікаў.

4 лютага 1960 году тая-ж Цэнтральная Статыстычная Управа (якая ў далейшым тут будзе звычайна прыводзіцца ў скароце, як ЦСУ) дала другую публікацыю, таксама тымчасовых вынікаў усесаюзнага перапісу 1959 году: «Аб роўні эдукацыі, нацыянальным складзе й структуры веку жыхарства СССР».[7] Нацыянальны склад жыхарства пададзены тут у ліках для кажнай нацыянальнасьці на прасторы СССР, і ў ліках нацыянальных групаў па паасобных рэспубліках. У канцы далучаныя лічбы сужэнстваў на 1000 жыхароў для тэрыторыі ўсяго СССР, і па полу, але без паданьня такіх-жа лічбаў для паасобных рэспублікаў. Тое самае й зь лічбамі аб структуры жыхарства паводля групаў веку.

У 1960-м ужо годзе, паказаўся статыстычны гадавік тае-ж ЦСУ, у якім перадрукаваныя нанава тыя-ж агульныя вынікі перапісу 1959 году, што публікаваліся раней, але зь некаторымі зьменамі ў вялічыні некаторых лікаў, асабліва ў галіне нацыянальнага складу жыхарства рэспублікаў. Гэтыя

---

[5] Вынікі перапісу 9 сьнежня 1931 году, як і папярэдняга перапісу Польскае рэспублікі з 30 верасьня 1921 году, можна знайсьці ў кніжыцах польскага ўрадавага статыстычнага штогодніка: Mały rocznik statystyczny, Warszawa. Выдаваўся ён і ў францускай мове пад назовам: Petit annuaire statistique de la Pologne, Warszawa.

[6] «Правда» і «Известия», 10. 5. 1959.

[7] «Правда» і «Известия», 4. 2. 1960.

зьмены трэба ўважаць за ўдакладненьні ранейшых «тымчасовых» лічбаў перапісу.[8]

Пры разглядзе дадзеных савецкае статыстыкі трэба мець заўсёды на ўвеце ведамы факт, што ў камуністычнай сыстэме ўсякія публікацыі абумоўленыя прапагандных мі мяркаваньнямі рэжыму. Дзеля гэтага й у галіне дэмаграфічнае статыстыкі СССР звычайна публікуецца толькі тое, што, паводля ацэны савецкіх кіруючых партыйных дзейнікаў, паказвае савецкі лад у выгадным сьвятле. Усё іншае да публічнага ведама звычайна не падаецца. Гэтак ёсьць і з вынікамі апошняга перапісу. На трэйцім годзе ад яго правядзеньня апублікаваныя толькі некаторыя агульныя лічбы, пры тым, некаторыя зь іх даюцца толькі ў сярэднім разрэзе для ўсяго СССР, без адпаведных лічбаў для паасобных рэспублікаў. Ужо колькі дзесяткоў год не публікуюцца, таксама, ніякія лічбы натуральнага руху жыхарства Беларускае ССР, — гадавыя лічбы нараджэньняў, сьмерцяў, натуральнага прыросту. Падаюцца яны ў савецкіх публікацыях толькі як сярэднія для ўсяго СССР, дый толькі для апошняе дэкады, ад 1950 году.

Усе перапісныя лікі публікацыяў ЦСУ, якія тычацца сучаснага дэмаграфічнага стану Беларускае ССР, а якія наагул былі публікаваныя, у далейшым будуць тут і пададзеныя дый разгледжаныя ў супастаўленьні зь ведамымі гістарычнымі фактамі й падзеямі, дый ранейшымі статыстычнымі дадзенымі беларускае нацыянальнае тэрыторыі. Адначасна будзе намаганьне ўстанавіць на іх аснове сучасны дэмаграфічны стан Беларускае ССР, адзначыць важнейшыя, паўсталыя ў ім, перамены, выявіць памеры гэтых пераменаў і іх прычыны. У канцы знойдзецца абагульненьне высноваў дый спроба азначыць тэндэнцыі й пэрспэктывы далейшага дэмаграфічнага разьвіцьця Беларускае ССР у складзе Савецкае імпэрыі, а пад нясупынным узьдзеяньнем масавых міграцыйных мерапрыемстваў, што праводзяцца на тэрыторыі рэспублікі паводля плянаў і загадаў з расейскага цэнтру імпэрыі, Масквы.

ТЭРЫТОРЫЯ РЭСПУБЛІКІ

Перад разглядам вынікаў савецкага перапісу 1959 году ў галіне жыхарства Беларускае ССР неабходна даць кароткую гістарычную інфармацыю аб паўстаньні тэрыторыі рэспублікі ў сучасных яе межах. Гэта важна дзеля таго, што сучасная дзяржаўная тэрыторыя Беларускае ССР не аднаго паходжаньня. Заходняя й ўсходняя часткі гэтае тэрыторыі міжваеннаю парою мелі розную долю, дзесяцьгодзьдзямі належылі да розных — Польшчы й СССР — дзяржаўных арганізмаў, з кардынальна адменнымі палітычна-сацыяльнымі сыстэмамі, што, бязумоўна розна адбівалася й на характары іх дэмаграфічнага разьвіцьця.

Перад Першаю Сусьветнаю Вайною блізу ўсе землі сучаснае Беларускае ССР былі ў складзе пяці губэрняў Расейскае імпэрыі: Менскае, Віленскае, Горадзенскае, Магілеўскае, Віцебскае. Хоць усе гэтых пяць губэрняў, як выказаў і першы агульны перапіс жыхарства Расейскае імпэрыі

[8] Народное хозяйство СССР в 1959 году. Статистический ежегодник. Центральное Статистическое Управление при Совете Министров СССР. Москва, 1960.

1897 году, мелі абсалютную бальшыню жыхарства з роднаю беларускаю моваю, называць іх беларускімі, ці, старым гістарычным назовам, літоўскімі губэрнямі, у афіцыйных урадавых дакумэнтах і распараджэньнях было забаронена асабістым царскім загадам ад 1840 году.[9] Назоў «Беларусь» да тэрыторыі тарнаваўся й далей толькі ў неафіцыйнай расейскай навуковай літаратуры. Царскія ўлады завялі для гэтых губэрняў, і наагул для беларускае тэрыторыі, сваё адмысловае азначэньне: «Северо-Западный Край», назоў, які меў скрываць нацыянальную існасьць тэрыторыі, і гэтак аблягчаць, а, часткова, і апраўдваць права Расеі на яго дэнацыяналізацыю й русыфікацыю.

Ужо ў канцы 1917 году, скліканьнем Усебеларускага Кангрэсу ў Менску, пачалася спроба арганізаваньня самастойнае Беларускае Народнае Рэспублікі, акт незалежнасьці якое й быў абвешчаны 25 сакавіка 1918 году ў Менску. Дый новая дзяржава ня здолела даўжэй утрымацца, а нават не пасьпела й належна ўсталявацца. За яе тэрыторыю пачалося змаганьне між дужэйшымі суседзямі — новапаўсталаю Польшчаю і, бальшавіцкаю ўжо, Расеяй. Вайна гэтая была закончаная фармальна Рыскаю ўгодаю 18 сакавіка 1921 году, паводля якое, тэрыторыя Беларусі дзялілася між Польшчаю й СССР.

Заходняя частка беларускае этнаграфічнае прасторы, што ў выніку Рыскае ўгоды адыйшла да Польскае рэспублікі, у міжваенныя гады складала ў Польшчы тэрыторыю чатырох ваяводстваў: Віленскага, Навагрудзкага, Палескага й бальшыню Беластоцкага. За ранейшым прыкладам царскае Расеі, і новая польская ўлада да беларускіх земляў знамерана тарнавала назоў, які нічым не паказваў на нацыянальную яе адрознасьць ад этнічнае польскае тэрыторыі: Kresy Północno-Wschodnie, або Ziemie Północno-Wschodnie. Як бачым, назоў быў дакладна пераняты ад расейскае царскае ўлады, з зразумелаю падменаю слова «Западный» на Wschodnie.

З часткі беларускае тэрыторыі на ўсход ад Рыскае мяжы камуністычная Масква сфармавала сваю Беларускую ССР, абвешчаную яшчэ 1. 1. 1919 ў Смаленску як супроцьвагу для Беларускай Народнай Рэспублікі. Насуперак дэкларацыі ў часе абвешчаньня гэтае рэспублікі аб тым, што яна мае абымаць у с е беларускія этнаграфічныя землі, Масква ў запраўднасьці прыдзяліла гэтай, цалком ад сябе залежнай, рэспубліцы, вельмі малую тэрыторыю: усяго 6 паветаў былое Менскае губэрні, агульнае паверхні 52 316 кв. км., з жыхарствам усяго паўтара міліёна чалавек.

На дамаганьні, аднак-жа, жыхарства, а таксама захадамі ўладаў БССР, 3 сакавіка 1924 году Масква згадзілася перадаць у межы Беларускае ССР часткі тэрыторыі Віцебскае, Магілеўскае, Гомельскае й Смаленскае губэрняў, — беларускія землі, што былі перад тым у складзе РСФСР. У выніку гэтага, тэрыторыя рэспублікі ўзрастае да 109 764 кв. км. паверхні, з жыхарствам 4.2 міліёнаў чалавек.

У выніку далейшых дамаганьняў жыхарства беларускіх этнічна земляў, пакінутых за межамі Беларускае ССР, 6 сьнежня 1926 году адбываецца другое «ўзбуйненьне» республікі праз далучэньне Гомельскага й Рэчыцкага паветаў, у выніку чаго паверхня рэспублікі ўзрастае да 125 700 кв. км.,

---

[9] С. Б., Цар і назовы Літва, Беларусь. Запісы Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва, № 2. Ню Ёрк, 1952, б. 108.

а жыхарства да 5 міліёнаў чалавек. У гэтай тэрытар'яльнай вялічыні Беларуская ССР заставалася аж да пачатку Другое Сусьветнае Вайны ў восені 1939 году.

Табл. I: Тэрыторыя рэспублікаў СССР паводля стану на 15. 1. 1959 году.

	Тэрыторыя у тысячах кв. км.
СССР	22 272.2
Расейская СФСР	17 075.4
Казахская	2 756.0
Украінская	601.0
Туркмэнская	488.0
Узбэкская	408.9
Беларуская	**207.6**
Кіргіская	198.5
Таджыкская	143.0
Азэрбайджанская	86.6
Грузінская	69.7
Лятувіская	65.2
Латвійская	63.7
Эстонская	45.1
Малдаўская	33.7
Армянская	29 8

Пасьля разгрому Польшчы нямецкімі арміямі і па папярэдняй дамоўленасьці зь Гітлерам, 17 верасьня 1939 году савецкая армія акупавала ўсходнія прасторы Польшчы, а між імі й землі Заходняе Беларусі. На аснове савецка-нямецкае ўгоды Рыбэнтропа-Молатава з 28 верасьня 1939 году, тэрыторыю Заходняе Беларусі паверхні 108 000 кв. км. Масква далучае да Беларускае ССР, павялічаючы гэтак рэспубліку да 233 700 кв. км. Дый ужо 10 кастрычніка таго-ж 1939 году Масква ізноў адразае ад Беларускае ССР места Вільню з часткаю Віленшчыны, тэрыторыю паверхні 6 911 кв. км., з жыхарствам 503 701 чалавек дый перадае яе незалежнай тады яшчэ Летуве. 3 жнівеня наступнага 1940 году Масква перадае для тае-ж Летувы, ужо ССР, акупаванай савецкаю арміяй, далейшыя часткі тэрыторыі Заходняе Беларусі паверхні 2 647 кв. км., з жыхарствам 105 000, памяншаючы гэтак тэрыторыю рэспублікі разам на кругла 9 560 кв. км. паверхні.[10] Пры канцы Другое Сусьветнае Вайны, у 1945 годзе, Масква аддзяляе ад Беларускае ССР яшчэ й частку Беласточчыны зь Беластокам дый беларускае Падляшша, тэрыторыю агульнае паверхні каля 16 540 кв. км., дый перадае паваеннай адноўленай, але ўжо сатэлітнай, Польшчы. У выніку гэтых усіх перадзелаў, далучэньняў дый адлучэньняў, тэрыторыя Беларускае ССР у паваенную пару, ад 1945 году, абыймала паверхню 207 600 кв. км. У гэткіх межах яна была й у часе савецкага перапісу 1959 году, такою застаецца й па сяньня.

[10] Anicetas Simutis. Lithuanian world directory — Pasaulio lietuviu žinynas. New York, 1958, b. 13.

У гэтым кароткім аглядзе прапушчаюцца адміністрацыйныя перадзелы й «межы» фармаванага ў часе апошняе сусьветнае вайны немцамі, у гадох 1941—1944, г. зв. Генэральнага Камісарыяту Беларусі, паколькі гэтыя падзелы былі часовыя, кароткатрывалыя дый ня мелі нейкага паважнейшага значаньня для дэмаграфічнага стану тэрыторыі.У гэтым часе, пад нямецкаю акупацыяй, дэмаграфічныя перамены й зьнішчэньні жыхарства былі менш-больш адзінакавыя на усей беларускай нацынальнай тэрыторыі, незалежна ад знаходжаньня паасобных яе частак у межах Генэральнага Камісарыяту Беларусі, ці вонках яго.

Па вялічыні свае тэрыторыі сучасная Беларуская ССР знайходзіцца на шостым месцы сярод іншых рэспублікаў СССР, пасьля Расейскае СФСР, Казахскае, Украінскае, Туркменскае дый Узбэкскае ССР.

Адміністрацыйна тэрыторыя Беларускае ССР у паваенныя ўжо гады колькі разоў была перадзеліваная й лік яе акругаў з 12 быў зьведзены да 7 у часе перапісу 15 студзеня 1959 году. Былі гэта акругі («вобласьці»): Берасьцейская, Віцебская, Гомельская, Горадзенская, Менская, Магілеўская й Маладэчанская. На прасторы гэтых сямі акругаў на 1 студзеня 1958 году існавала 161 сельскіх дый 11 мескіх раёнаў. Местаў было 69. Усіх сельсаветаў 1904.[11]

Пры гэткім падзеле на 7 акругаў тэрыторыя акругаў Берасьцейскай, Горадзенскай дый Маладэчанскай складаліся цалком з былых земляў Заходняе Беларусі, што ў міжваенную пару ўвайходзілі ў склад тагачаснае Польскае рэспублікі. Апрача гэтага, тры раёны Менскае акругі — Клецкі, Нясьвіскі дый Стаўпецкі, — паходзілі таксама з былых земляў Заходняе Беларусі. Тэрыторыя рэшты Менскае акругі, дый акругі Віцебская, Гомельская й Магілеўская, абыймалі сабою тэрыторыю Беларускае ССР ў яе даваенных межах.

Ужо пасьля перапісу 15 студзеня 1959 году, а магчыма й у выніку гэтага перапісу, які выказаў высокую ступень вылюдненьня Беларускае ССР за 20 мінулых міжперапісных гадоў, загадам прэзыдыюму Вярхоўнага Савету Беларускае ССР з 20 студзеня 1960 году, Маладэчанская акруга была скасаваная, а яе раёны падзеленыя між трымя суседнімі акругамі — Менскай, Горадзенскай і Віцебскай. Гэтага-ж дня другім загадам таго-ж Вярхоўнага Савету было скасавана й 15 раёнаў па паасобных акругах рэспублікі.[12] Адначасна быў значна паменшаны лік сельсаветаў. У выніку гэтага на пачатку 1960 году Беларуская ССР мела ўжо толькі 6 акругаў, 147 раёнаў сельскіх і 11 мескіх, 1758 сельсаветаў, 69 местаў і 124 пасёлкі меставога тыпу.[13]

Паколькі савецкі перапіс 1959 году праводзіўся пры адміністрацыйным падзеле на 7 акругаў, дый спачатна публікаваныя вынікі перапісу падаваліся паводля гэтага падзелу, у дадзеным разглядзе вынікаў перапісу й бу-

---

[11] Атлас Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Акадэмія Навук БСРР. Мінск—Масква, 1958, б. 131. Атляс выдадзены адначасна й паралельным выданьнем парасейску. Таксама: СССР. Административно-территориальное деление союзных республик на 1 января 1958 года. Изд. 9-ое. Москва, 1958, б. 5. Таксама: Белорусская ССР. Административно-территориальное деление. Минск, 1955, б. 5.

[12] «Звязда», № 17, 21. 1. 1960.

[13] Народное хозяйство СССР в 1959 году. Москва, 1960, б. 48—49.

дзем у некаторых выпадках трымацца гэтага адміністрацыйнага падзелу з часу перапісу. Адначасна пададзеныя аднак-жа й лічбы раскладу жыхарства рэспублікі паводля новага падзелу на акругі. Пададзены ён на аснове лічбаў апублікаваных у статыстычным гадавіку ЦСУ «Народное хозяйство СССР в 1959 году», Масква, 1960.

ЖЫХАРСТВА БЕЛАРУСІ Ў XX СТАГОДЗЬДЗІ

У гісторыі Беларусі дваццатае стагодзьдзе характэрнае перавагаю гадоў неспакойных эканамічна й палітычна, перарываных гадамі вялікіх ваенных зьнішчэньняў. У гэткіх гістарычных абставінах, зразумела, ня можна спадзявацца нейкага раўнамернага дэмаграфічнага разьвіцьця тэрыторыі.

У XX ст. тэрыторыя Беларусі зазнала зьнішчэньні аж двох сусьветных войнаў. Апрача гэтага, адбылося на ей і колькі меншых, абмежанага засягу, войнаў, дзьве рэвалюцыі, колькі гаспадарчых крызысаў, дый, у канцы, гвалтоўнае руйнаваньне й перамена сацыяльна-эканамічнага ладу з суправаджаючым яго палітычным тэрорам, масавымі дэпартацыямі, перасяленьнямі дый уцёкамі жыхарства.

Чарадаваньне гадоў ваенных і неваенных, дый гадоў спакайнейшых і неспакойных у разьвіцьці жыхарства беларускае нацыянальнае тэрыторыі, пазваляе 58-гадовы час ад пачатку стагодзьдзя да апошняга савецкага перапісу 1959 году, — гады 1901—1958, — пэрыядызаваць на гэткія важнейшыя адрэзкі часу:

1. 1901—1913 = 13 гадоў, — пара рэлятыўнага даваеннага супакою.
2. 1914—1920 = 7 гадоў, — час Першае Сусьветнае Вайны й наступіўшых посьле яе войнаў мясцовага засягу.
3. 1921—1929 = 9 гадоў, — пара паваеннага супакою.
4. 1930—1938 = 9 гадоў, — пара эканамічнага крызысу, што крануў заходнія землі тэрыторыі сучаснае рэспублікі, дый пачатак савецкіх масавых дэпартацыяў на тэрыторыі БССР.
5. 1939—1945 = 7 гадоў, — Другая Сусьветная Вайна.
6. 1946—1958 = 13 гадоў, — час паваенных савецкіх дэпартацыяў зь Беларускае ССР і прымусовых масавых перасяленьняў.

Ужо сама, выжэй пададзеная, пэрыядызацыя паказвае на факт, што на 58 пачатковых гадоў XX стагодзьдзя 14 прыпадае на пару войнаў, зьнішчальная дзейнасьць якіх, беспасярэдня ці пасярэдня, ахапляла ўсю баларускую нацыянальную тэрыторыю, прычыняючы нязвычайна вялікія страты жыхарству. З 44 неваенных гадоў, роўна палова, бо 22 гады, прыпадаюць на часы, калі хоць войнаў і ня было, адбываліся аднак-жа гэткія масавыя прымусовыя міграцыі жыхарства Беларусі, што ўважаць іх за нармальныя ў дэмаграфічным разьвіцьці тэрыторыі аніяк немагчыма.

Для лепшага зразуменьня сучаснага дэмаграфічнага стану Беларускае ССР, варта бліжэй прыгледзіцца да кажнага з гэтых шасьці пэрыядаў, дый адзначыць важнейшыя характэрныя рысы разьвіцьця жыхарства Беларусі ў іх.

1. Гады 1901—1913, гэта час умоўнага супакою на тэрыторыі Беларусі. Умоўнага, бо ў гадох 1904—1905 гэтага пэрыяду адбылася расейска-японская вайна, якая, хоць адбывалася й далёка ад беларускай нацыянальнай тэрыторыі, дый не закранала яе беспасярэдня, аднак-жа спрычыніла некаторыя страты жыхарства Беларусі зь ліку змабілізаваных у расейскую армію, дый, зразумела, адбілася й на лічбах натуральнага руху жыхарства. Кранула ў нейкай ступені дэмаграфічны стан тэрыторыі й рэвалюцыя 1905—1906 гадоў. Побач гэтых дзьвюх гістарычных падзеяў, разьвіцьцё жыхарства на тэрыторыі Беларусі ў гэтую пару характэрнае яшчэ масавым эміграцыйным рухам з прычынаў эканамічных. Адна хваля эміграцыі зь Беларусі ішла тады на ўсход — у Сібір дый іншыя азійскія краі Расейскае імпэрыі. Другая-ж адбывалася ў кірунку адваротным, на захад, за межы Расейскае імпэрыі, за акіян. Гэтыя эмігранты кіраваліся галоўна ў Задзіночаныя Стэйты Паўночнае Амэрыкі дый Канаду.

У Амэрыку масава эміґравала беларускае сялянства і, у ня меншым ліку, жыхары заняпалых пад расейскім панаваньнем местаў Беларусі, галоўна Жыды. На ўсход, у краі Сібіру, маглі ехаць толькі сяляне, паколькі Жыдом царскім урадам было забаронена пасяляцца паза межамі устаноўленае «черты оседлости», якая абымала тэрыторыю 15 заходніх губэрняў імпэрыі.

Прычынаю гэтых масавых міграцыйных рухаў зь Беларусі, якія пачаліся яшчэ ў канцы XIX ст., быў той эканамічны застой, да якога давяла дый які стала ўтрымлівала каляніяльная эканамічная палітыка царскага рэжыму ў Беларусі ў XIX ст. Эміграцыя гэтая ў абодвух кірунках — і заходнім, за акіян, і ўсходнім, на Сібір, — адбывалася ў масавых памерах. Аб вялічыні заходняе эміграцыі можа сьветчыць той вялікі лік эмігрантаў зь Беларусі тае пары, дый іх нашчадкаў, які яшчэ й сяньня знайходзіцца ў Задзіночаных Стэйтах Паўночнае Амэрыкі дый Канадзе. Агульны лік гэтае эміграцыі за межы Расейскае імпэрыі, ад канца XIX ст. да пачатку Першае Сусьветнае Вайны, ацэньваецца на кругла мілён.

Немалы эміграцыйны рух быў і на ўсход, у Сібір. Ягоныя памеры часткова паказвае й савецкі перапіс 1926 году, калі сярод жыхарства некаторых акругаў Сібіры было ўстаноўлена 14 да 16 працэнтаў Беларусаў. Гэтак, для прыкладу, у Канскай акрузе паводля гэтага перапісу жыло 13.4%Беларусаў, у Тулунаўскай 14.0%, у Торскай 15.8%.[14] Перапіс гэты, аднак-жа, ня выявіў усей лічбовай вялічыні беларускае калянізацыі Сібіры. Даводзяць гэта факты, што, паводля сьветчаньня М. Кавалеўскага, ужо на пераломе XIX—XX стагодзьдзяў Беларусы станавілі 5/6 жыхарства Усурыйскага краю.[15] А ад 1896 да 1914 году, за 19 гадоў, агульны лік сялян-перасяленцаў толькі з Магілеўскай, Віцебскай дый Менскай губэрняў, і зарэгістраваных толькі ў Чэлябінску дый Сызрані, станавіў каля 500 000 чалавек. За 50 гадоў-жа, што папярэджалі Першую Сусьветную Вайну, паводля існуючых дадзеных, зь Беларусамі гэткім спосабам выбыла 1 387 000 чалавек.[16]

---

[14] Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 года. Краткие сводки, вып. IV. Народность и родной язык населения СССР. Издание ЦСУ. Москва, 1928.

[15] М. Ковалевский. Экономический строй России. С.-Петербург, 1900.

[16] Народное хозяйство Белорусской ССР за 40 лет. Под ред. С. Н. Малинина. Госплан БССР. Минск, 1957, б. 20.

2. Пэрыяд 1914—1920 гадоў, гэта час Другое Сусьветнае Вайны (1914—1918) дый, наступіўшых посьле яе, меншых войнаў мясцовага засягу (1919—1920). У гэтым часе, апрача сусьветнае вайны, на тэрыторыі трэба адзначыць: спробы ўстанаўленьня незалежнае Беларускае Народнае Рэспублікі, польска-савецкую вайну, Слуцкае дый іншыя народныя антысавецкія паўстаньні, дый у канцы — падзел тэрыторыі Беларусі між Польшчаю й бальшавіцкаю Расеяй, праведзены ўгодаю ў Рызе 18 сакавіка 1921 году, устанаўленьне Беларускае ССР, залежнае цалком ад Масквы дый пазьней у складзе СССР. Вялікія страты жыхарства тэрыторыі, зразумела, былі спрычыненыя ня толькі самымі ваеннымі падзеямі, але й спадам лічбаў нараджэньня дый лічбаў натуральнага гадавога прыросту. Мелі сваё значэньне для лічбовага стану жыхарства тэрыторыі й масавыя ўцёкі жыхарства ў глыбкі імпэрыі перад наступаючым фронтам вайны, г. зв. «бежанства». Вайна, затое, спыніла цалком усе даваенныя эміграцыйныя рухі эканамічнага характару.

3. Гады 1921—1929, гэта пара паваеннага супакою. Тэрыторыя Беларусі ў гэтую пару, у выніку Рыскае савецка-польскае ўгоды, падзеленая між Польшчаю і, савецкаю ўжо, Расейскаю імпэрыяй, СССР. У выніку й жыхарства гэтых дзьвюх частак — заходняе й усходняе — у міжваенную пару жыло ў вадменных палітычных і сацыяльна-эканамічных умовах. У Заходняй Беларусі, пад Польшчаю, гэтыя гады адзначаюцца нязвычайна высокімі лічбамі натуральнага гадавога прыросту. Сярэдняя для гадоў 1921—1931 была 29 на 1000.[17] Дзеля заведзеных тымчасам амэрыканскіх іміграцыйных абмежаньняў, эміграцыйны рух з Заходняе Беларусі ў Задзіночаная Стэйты Амэрыкі нязначны. Невялікі эміграцыйны рух зь земляў Заходняе Беларусі ў краі заходняе Эўропы — Францыю, Бэльгію, дый краі Паўдзённае Амэрыкі, галоўна Аргентыну. Затое адбываецца значны іміграцыйны рух — наезд на землі Заходняе Беларусі жыхарства з этнічна польскіх земляў, спрычынены намаганьнямі польскага ўраду правясьці калянізацыю гэтых земляў польскім нацыянальна элемэнтам шляхам масавага пасяленьня польскіх вайсковых і цывільных асаднікаў, дый ня менш масавае насыланьне польскіх урадоўцаў.

У гэтым-жа часе на тэй усходняй частцы Беларусі, што была ў межах тагачаснае Беларускае ССР, жыхарства перажывае таксама даволі спакойную палітычна пару г. зв. НЭП-у, пару рэлятыўнае эканамічнае свабоды, рэлятыўнага матар'яльнага дабрабыту дый некаторых магчымасьцяў нацыянальна-культурнага разьвіцьця. Гэтыя гады й для тэрыторыі тагачаснае БССР азначаюцца высокімі лічбамі натуральнага гадавога прыросту, сярэдня 24—25 на 1000. У выніку скасаваньня законаў царскага рэжыму пра «черту оседлости» для Жыдоў, зазначаецца ажыўленьне эміграцыйнага руху з тэрыторыі Беларускае ССР жыхарства жыдоўскае нацыянальнасьці, якое кіруецца ў іншыя абшары, галоўна цэнтры, савецкае ўжо Расейскае імпэрыі. Зь беларускае тэрыторыі ў складзе СССР спыняецца затое ўсякая эміграцыя ў Амэрыку, ці іншыя замежныя краі, дзеля забароны эміграцыі за межы СССР.

4. Гады 1930—1938 для тэрыторыі ў межах тагачаснае Беларускае ССР азначаюцца запачаткаваньнем Сталінскага тэрору з масавымі арыштамі,

[17] Petit annuaire statistique de la Pologne 1938. Warszawa, 1938, b. 19.

нішчэньнямі й дэпартацыямі жыхарства. Асабліва вялікія хвалі масавых арыштаў і дэпартацыяў у Беларускай ССР адбываюцца ў гадох 1930, 1933 і 1936/37. Арышты й дэпартацыі на тэрыторыі Беларускае ССР праводзяцца тады для ліквідацыі беларускага патрыятычнага актыву, г. зв. «беларускіх нацыянальных дэмакратаў», і яны ахапілі вялікі лік навукоўцаў, пісьменьнікаў, мастакоў, студэнцкую моладзь, дый наагул беларускую інтэлігенцыю — увесь навуковы, культурны й палітычны актыў. Адначасна ішла расправа зь беларускім сялянствам за ягоны апор савецкай прымусовай калектывізацыі. Калі-ж ня існавала канкрэтных прычынаў — дэпартацыі праводзіліся пад клічам ліквідацыі «ворагаў народу», дый за прыпісваныя бяз дай прычыны сувязі з «агентурамі капіталістычных краінаў».

У выніку тэрору й масавых дэпартацыяў, падае, зразумела, моцна й лічба натуральнага прыросту, Як паказваюць лічбы перапісу 1939 году, ад 17 сьнежня 1926 да 17 студзеня 1939 году, лік жыхарства рэспублікі ўзрос з 4 983 200 да 5 568 000, гэта значыць на 584 800 чалавек, што дае сярэднюю лічбу гадавога прыросту ўсяго 1%, ці ўсяго палову сярэдняе тыповае для беларускае тэрыторыі 2%. А першыя гады гэтага міжперапіснага пэрыяду, гады 1927—1929, мелі яшчэ напэўна вельмі высокі натуральны прырост, прыкладам 24.9 на 1000 у 1927 годзе. Дык спад прыросту дый страты жыхарства прыйшлі ў пазьнейшыя гады, гады масавага тэрору. Як паказваюць лічбы перапісу 1939 году, у гэтым пэрыядзе на тэрыторыі тагачаснае Беларускае ССР, рэспубліка мела недалік жыхарства 763 000 ад спадзяванага, калі за базу для абліку прыняць сярэднюю тэарытычную для Беларусі лічбу гадавога прыросту па 20 на 1000. Пры гэткім азначэньні спадзяванага ліку жыхарства ў БССР на пачатку 1939 году павінна было-б быць не 5 568 000, як выказаў перапіс, а 6 331 000. Паважныя перамены у гэтымжа часе адбываюцца й у дэмаграфічным разьвіцьці Заходняе Беларусі пад Польшчаю ў умовах наступіўшага вельмі цяжкога сусьветнага гаспадарчага крызысу. У выніку крызысу дый польскае каляніяльнае гаспадаркі на гэтых землях, вельмі высокая раней лічба натуральнага гадавога прыросту падае на больш як палову, з 29 да 14 на 1000. Адбываецца адначасна далейшы, крыху ўзьвялічаны, эміграцыйны рух у краі Заходняе Эўропы дый Паўдзённае Амэрыкі.

5. Гады 1939—1945, гады Другое Сусьветнае Вайны. Ужо з самога пачатку гэтае вайны, зь нямецка-польскае яе фазы, вайна гэтая беспасярэдня кранула беларускія землі, у дадзеным прыпадку землі Заходняе Беларусі. Асабліва вялікія страты жыхарства гэтых земляў спрычыніла пазьнейшая акупацыя гэтых земляў у верасьні 1939 году савецкаю арміяй, дый пасьлейшая іх саветызацыя, з масавымі арыштамі, дэпартацыямі дый масавымі ўцёкамі жыхарства на Захад. Яшчэ большыя страты жыхарства былі ў нямецка-расейскую фазу вайны, калі ваенныя падзеі ахаплялі ўжо ўсю беларускую нацыянальную тэрыторыю. Беспасярэднія ваенныя страты сярод цывільнага жыхарства на землях Беларусі ў часе Другое Сусьветнае Вайны былі беспараўнаньня вышэйшыя за страты ў Першую Сусьветную Вайну. Прычынаў на гэта было колькі: 1. шырокае тарнаваньне ў вапошняй вайне авіяцыі для нішчэньня далёкіх зафронтавых пунктаў, асабліва местаў; 2. рухомасьць ваеннага фронту, у вадваротнасьць ягонай стабілізацыі ў Першую Сусьветную Вайну; 3. шырокі, масавы партызанцкі антынямецкі й антысавецкі рух дый супрацьпарты-

занцкія мерапрыемствы акупацыйных арміяў; 4. гітлероўская акцыя экстэрмінацыі жыхарства жыдоўскае нацыянальнасьці; 5. масавыя вывазы жыхарства на прымусовыя працы ў Нямеччыну, і, 6. масавыя ўцёкі жыхарства перад наступаючымі арміямі, асабліва ўцёкі перад наступаючай савецкай арміяй. Агульны лік стратаў жыхарства цывільнага й вайсковага для тэрыторыі ў межах сучаснае Беларускае ССР, афіцыйнымі савецкімі камуністычнымі дзейнікамі рэспублікі была ацэненая на 1 500 000 чалавек.[18] Вялікія страты былі й дзеля спаду лічбаў нараджэньня дый натуральнага прыросту

6. У гадох 1946—1958 ужо ўся тэрыторыя сучаснае Беларускае ССР знайходзіцца пад беспасярэдняю ўладаю камуністычнае Масквы. На ей далей праводзяцца масавыя дэпартацыі жыхарства, або як рэпрэсіі за выказанае ў часе вайны варожае настаўленьне да Масквы й яе камуністычнага ладу, або ў парадку «нармальных» у Сталінскую пару масавых і індывідуальных дэпартацыяў з мэтаю палітычнага тэрору дый для здабыцьця камуністычнай дзяржаве таннае нявольніцкае работніцкае сілы. Масавыя вывазы жыхарства зь Беларускае ССР ня спыняюцца аднак-жа й зь сьмерцяю Сталіна ў 1953 годзе. Наадварот, ужо ад 1954 году іх пачынаюць праводзіць у яшчэ большых памерах, спачатку пад клічам рэалізацыі пляну Хрушчова «асваеньня цалінных земляў», а пасьля, ад 1956 году, для засяляньня й індустрыялізацыі мала разьвітых усходніх прастораў Савецкае імпэрыі. Вывазы цяпер праводзяцца з мэтаю прымусовага перасяленьня, а не ў канцэнтрацыйныя лягеры для катаржнае працы дый на фізычнае зьнішчэньне, як было за Сталіна. Сваімі лічбовымі памерамі, калі ходзіць аб тэрыторыю Беларускае ССР, яны яшчэ вышэйшыя за дэпартацыі Сталінскае пары. Дэпартацыі праводзяцца арганізавана й практычна забіраюць з рэспублікі ўвесь яе гадавы натуральны прырост, паралiжуючы гэтак далейшы рост ліку жыхарства рэспублікі. Адначасна з масавымі вывазамі жыхарства пераважна беларускае нацыянальнасьці, адбываецца й сталае адначаснае насыланьне ў межы рэспублікі дзесяткоў тысячаў савецкае чынавецкае адміністрацыі, пераважна расейскае нацыянальнасьці, Дзеля масавых памераў прымусовае міграцыі лічбы нараджэньняў дый натуральнага прыросту ніколі не дасягаюць вышыні зь першага дзесяцігодзьдзя міжваеннае пары.

Гэткія, у кароткім нарысе, галоўныя важнейшыя асаблівасьці разьвіцьця жыхарства Беларусі ў паасобных пэрыядах часу XX стагодзьдзя. На заканчэньне гэтага агляду застаецца разгледзіць дакладней яшчэ адно важнае пытаньне. Ходзе гэтта аб устанаўленьне тыповае для Беларусі XX ст. сярэдняе лічбы натуральнага гадавога прыросту жыхарства для спакойных, «нармальных» гадоў, гадоў бяз войнаў, палітычнага тэрору, масавых дэпартацыяў. Лічба гэтая важная й патрэбная, як база для аблічэньня спадзяванага ліку жыхарства тэрыторыі Беларускае ССР пры нармальных, спакойных умовах. Толькі гэткім шляхам можна ўстанавіць і лікі фактычных дэмаграфічных стратаў рэспублікі, спрычыненых Другою Сусьветнаю Вайною дый савецкім тэрорам і прымусовымі міграцыямі.

Як з папярэдняга разгляду шасьці паасобных пэрыядаў у дэмаграфічным разьвіцьці Беларусі XX ст. бачым, запраўды «спакойных» гадоў бе-

---

[18] «Правда» і «Известия», 10.2. 1955 г., Прамова першага сакратара ЦК КП БССР К. Мазурава на сэсіі вярхоўнага савету СССР.

ларускія землі за 58 год мелі ўсяго 22. Будуць гэта гады першага пэрыяду, папяраджаючага Першую Сусьветную Вайну, гады 1901—1913, дый пэрыяд 1921—1929.

Што да першага пэрыяду, дык лічбы натуральнага гадавога прыросту ў гэтыя гады хісталіся ад 18 да 20 на 1000, сярэдня былі ў вышыні 19, нягледзячы на японскую вайну, якая адбывалася ў гэтым часе, рэвалюцыю 1905 году дый масавую эканамічнаю эміграцыю. У другім з разгляданых тут «спакойных» пэрыядаў, у гадох 1921—1929, сярэднія лічбы натуральнага гадавога прыросту на беларускай тэрыторыі былі значна вышэйшыя. Для земляў у межах тагачаснае Беларускае ССР лічбы натуральнага руху жыхарства — нараджэньня, сьмерцяў дый натуральнага прыросту, — у гадох 1923—1927 падае табл. 2.[19]

Табл. 2: Лічбы натуральнага руху жыхарства Беларускае ССР у гадох 1923—1927.

	1923	1924	1925	1926	1927
Нараджэньні	37.4	39.8	42.3	41.3	39.1
Сьмерці	13.3	15.3	18.7	14.9	14.2
Прырост	24.1	24.5	23.6	26.4	24.9

З табл. 2 відаць, што сярэдняя лічба натуральнага гадавога прыросту ў тых гадох, дадзеныя зь якіх былі апублікаваныя, выносіла 24.7 на 1000. На землях Заходняе Беларусі, пад Польшчаю, у гэтым самым прыблізна часе, бо ў гадох 1921—1931, сярэдняя лічба гадавога прыросту трымалася на вышыні 29 на 1000.[20] У пазьнейшым часе, у гадох 1931—1938, дзеля цяжкога эканамічнага крызысу ў Польшчы, гэтая лічба для Заходняе Беларусі спала сярэдня да 14 на 1000.[21] Нягледзячы на гэта, за гады знайходжаньня Заходняе Беларусі ў межах Польшчы, ад 1921 да 1938 году, сярэдняя гадавая лічба натуральнага прыросту жыхарства для ўсяго гэтага часу становіць 22 на 1000, што значыць, што яна была істотна вышэйшая за 2%.

На аснове пададзеных вышэй статыстычных фактаў, узятых з 22-годняга «спакойнага» для тэрыторыі Беларусі часу, часу бяз войнаў, масавага палітычнага тэрору дый масавых дэпартацыяў, маем дастатковую падставу за тыповую сярэднюю гадавую лічбу натуральнага прыросту жыхарства Беларусі ў спакайнейшыя гады XX стагодзьдзя азначыць на ня менш 20 на 1000, ці 2%. Зь лічбы гэтай і будзем далей выходзіць пры азначэньні вышыні дэмаграфічных стратаў тэрыторыі Беларускае ССР у вапошнім міжперапісным дваццацігоднім пэрыядзе.

[19] Лічбы гадоў 1924—1927 паводля: Беларусская ССР в цифрах. Центральное Статистическое Управление БССР. Минск, 1929, б. 54—55. Лічбы 1923 году паводля: Большая Советская Энциклопедия, т. 5, Москва, 1927, б. 385.

[20] Petit annuaire statistique de la Pologne 1938. b. 19.

[21] Тамсама, б. 18.

ЛІК ЖЫХАРСТВА БЕЛАРУСКАЕ ССР

Паводля першае публікацыі ЦСУ тымчасовых вынікаў апошняга савецкага перапісу з 10 травеня 1959 году, лік жыхарства Беларускае ССР 15 студзеня 1959 году быў 8 060 000.[22] Тая-ж лічба ў другой публікацыі ЦСУ з 4 лютага 1960 году, без аніякіх тлумачэньняў, зьніжаная да 8 055 000.[23] Такая-ж зьніжаная лічба паўтараецца пазьней і ў гадавіку ЦСУ «Народное хозяйство СССР».[24] Трэба думаць, што гэтае зьніжэньне на 5 000, гэта ўдакладненьне ранейшых тымчасовых вынікаў перапісу й лічба **8 055 000**, гэта й ёсьць запраўдны лік жыхарства Беларускае ССР, устаноўлены перапісам на 15 студзеня 1959 году.

Лік жыхарства Беларускае ССР, выяўлены перапісам, у першай публікацыі, а таксама ў гадавіку на 1959 год, супастаўляецца ЦСУ зь лікам для тае-ж тэрыторыі паводля стану на 1939 год, якую ЦСУ падае як 8 910 000. Савецкі перапіс 17 студзеня 1939 году, як ведама, праводзіўся толькі на тэрыторыі Беларускае ССР у даваенных межах рэспублікі, дзе было тады ўстаноўлена 5 568 000 жыхароў. З гэтага вынікае, што лік жыхарства на тых землях былое Заходняе Беларусі, што ўвайшлі ў сучасныя межы Беларускае ССР, ЦСУ ацаніла на студзень 1939 году ў вышыні 3 342 000. Гэта, як праверка паказвае, ня згодна з праўдаю. Лік жыхарства Беларускае ССР, пасьля павялічэньня рэспублікі ў 1939 годзе землямі былое Заходняе Беларусі, савецкія публікацыі падаюць наагул вельмі розна. Гэтак, у другім выданьні савецкай вялікай энцыкляпэдыі з 1950 году, аб жыхарсьцьве Беларускае ССР гаворыцца: «па дадзеных 1939 жыхарства становіць 10 500 000 чалавек.[25] Гэткія, а часам навет і большыя лічбы, паўтараюцца і ў іншых савецкіх афіцыйных публікацыях.

Куды ніжэйшую лічбу жыхарства Беларускае ССР падае ЦСУ у сваім паваенным статыстычным зборніку, выдадзеным у 1956 годзе. Там лік жыхарства Беларускае ССР на 1940 (не на 1939!) год падаецца на 9 200 000.[26] Тое-ж самае ЦСУ, як бачым, усяго тры гады пазьней, пры публікацыі вынікаў перапісу 1959 году, лічбу гэтую зьнізіла да 8 910 000, не даючы аніякога паясьненьня, на якой гэта аснове ў 1939 годзе на той-жа тэрыторыі павінна быць на 290 000 жыхароў менш, як у 1940 годзе. Бяручы на ўвагу пачатак вайны ў восені 1939 году, страты дзеля яе і забітымі, і палоннымі ў Нямеччыне, страты ўцекачамі на Захад перад савецкай акупацыяй тэрыторыі, і страты савецкімі дэпартацыямі зь земляў Заходняе Беларусі, у 1940 годзе можна было-б спадзявацца скарэй ніжэйшае лічбы жыхарства на дадзенай тэрыторыі, як яна была на пачатку 1939 году. У кажным выпадку ніколі ня вышэйшае аж на 290 000.

Калі ўжо самыя аўтарытэтныя афіцыйныя савецкія статыстычныя ўстановы й выданьні для тае самае тэрыторыі і ў тым-жа часе падаюць не адну, а колькі рознае вялічыні лічбаў жыхарства, дык гэта ставіць перад неабходнасьцяй беспасярэдняе праверкі справы з мэтаю ўстанаўленьня, якая

---

[22] «Правда» і «Известия», 10. 5. 1959.

[23] «Правда» і «Известия», 4. 2. 1960.

[24] Народное хозяйство СССР в 1959 году.

[25] БСЭ, т. 4. 1950, б. 476. 10 400 000 пададзена ў афіцыйнай партыйнай публікацыі: С. Сулькевич — Территория и население СССР. Политиздат при ЦК ВКП(б). Москва, 1940, б. 46.

[26] Народное хозяйство СССР. 1956, б. 18.

гэта лічба адказвае запраўднаму ліку жыхарства Беларускае ССР на яе тэрыторыі ў межах сучасных, а паводля стану на пачатку 1939 году. Паколькі лік жыхарства для тэрыторыі даваеннае Беларускае ССР быў дакладна ўстаноўлены перапісам 17 студзеня 1939 году ў вышыні 5 568 000, дык для ўстанаўленьня ліку жыхарства на ўсей сучаснай тэрыторыі ў тым часе трэба азначыць толькі лік жыхарства на тых землях былое Заходняе Беларусі, каторыя ўвайшлі ў склад цяперашняй тэрыторыі рэспублікі.

Бяручы за выходныя лічбы апошняга польскага перапісу на землях былое Заходняе Беларусі 1931 году, дый прыймаючы на ўвагу факт, што ў гадох 1931—1938 на гэтых землях лічба сярэдняга гадавога прыросту была 1.4%,[27] дакладным аблічаньнем даводзіцца сьцьвердзіць, што на пачатку 1939 году на тэрыторыі земляў Заходняе Беларусі, што сяньня ўходзяць у склад БССР, павінна было быць **3 776 000,** а не 3 342 000 чалавек, як ацаніла ЦСУ. Гэтая лічба, разам з 5 568 000 жыхарства ўстаноўленага перапісам у даваеннай БССР, дае разам **9 344 000** чалавек для ўсяе тэрыторыі Беларускае ССР у сучаснай яе вялічыні, а ў пачатку 1939 году,* — ці, на 434 000 больш, як падае ў сваей апошняй публікацыі ЦСУ. Вось гэтае лічбы, якую дае нам дакладнае аблічэньне, і будзем трымацца ў далейшым, як лічбы, што павінна адказваць запраўднаму ліку жыхарства ў студзені 1939 году для тэрыторыі Беларускае ССР у сучасных яе межах, заміж не адказваючай запраўднаму стану лічбе ЦСУ на той-жа час у вышыні 8 910 000. Трэба пры тым адцеміць, што лічбы 10 500 000 і блізкія ей, што сустракаюцца ў некаторых ранейшых савецкіх афіцыйных публікацыях для таго самага часу, таксама ня фікцыйныя лічбы. Дый лічбы гэтыя належаць да тэрыторыі Беларускае ССР не ў сучасных яе межах, а ў межах пачатку кастрычніка 1939 году, перад адлучэньнем ад яе Масквою Вільні дый часьці Віленшчыны, дый, ужо пры канцы апошняе вайны, Беластоку, Беласточчыны дый беларускага Падляшша. Дык лічба 10 500 000 адказвае прыблізнаму ліку жыхарства тэрыторыі рэспублікі ў кароткатрывалую пару яе найабшырнейшых дзяржаўных межаў пачатку кастрычніка 1939 году, а не тэрыторыі Беларускае ССР у межах сучасных, значна паменшаных.

ВЫШЫНЯ ДВАЦЦАЦІГОДНЯГА ДЭМАГРАФІЧНАГА ДЭФІЦЫТУ РЭСПУБЛІКІ

Калі трымацца афіцыйных лікаў ЦСУ, паводля якіх у студзені 1939 году на прасторы Беларускае ССР у сучасных яе межах мела быць 8 910 000 жыхароў, а 15 студзеня 1959 году там-жа аказалася ўжо ўсяго 8 055 000, дык вышыня недаліку жыхарства Беларускае рэспублікі за 20 міжперапісных гадоў будзе 855 000, ці 9.6%. Паколькі, аднак-жа, як відаць з ранейшага абліку, запраўдны лік жыхарства ў студзені 1939 году на тэрыторыі сучаснае Беларускае ССР быў істотна вышэйшы, бо станавіў 9 344 000, дык і лічба двaццацігодняга недаліку жыхарства рэспублікі ў запраўднасьці значна вышэйшая, бо становіць **1 289 000,** ці **13.4%.** Толькі яшчэ адна

[27] Petit annuaire statistique do la Pologne 1938. b. 19.

* Такі-ж лік — 9.3 мільёнаў — для тэй самай тэрыторыі й 1939 г. падае й Е. И. Бугаев — Советская Белоруссия к тридцатилетию Великой октябрьской социалистической революции. Минск, 1947, б. 3.

рэспубліка СССР у тым-жа часе выказвае недалік жыхарства, але значна меншы за Беларускую ССР, гэта суседняя ей Лятувіская ССР, з працэнтам дэфіцыту 5.9. Усе іншыя маюць павялічэньне жыхарства, а некаторыя й вельмі значнае, як відаць з Табл. 3.

Табл. 3: Прыраўнаньне лікаў жыхарства рэспублікаў СССР (у тысячах) у гадох 1939 і 1959

Рэспублікі	1939	1959	Зьмена ў %
Расейская СФСР	108 379	117 534	+ 8.4
Украінская	40 469	41 869	+ 3.5
Беларуская	**9 344** *	**8 055**	**— 13.4** *
Узбэкская	6 336	8 106	+ 27.9
Казахская	6 094	9 310	+ 52.8
Грузінская	3 540	4 044	+ 14.2
Азэрбайджанская	3 205	3 698	+ 15.4
Лятувіская	2 880	2 711	— 5.9
Малдаўская	2 452	2 885	+ 17.7
Латвійская	1 885	2 093	+ 11.0
Кіргіская	1 458	2 066	+ 41.7
Таджыская	1 484	1 980	+ 33.4
Армянская	1 282	1 763	+ 37.5
Туркмэнская	1 252	1 516	+ 21.1
Эстонская	1 052	1 197	+ 13.8
СССР	191 112	208 827	+ 9.3

Лёгка заўважыць на табліцы, што найбольшы рост выказваюць тыя рэспублікі, куды кіраваліся масы жыхарства ў часе савецкіх перасяленьняў, а таксама тыя, якіх тэрыторыі не кранулі падзеі апошняе сусьветнае вайны безпасярэдня. Гэтак, жыхарства Казахскай ССР за 20 гадоў узрасло на 52.8%, Кіргіскай на 41.7%, Армянскай на 37.5%, Таджыкскай на 33.4%, Узбэкскай на 27.9%. Паводля публікацыі тае-ж ЦСУ з 10 травеня 1959 году, у некаторых акругах савецкага Далёкага Ўсходу ў гэтым самым часе жыхарства павялічылася навет на цэлых 70%.[28] Трэба адцеміць, што гэты «Далёкі Ўсход» быў адначасна й месцам шматлікіх канцэнтрацыйных лягераў, каля якіх ня раз вырасьлі няіснаваўшыя раней там месты, як прыкладам Варкута з 56 000 жыхароў у 1959 годзе, якая ў савецкай статыстыцы 1939 году наагул ня існавала.[29] Даволі высокая працэнтная лічба павялічэньня жыхарства ў рэспубліках Латвійскай дый Эстонскай, вышэйшая за сярэднюю + 9. 3 для ўсяго СССР, нягледзячы на ваенныя страты дый масавыя дэпартацыі, тлумачыцца насыланьнем туды расейскага жыхарства, што відаць з таго, што ў 1959 годзе лік Расейцаў

---

* Лічба жыхарства даецца згодна з праведзеным дакладным аблічэньнем, заміж меншай лічбы 8 910 000, пададзенай ЦСУ, якая не адказвае праўдзе. Дзеля гэтага й лічба працэнтнае зьмены жыхарства іншая за — 9,6%, якая выпадала-б зь лічбаў ЦСУ.

[28] «Правда» і «Известия», 10. 5. 1959.

[29] Тамсама.

у гэтых рэспубліках павялічыўся ў два з паловаю разы ў прыраўнаньні да стану даваеннага. Жыхарства ўсяго СССР, улучна з дэфіцытнаю Беларускаю ССР, як відаць з табліцы, узрасло ў сярэднім на 9.3%. Сярэдні-ж рост жыхарства на тэрыторыі СССР безь **Беларускае ССР** выражаецца вышэйшаю лічбаю 10.5%. Вось на гэтулькі ў запраўднасьці ўзрасло жыхарства рэшты СССР у часе, калі жыхарства Беларускае рэспублікі спала на 13.4%. Гэта значыць, што калі супроцьставіць тэрыторыю Беларускае ССР тэрыторыі ўсяе рэшты СССР, дык дыяпазон працэнтнае розьніцы ў зьмене адпаведных лічбаў жыхарства ў 20-годнім міжперапісным пэрыядзе вынясе 10.5 + 13.4 = 23.9% на некарысьць Беларускае ССР

Дый трэба мець наўвеце, што недалік жыхарства Беларускае ССР у вышыні 1 289 000 на 15 студзеня 1959 году, у прыраўнаньні да стану на тэй-жа тэрыторыі ў студзені 1939 году, дае нам толькі лічбу арытмэтычнае розьніцы, а зусім не выяўляе запраўднага дэмаграфічнага ўбытку, бо-ж апрача нястачы 1 289 000 зь лічбы існаваўшага ўжо ў 1939 годзе жыхарства, нестае яшчэ й усяго нармальна спадзяванага дваццацігодняга натуральнага прыросту жыхарства тэрыторыі. Да ўстанаўленьня лічбы запраўднага дэмаграфічнага дэфіцыту ў дадзеным адрэзку гадоў гэтта й пярэйдзем.

Для аблічэньня стратаў жыхарства нейкае тэрыторыі, спрычыненых вайною, эпідэміямі, ці іншымі нязвычайнымі дзейнікамі, тарнуецца звычайна такі спосаб, што спачатку аблічаецца лік жыхарства, які павінен быў-бы быць на дадзенай тэрыторрыі й на дадзены час пры нармальным яго росьце. Ад атрыманае гэтак лічбы адыймаецца лік жыхарства сьцьверджаны ў дадзеным часе перапісам. Розьніца між гэтымі дзьвюма вялічынямі й дае вышыню запраўднае страты жыхарства. Для аблічэньня лічбы нармальна спадзяванага ліку жыхарства нейкае тэрыторыі на азначаны час выходзіцца зь ведамай раты гадавога натуральнага прыросту дадзенай тэрыторыі ў нармальныя, папярэджаючыя катастрафічныя падзеі, гады. Гэтую лічбу звычайна выводзіцца як сярэднюю гадавога натуральнага прыросту тэрыторыі за колькі, прыкладам 5, гадоў найбліжэйшых нармальнага дэмаграфічнага разьвіцьця. На гэткі спосаб аблічэньня стратаў жыхарства спрычыненых вайною згаджаюцца й сучасныя савецкія дэмаграфы.[30] Калі ходзіць пра тэрыторыю сучаснае Беларускае ССР, нажаль немагчыма апірацца на сярэднюю натуральнага гадавога прыросту за 5 гадоў папяраджаючых міжперапісны пэрыяд 1939—1959, паколькі й у гады перад студзенем 1939 разьвіцьцё жыхарства рэспублікі не адбывалася ў нармальных умовах. Былі гэта гады самага жорсткага Сталінскага тэрору гады г. зв. яжоўшчыны, калі на тэрыторыі даваеннае Беларускае ССР адбываліся масавыя арышты, ліквідацыі й масавыя дэпартацыі. Пры тым лічбаў натуральнага руху жыхарства Беларускае ССР гэтых гадоў савецкая ўлада наагул ніколі не публікавала, і яны ня ведамыя. Вось дзеля гэтага для аблічэньня нармальна спадзяванага ліку жыхарства Беларускае ССР на час перапісу 1959 году даводзіцца апірацца на сярэднія лічбы натуральнага прыросту жыхарства тэрыторыі ў іншыя, спакайнейшыя гады. Як у вадным з папярэдніх разьдзелаў гэтае працы было ўжо выяўлена, тыповая сярэдняя рата гадавога натуральнага пры-

[30] Б. Ц. Урланис: Методы исчисления людских потерь от войн. У зборніку: «Проблемы демографической статистики». Академия Наук СССР, Москва, 1959, б. 298.

росту на тэрыторыі Беларусі ў рэлятыўна спакойныя гады XX стагодзьдзя была 20 на 1000, ці 2%. Вось на гэтай лічбе можна й аперціся пры аблічаньні жыхарства тэарытычна спадзяванага на тэрыторыі Беларускае ССР на пачатку 1959 году пры ўмовах нармальнага яго разьвіцьця.

Аблік такі паказвае, што пры 2% гадавога прыросту, за 20 гадоў зь лічбы жыхарства 9 344 000 у студзені 1939 году да студзеня 1959 году павінна быць 13 878 000 чалавек. Калі-ж перапіс 1959 году, заміж гэтае спадзяванае тэарытычна лічбы, выказаў на той-жа тэрыторыі ўсяго 8 055 000, гэта, значыць, што ўбытак жыхарства тэрыторыі рэспублікі за 20 міжперапісных гадоў становіць лічбу 5 823 000, ці 41.6%. Дый і гэтая лічба не адбівае яшчэ ўсяе вышыні дэмаграфічнага дэфіцыту тэрыторыі ў міжперапісным адрэзку часу. Была-б яна правільнаю, калі-б у гэтым часе не адбывалася аніякое паважнейшае **іміграцыі** ў межы рэспублікі. Так аднак-жа ня было. Ведама, што праз усе паваенныя гады, побач з масавымі дэпартацыямі й перасяленьнямі беларускага, пераважаюча, жыхарства рэспублікі, адбывалася адначасна, хоць і ў значна меншых лічбовых памерах, але сталае насыланьне ў рэспубліку савецкіх чынавецкіх кадраў, блізу вылучна расейскае нацыянальнасьці. Насыланьне гэтае праводзілася для русыфікацыі каляніяльнае адміністрацыі рэспублікі з мэтаю татальнага яе падпарадкаваньня расейскаму імпэр'яльнаму цэнтру ў Маскве.

Спосаб аблічэньня лічбовае вышыні гэтага насланага расейскага элемэнту ў межы рэспублікі ў міжперапісныя гады пададзены ў вадным з далейшых разьдзелаў гэтае працы, там, дзе разглядаюцца перапісныя лікі расейскае нацыянальнае мяншыні на тэрыторыі Беларускае ССР. Тутка скажам толькі, што аблічэньні гэтыя паказваюць, што ад 1944 году, ад часу савецкае рэакупацыі ад Немцаў тэрыторыі Беларускае ССР, у межы рэспублікі было наслана, ці іміґравала, кругла 222 000 чалавек расейскае нацыянальнасьці. Вось бяз гэтае іміграцыі лік жыхароў рэспублікі на 15 студзеня 1959 году быў-бы меншы на тыя-ж 222 000, ці выносіў-бы ня 8 055 000, а **7 833 000**, а дзеля гэтага й дэмаграфічны дэфіцыт рэспублікі ў запраўднасьці на такую-ж лічбу вышэйшы й выносіць не 5 823 000, а **6 045 000**, або **43.4%** таго, што павінна было-б быць пры нармальным натуральным росьце жыхарства тэрыторыі.

Шэсьць мільёнаў дэмаграфічнага ўбытку на працягу ўсяго 20 гадоў і на рэспубліку вялічыні Беларускае ССР, лічба нязвычайна вялікая. Агляд гістарычных падзеяў, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў часе разгляданых міжперапісных гадоў, дае нам і адказ на пытаньне: якія былі галоўныя прычыны такога нязвычайна высокага дэмаграфічнага недаліку. Былі іх дзьве: страты жыхарства спрычыненыя Другою Сусьветнаю Вайною, і, страты ў выніку савецкага тэрору дый пэрманэнтных масавых дэпартацыяў.

ВАЕННЫЯ СТРАТЫ ЖЫХАРСТВА БЕЛАРУСКАЕ ССР

Паводля афіцыйнага аўтарытэтнага асьветчаньня першага сакратара Камуністычнае Партыі БССР К. Мазурава, у часе Другое Сусьветнае Вайны Беларуская ССР мела каля **1 500 000** стратаў людзьмі,[31] што становіць

[31] «Правда» і «Известия», 10. 2. 1955.

16% тагачаснага жыхарства рэспублікі (выходзячы з раней азначанага ліку ў вышыні 9 344 000 на пачатку 1939 году). Практычна гэта значыць, што на тэрыторыі Беларускае ССР вайна зьнішчыла кажнага 6-га жыхара. На аснове назіраньняў ваенных падзеяў на тэрыторыі Беларускае ССР і памераў спрычыненых імі зьнішчэньняў у часе апошняе сусьветнае вайны, трэба дапусьціць, што пададзеная Мазуравам лічба ваенных стратаў жыхарства адказвае праўдзе. Страчаных 1 500 000, зразумела, далі й адпаведны ўбытак у натуральным прыросьце, які, лічаны, па 2% у год, як тыповай сярэдняй для тэрыторыі лічбы, на пачатак 1959 году вырасьце ў лічбу каля поўмільёна, што разам дае кругла 2 000 000 стратаў жыхарства Беларускае ССР спрычыненых вайною ў праекцыі на час перапісу 1959 году.

Страты ваенныя складаюцца із стратаў жыхарства цывільнага й вайсковага (зь ліку змабілізаваных). Паводля свайго паходжаньня страты гэтыя можна аднесьці да гэткіх колькі важнейшых фактараў і фазаў Другое Сусьветнае Вайны на тэрыторыі Беларусі:

1. Страты жыхарства ў часе нямецка-польскае вайны ў верасьні 1939 году. Страты гэтыя былі спрычыненыя толькі жыхарству на тэрыторыі былое Заходняе Беларусі, і сваімі памерамі яны ня былі такімі вялікімі, паколькі ваенныя падзеі гэтае фазы вайны вельмі мала кранулі беспасярэднюю частку тэрыторыі Заходняе Беларусі, якая пазьней увайшла ў склад Беларускае ССР. Страты гэтыя складаюць галоўна жаўнеры польскае арміі, што паходзілі зь беларускіх земляў, дый што палі ў часе змаганьняў, або загінулі ў нямецкім палоне. Некаторыя страты былі й у выніку дзеяньняў нямецкае авіяцыі. Агульная лічба стратаў гэтае пачаткавае фазы вайны месьціцца хіба ў межах пару дзесяткоў тысячаў.

2. Страты жыхарства Беларусі ў выніку савецкага наступу на Польшчу, пачатага 17 верасьня 1939 году, у выніку якога былі занятыя савецкаю арміяй дый далучаныя да Беларускае ССР землі Заходняе Беларусі. Страты гэтыя складаюцца з загінуўшых сярод цывільнага жыхарства дый забітых у часе ваенных дзеяньняў жаўнераў як польскае, гэтак і савецкае арміяў, што паходзілі зь Беларусі, а найбольш — спасярод загінуўшых у савецкім палоне. Лічбы гэтых стратаў таксама рэлятыўна нізкія, паколькі апор аддзелаў з разьбітае раней Немцамі дый дэзарганізаванае ўжо польскае арміі быў невялікі. Найбольш стратаў вынікла пасярод трапіўшых у савецкі палон. Ведамая рэч, што, прыкладам, сярод зьнішчаных ворганамі НКВД у самым Катыні пад Смаленскам каля 10 000 палонных ахвіцэраў польскае арміі, значны лік паходзіў зь земляў Заходняе Беларусі.

3. Страты спасярод змабілізаваных у савецкую армію зь Беларусі ў часе савецка-фінскае вайны ад 30 лістапада 1939 году да 12 сакавіка 1940 году. Гэтыя страты былі ў межах колькі тысячаў чалавек. Страты маглі тычыцца толькі жыхарства даваеннае Беларускае ССР, паколькі з толькішто далучанае Заходняе Беларусі савецкі рэжым яшчэ не пасьпеў правесьці вайсковых набораў дый паслаць на фінскі фронт.

4. Страты жыхарства на тэрыторыі Беларускае ССР у часе нямецка-савецкае вайны ад 22 чэрвеня 1941 году. Страты ў гэтай фазе Другое Сусьветнае Вайны складаюць асноўны стрыжэнь ўсіх ваенных стратаў Беларусі. Сваею дзейнасьцяй гэтая фаза вайны ахапляла беспасярэдне тэрыторыю ўсяе Беларусі, усходняе й заходняе, і ў выніку галоўна яе, паводля пада-

дзеннае раней афіцыйнае савецкае ацэны, тэрыторыя Беларускае ССР згубіла каля 1 500 000 свайго жыхарства, калі тымчасам страты першых трох, раней пералічаных, фазаў, былі ў вышыні ўсяго колькі дзесяткоў тысячаў. Страты ў гэтым часе былі вельмі высокія й паўшымі ў баёх жаўнерамі чырвонае арміі, што паходзілі зь Беларускае ССР, і забітымі спасярод цывільнага жыхарства спрычыненыя беспасярэднімі ваеннымі падзеямі ў часе нямецкага наступу ў 1941 годзе, а таксама ў часе савецка контрнаступу ў 1944 годзе; дзейнасьцяй нямецкае й савецкае авіяцыі, дзейнасьцяй антынямецкае й антысавецкае партызанкі дый адпаведных супроцьпартызанскіх акцыяў. Да гэтага даходзіць некаторы лік загінуўшых спасярод вывезеных на прымусовыя працы ў Нямеччыну, дый асабліва спасярод жаўнераў у нямецкім палоне. І ў канцы, трэба дадаць каля поўмільёна ахвяраў гітлероўскага нішчэньня жыхарства жыдоўскае нацыянальнасьці.

СТРАТЫ ЖЫХАРСТВА НЕВАЕННЫЯ

Калі ад раней аблічанае лічбы агульнага дваццацігодняга дэмаграфічнага недаліку жыхарств на тэрыторыі Беларускае ССР у вышыні 6 045 000 адняць лічбу ваенных стратаў, дый страчанага дзеля гэтага натуральнага прыросту, лічбу, якая ў папярэднім разьдзеле была азначаная на кругла 2 000 000, дык атрымаем лічбу стратаў жыхарства ў тым-жа адрэзку часу паходжаньня неваеннага вышыні **4 045 000**, ці, у закругленьні, роўна 4 мільёны. Лічба гэтая паказвае, што неваенныя страты сваімі памерамі два разы большыя за ваенныя, і становяць 67%, ці роўна 2/3 усяго дэмаграфічнага дэфіцыту гэтае пары, калі тымчасам страты ваеннага паходжаньня твораць 33%, ці 1/3 усяго дэмаграфічнага дэфіцыту.

Высокая лічба стратаў жыхарства паходжаньня неваеннага паясьняецца ня толькі тым, што савецкія дэпартацыі дый прымусовыя міграцыі былі масавых памераў, але й тым, што яны трывалі на куды даўжэйшым адрэзку часу. Хоць гадавая рата ваенных стратаў жыхарства на тэрыторыі Беларусі ў часе Другое Сусьветнае Вайны ад пачатку нямецка-савецкае яе фазы й была нязвычайна высокая, але гэтыя зьнішчэньні былі абмежаныя ў часе да ўсяго 3-4 год. калі тымчасам савецкія прымусовыя міграцыі з тэрыторыі трывалі блізу праз увесь міжперапісны час з кароткім трыгоднім перапынкам у пару нямецкае акупацыі. Гэта вось абумовіла тое, што беспасярэднія й пасярэднія страты жыхарства Беларускае ССР, спрычыненыя палітычным тэрорам і масавымі прымусовымі міграцыйнымі мерапрыемствамі расейскага бальшавіцкага рэжыму, аказаліся на тэрыторыі Беларускае ССР два разы вышэйшымі за такія-ж страты ваенныя.

Страты жыхарства Беларускае ССР спрычыненыя савецкім рэжымам былі, зразумела, не адналітага, а разнаякага паходжаньня. Апрача сталых масавых дэпартацыяў і прымусовых перасяленьняў, што праводзіліся ўвесь час — і ў пару Сталіна, і ў пару Хрушчова, — на дэмаграфічнае разьвіцьцё рэспублікі свой вялікі ўплыў мелі й палітычны тэрор Сталінскае пары, і эканамічная анархія дый нястачы, а ў выніку ўсяго разам — сталыя нізкія лічбы нараджэньняў дый сталы спад натуральнага прыросту жыхарства. Апрача гэтага, дзеля трываючага палітычнага тэрору, часьць жыхарства

тэрыторыі намагалася пры кажнай гістарычнай нагодзе ўцякаць зь яе, эмігравацць, творачы гэтак паважную лікам эміграцыю зь Беларусі.

Паводля свайго паходжаньня дэмаграфічны дэфіцыт Беларускае ССР дзеля неваенных прычынаў можна раскласьці на гэткія чатыры групы: 1) ненароджаныя, 2) зьнішчаныя, 3) дэпартаваныя, 4) уцекачы.

I. Ненароджаныя

Пад ненароджанымі тут разумеюцца дэмаграфічныя страты тэрыторыі Беларускае ССР дзеля спаду й сталага нізкога ўзроўня гадавое лічбы нараджэньняў, спаду прынесенага на тэрыторыю савецкім палітычна-эканамічным ладам. Лічба ненароджаных дзеля гэтага пэрманэнтнага спаду становіць значную частку ўсяго дэмаграфічнага дэфіцыту Беларускае ССР за час дваццаці міжперапісных гадоў. Лічбы нараджэньняў, а за імі й лічбы натуральнага гадавога прыросту моцна спалі ў Беларускай ССР яшчэ перад перапісам 1939 году, нейдзе ад пачатку трыццатых гадоў, калі быў разгорнуты масавы Сталінскі тэрор. Хоць лічбы натуральнага руху жыхарства БССР тае пары й ня былі ніколі публікаваныя, адылі зь некаторых пасярэдніх дадзеных можна зрабіць выснаў, што лічба натуральнага прыросту ўжо ніколі не магла падняцца да тэй роўні, якую яна мела ў пару НЭП-у, ані навет ніколі не дасягнула вышыні тыповай сярэдняй для гадоў спакойных на тэрыторыі Беларусі ў XX ст. — 20 на 1000, ці 2%.

Лічбы нараджэньняў і натуральнага гадавога прыросту для Беларускае ССР таксама не публікаваліся за міжперапісныя паваенныя гады. У статыстычных зборніках СССР, якія друкаваліся ад 1956 году, падаюцца лічбы натуральнага руху жыхарства, пачынаючы ад 1950 году, але сярэднія для ўсяе тэрыторыі СССР, а не для паасобных рэспублікаў. Не падае іх і апублікаваны ў 1957 годзе ў Менску статыстычны зборнік Беларускай ССР.[32] З пададзеных, аднак-жа, агульных лічбаў для СССР, дый зь некаторых сьветчаньняў прэсы БССР, можна зрабіць выснаў, што й у «лепшыя» савецкія паваенныя гады лічбы нараджэньняў і натуральнага прыросту на тэрыторыі Беларускае ССР ніжэйшыя й за савецкія сярэднія, што будзе зразумелым, калі возьмем на ўвагу стала трываючыя масавыя высяленьні з рэспублікі наймаладзейшых кантынгэнтаў яе жыхарства. Сам пэрманэнтны спад лічбы нараджэньняў на тэрыторыі Беларускае ССР, спрычынены савецкім рэжымам за міжперапісныя неваенныя гады, дае каля **1 мільёна** дэмаграфічных стратаў на студзень 1959 году, калі за нармальную для тэрыторыі лічбу гадавога прыросту прыняць 20 на 1000, а за сярэднюю зьніжаную савецкім ладам — 16 на 1000. Гэта й будзе прыблізна лічба дэмаграфічных стратаў у дадзеным адрэзку часу «ненароджанымі».

2. Зьнішчаныя

Можна адцеміць тут колькі важнейшых фазаў на працягу 20-ці міжперапісных гадоў, у якія нішчэньні жыхарства Беларускае ССР савецкім рэжымам праводзіліся асабліва масава:

[32] Народное хозяйство Белорусской ССР за 40 лет.

1. Зьнішчаныя зь земляў былое Заходняе Беларусі посьле яе акупацыі савецкаю арміяй у верасьні 1939 году і аж да часу выбуху нямецка-савецкае вайны ў канцы чэрвеня 1941 году. Зьнішчэньні былі асабліва вялікімі ў часе савецкага адступленьня перад нямецкаю арміяй у канцы чэрвеня 1941 году, калі НКВД масавымі экзэкуцыямі ня раз намагалася сьпешна ліквідаваць свае перапоўненыя вязьніцы. Праводзіліся гэтыя ліквідацыі й у часе эвакуацыйных канвояў зьняволеных, як прыкладам у часе перагону вязьняў менскіх астрогаў у Чэрвень у канцы чэрвеня 1941 году. Сюды залічаюцца й тыя спасярод дэпартаваных у канцэнтрацыйныя лягеры зь земляў Заходняе Беларусі, якія пазьней тамака загінулі.

2. Жыхары ўсяе тэрыторыі рэспублікі ці то зьнішчаныя на месцы, ці што загінулі посьле дэпартацыі іх у канцэнтрацыйныя лягеры ў першыя месяцы й гады посьля рэакупацыі тэрыторыі Беларускае ССР ад нямецкае арміі ўлетку 1944 году. Гэтае нішчэньне вялося пад відам пакараньняў за выяўлены Беларусамі патрыятызм і антысавецкія настроі, за ўдзел у антысавецкай партызанцы або за судзейнасьць зь ёю, дый, пад закідам супрацоўніцтва зь Немцамі.

3. Сталыя ліквідацыі дый ссылкі на зьнішчэньне ў канцэнтрацыйныя лягеры індывідуальныя й масавыя, — характэрная неадлучная прыкмета Сталінскіх гадоў савецкага рэжыму.

Дакладную лічбовую вялічыню зьнішчанага гэтак жыхарства рэспублікі знаюць хіба толькі архівы НКВД, ці іншых адпаведных савецкіх органаў палітычнага тэрору. Тут можна даць толькі спробу асьцярожнае лічбовае ацэны гэтых стратаў, улучна із спрычыненым дзеля іх убыткам у натуральным прыросьце жыхарства рэспублікі, у праекцыі на пачатак 1959 году, у вагульнай вышыні на поўмільёна чалавек.

3. Дэпартаваныя

Да гэтае катэгорыі тут залічаюцца ў першую чаргу ўсе дэпартаваныя з тэрыторыі Беларускае ССР у міжперапісныя гады дый накіраваныя ў канцэнтрацыйныя лягеры, якія, хоць і выжылі, але на тэрыторыю свае рэспублікі ўжо больш не вярнуліся. Далей усе высланыя ў прымусовыя лягеры нявольніцкае працы дый усе вывезеныя на прымусовае перасяленьне. Да агульнае сумы іх дадаецца страчаны для рэспублікі спадзяваны ад іх натуральны прырост. Адцеміць гэтта трэба гэткія важнейшыя хвалі дэпартацыяў жыхарства з тэрыторыі Беларускае ССР у разгляданым пэрыядзе часу:

1. Масавыя дэпартацыі жыхарства зь земляў былое Заходняе Беларусі ад часу савецкае акупацыі ў верасьні 1939 году да часу выбуху нямецка-савецкае вайны ў канцы чэрвеня 1941 году. Гэтыя вывазы былі праведзеныя галоўна трымя наваротамі: 9-10 лютага 1940 году, у травені 1940 году дый на конаднях нямецка-савецкае вайны.

2. Масавыя дэпартацыі посьле савецкае рэакупацыі тэрыторыі Беларускае ССР ад Немцаў улетку 1944 году дый у першыя паваенныя гады, праводжаныя як рэпрэсіі за выяўленыя антысавецкія настроі.

3. Дэпартацыі жыхарства Беларускае ССР для засяленьня савецкае часткі былое нямецкае Ўсходняе Прусіі, г. зв. Калінінградзкае акругі. Па-

водля шматлікіх сьветчаньняў, сярод сучаснага жыхарства гэтае акругі шмат высяленцаў зь Беларускае ССР [33]).

4. Пэрманэнтныя масавыя й індывідуальныя дэпартацыі жыхарства ў канцэнтрацыйныя лягеры, у лягеры катаржнае прымусовае працы дый на ссылкі, тыповыя для сталінскіх гадоў савецкае дыктатуры.

5. Сталыя рэкрутацыі адзінокіх і сем'яў зь Беларускае ССР у паваенныя гады для перасяленьня ў вакругі савецкае эўрапэйскае Поўначы дый у раёны савецкае Азіі. Заклікі для рэгістрацыі на гэткія перасяленьні ішлі ўвесь час у прэсе Беларускае ССР у паваенныя гады з адначаснымі парукамі дармавога перавозу, грашовых дапамогаў на пасяленьне й г. д.

6. Масавыя прымусовыя вывазы зь Беларускае ССР адзінокіх і сем'яў, пачатыя ў сакавіку 1954 году зь ініцыятывы Хрушчова для выконваньня ягонага пляну «асваеньня цалінных земляў». Дэпартаваныя кіраваліся пераважна ў Казахскую ССР дый іншыя акругі савецкае паўдзённае Азіі.[34]

7. Масавыя прымусовыя вывазы на сталае пасяленьне, галоўна моладзі, зьвязаныя з заклікам Цэнтральнага Камітэту КП СССР з 19 травеня 1956 году. Мэта дэпартацыяў — індустрыялізацыя й засяленьне мала разьвітых краінаў СССР, галоўна савецкае Азіі дый эўрапэйскае савецкае Поўначы.[35])

Лік дэпартаваных ці ў канцэнтрацыйныя лягеры, ці ў лягеры прымусовае працы, якія выжылі, але не вярнуліся назад у Беларускую ССР, а таксама дэпартаваныя на прымусовыя перасяленьні, становіць найвышэйшую лічбовую пазыцыю ў дэмаграфічным дэфіцыце Беларускае ССР неваеннага паходжаньня. Агульную лічбу дэпартаваных і пераселеных з тэрыторыі рэспублікі, разам з прычыненым дзеля гэтага для рэспублікі ўбыткам у натуральным прыросьце жыхарства, за час на пачатак 1959 году можна азначыць на кругла 1 500 000.

4. Палітычныя ўцекачы

Даволі значную па вялічыні частку дэмаграфічнага дваццацігодняга дэфіцыту Беларускае ССР становіць і лічба палітычных уцекачоў. Ад палітычнае эміграцыі й уцёкаў за межы савецкі рэжым намагаецца заўсёды забясьпечыць сябе сваею строга пілнаванаю дзяржаўнаю мяжою дый недапусканьнем да выездаў за межы СССР сваім звычайным грамадзянам. Гэтак паўстала ведамая савецкая «зялезная заслона». Заслона гэтая аднак-жа была часова адсунутая з тэрыторыі Беларускае ССР Другою сусьветнаю вайною, і значная частка жыхарства Беларускае ССР у пачатковай ваеннай і канцавой паваеннай фазе скарыстала з гэтага, каб вымкнуцца з засягу савецкага рэжыму й, асабліва, ворганаў яго палітычнага тэрору. У дваццацігоднім міжперапісным пэрыядзе часу трэба адцеміць гэткія важнейшыя палітычныя эміграцыйна-бежанскія хвалі з тэрыторыі Беларускае ССР:

---

[33] Глядзі „New York Times", Dec. 28, 1946. Таксама „Lithuanian Bulletin", VII, New York, January—March 1949.

[34] Аб масавых дэпартацыях-перасяленьнях жыхарства зь Беларускае ССР у пару дыктатуры Хрушчова падрабязьней у: Genocide in the USSR. Institute for the Study of the USSR. Munich 1958, b. 87. А таксама ў: The Crimes of Khrushchev, Part 6. Committee on Un-American Activities. House of Representatives, Washington, 1960, b. 19—24.

[35] «Правда» і «Известия» з 19 травеня 1956 г.

1. Палітычныя эмігранты-уцекачы, якім удалося пакінуць тэрыторыю рэспублікі ў часе апошняе сусьветнае вайны дый эміграваць у краі Захаду: Заходнюю Эўропу, краі Амэрыкі, у Аўстралію. Галоўныя масы гэтае новае эміграцыі зь Беларусі знаходзяцца сяньня ў Нямеччыне, Францыі, Бэльгіі, Англіі, ЗША, Канадзе, Аргентыне, Аўстраліі. Па сваей нацыянальнасьці эмігранты гэтыя Беларусы, Палякі, Жыды, а ў меншым ліку й асобы іншых нацыянальнасьцяў тэрыторыі Беларусі. Лічбова гэтую новую эміграцыю з тэрыторыі Беларускае ССР можна ацаніць на прыблізна 100.000. Частку яе становяць «непаваротцы» зь ліку вывезеных Немцамі на прымусовыя працы ў Нямеччыну ў часе апошняе вайны, а якія не захацелі варочацца назад на свае землі пад уладу савецкага татальнага рэжыму.

2. Палітычныя эмігранты-ўцекачы, што паходзяць галоўна з тэрыторыі былое Заходняе Беларусі, а якія ў часе пачатковай, і ў канцавую фазу вайны, а часткова й у першую пару па сканчэньні гэтае вайны, самі пакінулі свае землі дый пераехалі на тэрыторыю сучаснае Польшчы, каб гэтак вымкнуцца зь беспасярэдняга засягу савецкага рэжыму. Між імі значная частка такіх, што кіраваліся далей на Захад, але якія не пасьпелі туды эміграваць дзеля хуткага разьвіцьця ваенных падзеяў. Сотні тысячаў гэткіх уцекачоў з тэрыторыі сучаснае Беларускае ССР рассыпаныя ў польскай частцы былых нямецкіх Усходніх Прусаў, на польскіх новаздабытых ад Немцаў землях на захадзе, і наагул на ўсей тэрыторыі сучаснае Польшчы. Гэтыя выхаджэнцы зь Беларусі пераважаюча беларускае, але ў значнай меры й польскае нацыянальнасьці. Агульны лік іх трэба ацэньваць як большы за поўмільёна.

3. Жыхарства Беларускае ССР, якое было перaселенае ў паваенную Польшчу ў выніку афіцыйнае вымены жыхарства між Польшчаю й СССР, што праводзілася галоўна ў гадох 1944-1947, а ў меншых памерах адбывалася й пазьней. Перасяленьне гэтае мела адбывацца на дабравольных асновах, з выменаю польскага жыхарства зь Беларускае ССР, на беларускае з Польшчы. Агульна ведама, што пад відам «Палякоў» выяжджалі тады ў вялікай масе й Беларусы, дый ня толькі каталікі, але й праваслаўныя. На абшарах новазанятых Польшчаю былых нямецкіх прастораў сяньня існуе каля 80-ці праваслаўных прыходаў, складзеных пераважна зь беларускіх уцекачоў і перасяленцаў.[36]) Лік перасяленцаў зь Беларускае ССР у часе гэтае вымены, толькі за гады 1944-1947, паводля публікаваных афіцыйных дадзеных, станавіў 274 163. Паколькі гэтая акцыя вымены праводзілася далей і ў гадох 1956-1959, калі Масква дазволіла выехаць з СССР у Польшчу й некаторым палітычным зьняволеным дый ссыльным, «былым польскім грамадзянам», сярод якіх было шмат і такіх, што паходзілі зь земляў былое Заходняе Беларусі, дык лік гэты можна азначыць як ня менш за 300 000.[37]

Улічваючы ўсе вышэй названыя катэгорыі палітычнае эміграцыі з тэрыторыі Беларусі дый дадаўшы адпаведную суму стратаў дзеля яе ў натуральным прыросьце, можна азначыць прыблізны лік страты жыхарства Беларускае ССР дзеля палітычнае эміграцыі ў міжперапісным пэрыядзе на кругла **1 000 000.**

---

[36] Православный календарь на 1961 год. Варшава, 1961, б. 62—72.

[37] Дакладней аб вымене жыхарства між Польшчаю й Беларускаю ССР у працы: Мікола Волацiч — Насельніцтва Заходняе Беларусі й яго перасяленьне між сучаснай Польшчай і БССР. «Беларускі Зборнік», кн. 4. Інстытут для Вывучэньня СССР. Мюнхен, 1956, б. 23—34.

ЛІЧБОВЫ РАСКЛАД УСІХ ДЭМАГРАФІЧНЫХ СТРАТАЎ РЭСПУБЛІКІ

На аснове папярэдняга разгляду можна бачыць, што вышыня агульнага дэмаграфічнага дэфіцыту рэспублікі за 20 міжперапісных гадоў выражаецца лічбаю 6 мільёнаў. Гэтая лічба, як выводная зь ліку апошняга перапісу дый аблічэньняў абапертых на лічбе сярэдняга гадавога прыросту жыхарства тэрыторыі ў нармальныя, спакойныя гады, належыць да катэгорыі абгрунтаваных на матэматычным абліку, а не вялічыняў толькі ацэначных. Таксама вышыня дэмаграфічнага дэфіцыту, спрычыненага ваеннымі стратамі жыхарства, абапертая на афіцыйнай савецкай ацэне, якую падаў да ведама першы сакратар КП БССР К. Мазураў, асоба ў дадзеным пытаньні, з гледзішча на сваё становішча, найбольш кампэтэнтная.

Затое расклад дэмаграфічнага дэфіцыту рэспублікі неваеннага паходжаньня па катэгорыях даводзілася праводзіць ужо блізу вылучна шляхам ацэны. Ніякіх статыстычных дадзеных пра абсалютную вышыню паасобных катэгорыяў неваенных дэмаграфічных стратаў Беларускае ССР блізу ня існуе. Лічбы зьнішчаных, дэпартаваных і выселеных з рэспублікі, пэўне-ж, знаходзяцца нейдзе ў цэнтральных архівах МГБ, ці іншых адпаведных савецкіх установаў, але цяжка спадзявацца, каб лічбы гэтыя былі апублікаваныя, як доўга трывае сучасны савецкі рэжым. Ад 1928 году савецкімі ўладамі ня былі публікаваныя й лічбы натуральнага руху жыхарства рэспублікі, навет і за апошнія паваенныя гады, калі ЦСУ публікуе гэтыя лічбы ў сярэднім абліку для ўсяго СССР. Бяз гэтых лічбаў немагчыма ўстанавіць дакладна й наколькі савецкая сыстэма абнізіла на тэрыторыі Беларускае ССР тыповую для яе ранейшую высокую лічбу натуральнага гадавогу прыросту, хоць яна бясспрэчна была нізкою ўжо ад пачатку палітычнага тэрору ў 1930-х гадох. Дзеля гэтага й лічба стратаў тэрыторыі «ненароджэнымі» носіць характар лічбы ацэначнае, прыблізнае. Вось дзеля ўсіх гэтых прычынаў, калі агульная лічба дэмаграфічнага дэфіцыту рэспублікі, як і падзел яго на страты ваенныя й неваенныя абаперты на статыстычных фактах, дык затое сам расклад стратаў жыхарства дзеля прычынаў неваенных паводля адпаведных групаў носіць ужо характар толькі прыблізных ацэначных лікаў, азначаных галоўна на аснове беспасярэдняе веды гістарычных падзеяў у міжперапісным часе на тэрыторыі Беларускае ССР, дый толькі часткова на існуючых канкрэтных лічбовых дадзеных. Лікі гэткага прыблізнага раскладу дэмаграфічных стратаў тэрыторыі Беларускае ССР, якія былі азначаны ў папярэднім разьдзеле гэтае працы, падсумаваныя на табл. 4.

Табл. 4: Расклад дэмаграфічнага дэфіцыту Беларускае ССР ад студзеня 1939 да студзеня 1959 па прычынах яго паходжаньня

		Вышыня стратаў
Агульны дэмаграфічны дэфіцыт рэспублікі		6 000 000
З чаго: страты ваенныя		2 000 000
неваенныя		4 000 000
Неваенныя страты раскладаюцца на:		
1. Ненароджаныя	1 000 000	
2. Зьнішчаныя	500 000	
3. Дэпартаваныя	1 500 000	
4. Уцекачы	1 000 000	

Трэба мець яшчэ наўвеце, што лічбы стратаў пададзеныя на табліцы, гэта не абсалютныя голыя лічбы самых стратаў дадзенае катэгорыі, а яны абыймаюць разам і выпаўшы дзеля іх натуральны прырост жыхарства ў праекцыі на пачатак 1959 году. Для прыкладу: 100 000 дэпартаваных з Заходняе Беларусі нейдзе ў 1940 годзе, да пачатку 1959 году вырасьце ў дэмаграфічную страту вышыні блізу 140 000 дзеля страчанага разам для рэспублікі натуральнага прыросту ад дадзенага ліку. Тая-ж самая лічба 100 000 вывезеных у 1954 годзе ў Казахстан да пачатку таго-ж 1959 году вырасьце ў дэмаграфічную страту рэспублікі вышыні ўсяго каля 110 000, паколькі да 1959 году з гэтае лічбы губіцца натуральны прырост усяго 5-ці гадоў. Дык лічбы табліцы даюць вышыню дэмаграфічнага ўбытку паводля паасобных катэгорыяў у праекцыі на пачатак 1959 году, а не самыя абсалютныя лікі ненароджаных, зьнішчаных, дэпартаваных ці ўцекачоў, якія будуць заўсёды адпаведна ніжэйшыя.

Калі прыглядзіцца яшчэ да дваццацігодніх дэмаграфічных стратаў рэспублікі, паказаных на табл. 4, дык можна заўважыць, што страты й убытак жыхарства, па іх характару, апрача падзелу на страты ваенныя й неваенныя, можна разьбіць яшчэ на дзьве важныя катэгорыі ў іншай роўніцы. Да аднае будзе належыць увесь убытак жыхарства ваеннага паходжаньня дый катэгорыі ненароджаных і зьнішчаных із стратаў неваенных. Разам яны станоўяць лік таго жыхарства, якое сяньня ня існуе ані на тэрыторыі Беларускае ССР, ані паза ею, — гэта страты абсалютныя. Групы-ж дэпартаваных і ўцекачоў становяць другую частку, — гэта жыхарства, што сяньня існуе і мае свой той ці іншы натуральны прырост, але існуе паза тэрыторыяй Беларускае ССР. Гэта страты не абсалютныя, а толькі страты тэрыторыі рэспублікі. Дэпартаваныя існуюць-жывуць далей на прасторах савецкае Маскоўскае імпэрыі, а ўцекачы — у краёх свае эміграцыі. Лічбова, страты першае групы, абсалютныя, выражаюцца агульным лікам **3 500 000.** Гэта лік жыхарства страчанага й для тэрыторыі рэспублікі, і няіснуючага наагул. Лік жыхарства страчанага толькі для тэрыторыі рэспублікі меншы, у вышыні **2 500 000.**

Калі зьвернем цяпер сваю ўвагу на разьвіцьцё жыхарства Беларускае ССР у сучасную, посьлеперапісную пару, дык адцеміць трэба, што працэсы, якія спрычынілі неваенны дэфіцыт жыхарства, сяньня дзеюць на тэрыторыі рэспублікі ня ўсе або дзеюць не з аднолькавай інтэнсыўнасьцяй, як у ранейшыя гады. Гэтак, магчымасьці палітычных уцёкаў ці эміграцыі, у выніку паваеннае стабілізацыі савецкага рэжыму на тэрыторыі рэспублікі, з гэрмэтычна нанава зачыненымі межамі, сяньня ізноў ня існуюць. Выглядае, што апошнім часам не праводзіцца таксама беспасярэдняга, праз канцэнтрацыйныя лягеры, масавага фізычнага нішчэньня жыхарства. Затое ўзрасьлі значна лічбы прымусовага перасяленьня жыхарства з рэспублікі, прымусовых міграцыяў у сувязі зь мерапрыемствамі Хрушчова пад клічамі «асваеньня цаліны» ў савецкай Азіі дый засяляньня й індустрыялізацыі мала населеных прастораў імпэрыі. Выглядае, што дыктатура Хрушчова кладзе націск не на фізычнае нішчэньне, а больш на захаваньне дэпартаванага жыхарства, як патрэбнае працоўнае сілы, і як неабходнага людзкога матар'ялу для калянізацыі мала заселеных прастораў. Затое мацнейшы націск цяпер кладзецца на дэнацыяналізацыю й русыфікацыю й самых дэ-

партаваных, і, з другога боку, жыхароў рэспублікаў, куды масы дэпартаваных кіруюцца, з разьлікам на іх сьмерць ня фізычную, а нацыянальную.

Трэба яшчэ адцеміць, што разгляданыя тут лікі агульнага дэмаграфічнага дэфіцыту й стратаў неваеннага паходжаньня, гэта толькі лікі за 20 міжперапісных гадоў, за час ад пачатку 1939 да пачатку 1959 году. Яны не абыймаюць усіх стратаў прычыненых камуністычным расейскім рэжымам беларускай нацыянальнай тэрыторыі за ўсё існаваньне там савецкага ладу. Для азначэньня дэмаграфічных стратаў Беларускае ССР за ўвесь час яе існаваньня, да пададзенага ліку трэба дадаць яшчэ страты жыхарства рэспублікі міжваеннае пары дзеля масавага тэрору й дэпартацыяў у трыццатых гадох. Як вынікае з прыраўнаньня перапісных лікаў жыхарства Беларускае ССР з 1939 году, у вышыні 5 568 000, і 1926 году — 4 983 000, за 12 гадоў часу было толькі 585 000 прыросту, ці менш 1% у год. А, тымчасам, выходзячы зь сярэдняе нармальнае лічбы прыросту для тэрыторыі 2%, на пачатку 1939 году, з 4 983 000 у канцы 1926, павінна быць 6 331 000, а не 5 568 000, як выказаў перапіс. Значыцца дэмаграфічны недалік жыхарства Беларускае ССР у часе сьнежань 1926 — студзень 1939, выносіў дакладна 763 000. Вось гэтая лічба, разам з дэмаграфічным дэфіцытам 6 045 000 за апошні дваццацігодні міжперапісны час, дае суму 6 808 000 усіх дэмаграфічных стратаў Беларускае ССР у часе ад 17 сьнежня 1926 да 15 студзеня 1959 году.

РАЗЬМЯШЧЭНЬНЕ ЖЫХАРСТВА ПА АКРУГАХ

У першай публікацыі тымчасовых вынікаў апошняга савецкага перапісу жыхарства ЦСУ падало лік жыхарства Беларускае ССР па сямі існаваўшых у перапісным часе акругах — «вобласьцях» — рэспублікі.[38] Лічбы гэтыя й пададзеныя ніжэй у табл. 5. Паверхня паасобных акругаў у квадратных кілямэтрах падаецца паводля іншых афіцыйных савецкіх публікацыяў.[39] Дадаткова дадзеная аблічаная гушчыня засяленьня паасобных акругаў.

Табл. 5: Лік жыхарства, паверхня й гушчыня засяленьня Беларускае ССР па акругах і паводля стану на 15 студзеня 1959 году

Акругі	Лік жыхароў у тысячах	Тэрыторыя ў тысячах кв. км.	Гушчыня засяленьня на кв. км.
Берасьцейская	1 205	34	35.4
Віцебская	935	28	33.4
Гомельская	1 355	40	33.9
Горадзенская	897	20	44.8
Менская	1 728	35	49.4
Менская бязь Менску	1 219	35	34.8
Магілеўская	1 130	27	41.9
Маладэчанская	810	24	33.7
Беларуская ССР	**8 060**	**208**	**38.8**

[38] «Правда» і «Известия» 10. 5. 1959.
[39] Народное хозяйство Белорусской ССР за 40 лет, б. 269.

Зь лічбаў табліцы відаць, што найвышэйшым лікам жыхарства выдзялялася Менская акруга з 1 728 000, за ею ўжо ішла Гомельская з 1 355 000. Найменш мела Маладэчанская — 810 000. Што да Менскае акругі, дык па ліку жыхарства яна высоўваецца на першае месца яўна толькі дзякуючы факту існаваньня на тэрыторыі акругі сталічнага места Менску. Бязь Менску акруга лікам жыхарства ўступала-б першае месца Гомельскай. Ніякага супастаўленьня ліку жыхарства па акругах у гадох 1959 і 1939 нажаль немагчыма зрабіць дзеля таго, што ў 1939 годзе адміністрацыйны падзел тэрыторыі ў даваеннай БССР быў зусім іншы. Пры тым, ніякіх вынікаў перапісу 1939 году па акругах наагул ня было публікавана.

Ужо посьле перапісу, 20 студзеня 1960 году, Прэзыдыюм вярхоўнага савету Беларускае ССР выдаў дэкрэт, якім была скасаваная Маладэчанская акруга, а ейныя раёны былі падзеленыя між Віцебскай, Менскай дый Горадзенскай акругамі.[40] Скасаваньне Маладэчанскае акругі было афіцыйна матываванае мэтаю скараціць гэтак адміністрацыйна-бюракратычны апарат дый зводьненых урадоўцаў перакінуць у адміністрацыю калгасаў. Тое, што ліквідацыя акругі была праведзеная ўсяго колькі месяцаў посьле абвешчаньня вынікаў перапісу, зь якіх выявілася вялікая ступень вылюдненьня Беларускае ССР, насоўвае думку, што беспасярэднюю прычынаю ліквідацыі акругі маглі быць і гэтыя вынікі перапісу. Праводжанае савецкім рэжымам сыстэматычнае вылюдненьне Беларускае ССР масавымі вывазамі жыхарства, нязвычайна вялікія памеры якіх перапіс 1959 году й выказаў, у сваей лягічнай кансэквэнцыі мусіць і весьці да паступовага зьмяншаньня й адміністрацыйных адзінак рэспублікі. Адначасна зь ліквідацыяй Маладэчанскай акругі было зьліквідавана й 15 раёнаў дый паменшаны лік сельсаветаў на 146.

У 1960 годзе, у статыстычным гадавіку на 1959 год, ЦСУ апублікавала вынікі перапісу 1959 году, у якіх перапісныя лічбы датычныя Беларускае ССР раськінутыя ўжо паводля новага, посьлеперапіснага падзелу рэспублікі на 6 акругаў.[41] Жыхарства на тэрыторыі гэтых новых акругаў на 15 студзеня 1959 году, паводля дадзеных гэтага гадавіка, раскладалася так, як паказана на табл. 6. Паводля гэтага-ж гадавіка падаецца на табліцы й гушчыня засяленьня. Тэрыторыя-ж павялічаных акругаў Віцебскай, Горадзенскай дый Менскай аблічана для табліцы адмыслова.

Як бачым з Табл. 6, і посьле апошняга адміністрацыйнага перадзелу рэспублікі Менская акруга захоўвае сваё першае месца па ліку жыхарства, а Гомельская другое. На апошнім месцы, заміж скасаванае Маладэчанскае, апынулася цяперка Горадзенская акруга з 1 077 000 жыхарамі. Пры падзеле рэспублікі на 6 акругаў, усе акругі лікам жыхарства перавышаюць адзін мільён, а Менская навет і 2 мільёны. Зьмяніліся адпаведна й лічбы гушчыні жыхарства паасобных акругаў. Зьмены гушчыні ў акругах, вялічыні якіх новы перадзел не крануў, — Берасьцейскай, Гомельскай дый Магілеўскай, — у прыраўнаньні зь лічбамі на папярэдняй табліцы, паясьняюцца хіба ўдакладненьнямі вынікаў перапісу.

---

[40] «Звязда» № 17, 21. 1. 1960.

[41] Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 31—32.

Табл. 6: Лік жыхарства, паверхня й гушчыня засяленьня Беларускае ССР па акругах паводля перадзелу рэспублікі 20. 1. 1960. Лічбы жыхарства паводля стану ў часе перапісу 15. 1. 1959 г.

Акругі	Лік жыхароў у тысячах	Тэрыторыя ў тысячах кв. км.	Гушчыня засяленьня на кв. км.
Берасьцейская	1 205	34	35.8
Віцебская	1 247	40	31.1
Гомельская	1 357	40	34.0
Горадзенская	1 077	26	43.1
Менская	2 037	41	49.7
У гэтым Менск	509	—	—
Магілеўская	1 132	27	41.5
Беларуская ССР	**8 055**	**208**	**38.8**

ЗЬМЕНЫ ГУШЧЫНІ ЗАСЯЛЕНЬНЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАЕ ССР

Натуральная рэч, што памяншэньне ліку жыхарства рэспублікі, якую выявіў перапіс 1959 году, яе дэпапуляцыя выражаецца й адпаведным спадам гушчыні засяленьня тэрыторыі Беларускае ССР. Сярэдняя гушчыня засяленьня рэспублікі ў часе перапісу была 38.8 чалавек на кв. км. Найвышэйшую гушчыню засяленьня выказвае Менская акруга, за ёю ідзе Горадзенская дый Магілеўская. Найніжэйшая гушчыня засяленьня ў Віцебскай акрузе. Вышэйшая гушчыня засяленьня на тэрыторыі Менскае акругі яўна абумоўленая фактам існаваньня ў акрузе паўмільённага сталічнага Менску. Гушчыня засяленьня на тэрыторыі самое акругі, бязь Менску, выражаецца лічбаю 37.3 ч. на кв. км. Памеры спаду гушчыні засяленьня тэрыторыі на працягу дваццаці міжперапісных гадоў паказвае табл. 7. Лічбы гушчыні засяленьня на гэтай табліцы пададзеныя для гадоў 1939 і 1959, у ваблічэньні для цэлае сучаснае тэрыторыі рэспублікі, і, асобна, для тэрыторыі даваеннае БССР і тое тэрыторыі былое Заходняе Беларусі, што далучаная ў часе апошняе вайны да Беларускае ССР.

Табл. 7: Зьмены гушчыні засяленьня тэрыторыі Беларускае ССР у часе ад пачатку 1939 году да пачатку 1959 году

Тэрыторыя	Лік жыхароў на кв. км. 1939 г.	1959 г.	Спад
БССР у даваенных межах	44.2	39.7	—4.5
Землі былое Заходняе Беларусі	46.6	37.4	—9.2
БССР у сучасных межах	45.0	38.8	—6.2

З табл. 7 відаць, што гушчыня засяленьня на ўсей тэрыторыі Беларускае ССР за 20 міжперапісных гадоў зьнізілася ў сярэднім на 6.2 чалавек на кв. км. Лічбы табліцы паказваюць таксама важны дэмаграфічна факт, што зьніжэньне гушчыні засяленьня ня было раўнамерным на тэрыторыі былое Заходняе Беларусі й тэрыторыі даваеннае БССР. На даваеннай тэрыторыі БССР спад гэты вышыні 4.5 чл. на кв. км., калі тымчасам на далучаных землях Заходняе Беларусі — 9.2 чл. на кв. км. З гэтага вынікае, што тэры-

тар'яльныя страты жыхарства на землях былое Заходняе Беларусі за дваццацігодні час больш як у два разы вышэйшыя за такія-ж страты на тэрыторыі даваеннае БССР.

Вылічэньне гушчыні засяленьня асобна для прасторы даваеннае БССР, і асобна для той тэрыторыі былое Заходняе Беларусі, што сяньня ўходзіць ў склад рэспублікі, дае магчымасьць нам зрабіць той адміністрацыйны падзел рэспублікі на акругі, які існаваў у часе перапісу. Паводля гэтага падзелу акругі Берасьцейская, Горадзенская й Маладэчанская складалі далучаную тэрыторыю былое Заходняе Беларусі. Чатыры-ж іншыя акругі станавілі даваенную тэрыторыю Беларускае ССР, з тым малым выняткам, што раёны Клецкі, Нясьвіскі й Стаўпецкі Менскае акругі былі прырэзаныя да яе ад земляў былое Заходняе Беларусі. Вось, калі ад ліку жыхарства ўсходніх акругаў адняць жыхарства, якое павінна прыпадаць на тэрыторыю гэтых трох раёнаў, дый дадаць яго да жыхарства трох заходніх акругаў — посьле гэтае карэктуры атрымаем падзел сучаснага жыхарства на тэрытор'яльныя дзьве часткі: старое ўсходняе тэрыторыі, і новае заходняе. Наглядна розьніцу спаду ліку жыхарства на заходніх і ўсходніх землях рэспублікі, выражаную ў лічбах абсалютных, паказвае табл. 8.

Табл. 8: Спад ліку жыхарства на заходніх і ўсходніх землях рэспублікі у часе ад пачатку 1939 году да пачатку 1959 году

Тэрыторыя	Лік жыхарства ў тысячах 1939 г.	1959 г.	Недалік у тысяч.	Недалік у %
Землі былое Заходняе Беларусі	3 776	3 055	—721	—20.0
Землі даваеннае БССР	5 568	5 000	—568	—10.0
Уся сучасная БССР	9 344	8 055	—1 289	—13.4

Табл. 8 паказвае, што хоць на землях былое Заходняе Беларусі ў 1939 годзе было значна менш жыхарства, як на землях усходніх, дык недалік там жыхарства на пачатку студзеня 1959 году аказаўся вышэйшы, бо 721 000, калі на тэрыторыі даваеннае БССР з куды большым лікам жыхартва гэты недалік быў значна меншым, бо 568 000. Выражаючы гэтую розьніцу ў працэнтах, можна бачыць, што калі даваенная тэрыторыя Беларускае ССР выказвае на пачатку 1959 году нястачу 10% свайго жыхарства з 1939 году, дык тэрыторыя былое Заходняе Беларусі не далічаецца 20% ці два разы больш. Практычна гэта значыць, што на тэрыторыі даваеннае БССР не стае кажнага дзесятага жыхара, а на тэрыторыі былое Заходняе Беларусі кажнага пятага. Выяўленая перапісам 1959 году вышэйшая ўдвая ступень дэпапуляцыі земляў Заходняе Беларусі за землі даваеннае БССР мусіць мець свае прычыны. Калі разглянуцца за імі, дык адзначыць трэба найперш гэткіх пяць важнейшых:

1. Масавыя савецкія дэпартацыі жыхарства з тэрыторыі Заходняе Беларусі ў часе ад яе акупацыі савецкаю арміяй у верасьні 1939 году да выбуху нямецка-савецкае вайны 22 чэрвеня 1941 году.

2. Уцёкі жыхарства былое Заходняе Беларусі на захад посьле заняцьця тэрыторыі савецкаю арміяй у верасьні 1939 году, і пазьней, у часе — дый посьле — нямецкага адступленьня з тэрыторыі Беларусі ў 1944 годзе. Гэтыя ўцёкі жыхарства на захад перад наступам савецкае арміі ў канцавой фазе вайны дзеля самога геаграфічнага палажэньня былі больш магчымыя жы-

харству зь земляў Заходняе Беларусі, як земляў усходяе часткі Беларускае ССР.

3. Пры афіцыйнай вымене жыхарства між Польшчаю й Беларускаю ССР, якая адбывалася галоўна ў гадох 1944—1947, выяжджаць у Польшчу пад відам Палякаў ці проста былых польскіх грамадзян мела магчымасьць толькі жыхарства Заходняе Беларусі. У выніку гэтае вымены з тэрыторыі Заходняе Беларусі выехала ў Польшчу больш 300 000 чалавек. Падобная магчымасьць выезду для жыхарства земляў даваеннае БССР практычна ня існавала.

4. Як сьветчаць некаторыя савецкія дэмаграфы, вывазы на прымусовыя перасяленьні ў паваенную пару праводзіліся з былых заходнябеларускіх земляў у куды большых памерах, як зь земляў даваеннае БССР. Гэтак А. А. Дольская кажа: «Месцам выхаду перасяленцаў зьяўляюцца ў васнаўным ... заходнія акругі БССР, дзе існуюць лішкі працаздольнага жыхарства, што выясьняецца высокім натуральным прыростам, вызваленьнем работнікаў зь існаваўшых тут старых прамысловых прадпрыемстваў у выніку іх мэханізацыі й ін.».[42]

5. Некаторы ўплыў на меншую лічбу недаліку жыхарства на ўсходзе рэспублікі мела й тое, што на тэрыторыі даваеннае БССР знайходзіцца сталічны Менск, які ў паваенную пару адзначыўся нязвычайным ростам. Хоць агульны лік жыхарства рэспублікі ад 1939 году паменеў больш як на мільён, дык Менск, наадварот, за гэты час павялічыў сваё жыхарства на цэлых 270 000. Гэты факт зрэдукаваў у некаторай ступені вышыню запраўднага недаліку жыхарства на тэрыторыі ўсходняй дый рэлятыўна павысіў лічбу гушчыні яе засяленьня.

СТАН УРБАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЕ ССР

У першай публікацыі ЦСУ тымчасовых вынікаў усесаюзнага перапісу 1959 году пададзеная й новая перапісная статыстыка меставога й неместавога жыхарства Беларускае ССР па акругах рэспублікі з супастаўленьнем з такімі-ж лічбамі на 1939 год.[43] Тыя-ж дадзеныя паўтораныя ў гадавіку ЦСУ на 1959 год, але зь некаторымі зьменамі ў вышыні лічбаў дый паводля новага адміністрацыйнага падзелу рэспублікі на 6 акругаў.[44] Лічбы із статыстычнага гадавіка ЦСУ пададзеныя на табл. 9.

Дадзеныя табл. 9 паказваюць, што з пасярод 6-ці акругаў рэспублікі найбольшым працэнтам меставога жыхарства выдзяляецца Менская акруга, але гэта яўна, як і ў выпадку гушчыні засяленьня, толькі дзякуючы існаваньню на тэрыторыі акругі паўмільённага сталічнага Менску. З пасярод іншых акругаў найвышэйшы працэнт меставога жыхарства выказваюць акругі Віцебская ды Магілеўская, па 32%. Ужо ніжэй сярэдняе рэспублікі Гомельская, бо 29%, і найніжэйшыя працэнты урбанізацыі ў акругах Берасьцейскай, — 24%, дый, на апошнім месцы, Горадзенскай, 23%. Агульна трэба сказаць, што рэспубліка, нягледзячы на сталую савецкую прапаган-

[42] А. А. Дольская. Социалистический закон народонаселения. Москва, 1959, б. 97—98.

[43] «Правда» і «Известия», 10. 5. 1959.

[44] Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 31—32.

ду пра яе урбанізацыю, застаецца й надалей краем пераважаюча сялянскім з 69% неместавога жыхарства.

Табл. 9: Лічбы меставога й неместавога жыхарства Беларускае ССР паводля стану на 15. 1. 1959 г. па акругах

Акругі	Лік жыхарства на 15. 1. 1959 у тысячах; у гэтым			У % да ўсяго жыхарства	
	Усяго	Меставое	Неместавое	Меставое	Неместавое
Берасьцейская	1 205	284	921	24	76
Віцебская	1 247	404	843	32	68
Гомельская	1 357	389	968	29	71
Горадзенская	1 077	251	826	23	77
Менская	2 037	793	1 244	39	61
У гэтым Менск	509	509	—	100	—
Магілеуская	1 132	360	772	32	68
Беларуская ССР	**8 055**	**2 481**	**5 574**	**31**	**69**

З гледзішча свае ўрбанізацыі Беларусь і пры расейскім савецкім рэжыме, — падобна як было й пры расейскім царскім, — застаецца аднэй з найбольш адсталых краёў імпэрыі. Наглядна можна аб гэтым пераканацца з апублікаванай ЦСУ статыстычнай табліцы аб ліках меставога й неместавога жыхарства па рэспубліках СССР з адначасным паказаньнем працэнтнага росту меставога жыхарства ў часе ад 1939 да 15 студзеня 1959 году.[45]

Табл 10: Працэнтны лік жыхарства меставога па рэспубліках СССР у гадох 1939 і 1959 з % іх росту

Рэспублікі	Лік жыхарства меставога ў % да ўсяго жыхарства 1939	1959	Рост у %
Расейская СФСР	33	52	19
Украінская	34	46	12
Беларуская	**21**	**31**	**10**
Узбэкская	23	34	11
Казахская	28	44	16
Грузінская	30	42	12
Азэрбайджанская	36	48	12
Лятувіская	23	39	16
Малдаўская	13	22	9
Латвійская	35	56	21
Кіргіская	19	34	15
Таджыкская	17	33	16
Армянская	29	50	21
Туркменская	33	46	13
Эстонская	34	56	22
СССР	**32**	**48**	**16**

Як з табл. 10 відаць, па ступені свае урбанізацыі месца Беларускае ССР сярод рэспублікаў СССР передапошняе. Толькі адна Малдаўская ССР, з усяго 22% меставога жыхарства, мае большы працэнт жыхарства неместа-

[45] Тамсама, б. 10.

вога за Беларускую ССР. Усе іншыя рэспублікі маюць вышэйшую ступень урбанізацыі. Ёсьць між імі й такія, што 20 гадоў таму, у 1939 годзе, мелі меставога жыхарства значна меншы працэнт за Беларускую ССР, прыкладам рэспублікі Кіргіская й Таджыкская, а цяпер з гэтага гледзішча яны перагналі рэспубліку Беларускую. З табліцы можна таксама бачыць, што й па тэмпе урбанізацыі Беларуская ССР на шэрым канцы, перад аднэй Малдавіяй. За 20 міжперапісных гадоў лік меставога жыхарства Беларускае ССР павялічыўся ўсяго на 10%, пры сярэднім узросьце для ўсяго СССР 16%, а для РСФСР 19%. У колькі іншых рэспубліках узрост гэты вышэйшы й за 20%. З гэтага даводзіцца зрабіць выснаў, што ўрбанізацыя найпавальнейшым тэмпам у СССР адбываецца на тэрыторыі Беларускае рэспублікі, за адным, ізноў-жа, выняткам Малдавіі. Апрача ваенных зьнішчэньняў местаў Беларусі, у факце затарможанага тэмпа росту местаў рэспублікі, бясспрэчна ,адну з важнейшых роляў згулялі масавыя дэпартацыі жыхарства, дый Масквою плянова ўтрымліваная нізкая ступень індустрыялізацыі БССР.

Пры трываньні падобнага нізкага тэмпа ўрбанізацыі Беларускае ССР, рэлятыўная розьніца гэтае ўрбанізацыі, у прыраўнаньні зь іншымі рэспублікамі СССР, будзе ўзрастаць на яе некарысьць. А пры далейшых масавых вывазах жыхарства зь Беларускае ССР на перасяленьне ў іншыя рэспублікі імпэрыі, нейкага прысьпяшэньня тэмпа ўрбанізацыі спадзявацца няма ніякіх асноваў.

МЕСТЫ БЕЛАРУСКАЕ ССР

У першай публікацыі вынікаў усесаюзнага перапісу жыхарства ЦСУ пад 9-м пунктам апублікавала табліцу: «Лік жыхарства местаў, што зьяўляюцца цэнтрамі саюзных і аўтаномных рэспублікаў, краёў і акругаў, а таксама другіх местаў з жыхарствам больш 50 тысячаў, паводля тымчасовых дадзеных». У гадавіку ЦСУ на 1959 год пералік местаў СССР даецца з крыху зьмененымі лічбамі іх жыхарства.[46] Сярод іх падаецца й 10 местаў Беларускае ССР з жыхарствам больш 50 000. Гэтыя месты, лікі іх жыхарства ў 1939 і 1959 гадох, дый працэнтны іх рост дае табл. 11.

Табл. 11: Жыхарства местаў Беларускае ССР у часе перапісу 1959 году у прыраўнаньні да стану ў 1939 годзе

	Лік жыхарства ў тысячах		1959 г. у %
	1939	1959	1939 г.
1. Менск	237	509	215
2. Гомель	139	168	121
3. Віцебск	167	148	89
4. Магілеў	99	122	122
5. Бабруйск	84	98	116
6. Берасьце	41	74	178
7. Горадзень	49	73	148
8. Ворша	54	64	120
9. Барысаў	49	59	121
10 Баранавічы	27	58	212

[46] Тамсама, б. 35—44.

Зь лічбаў працэнтнага росту местаў Беларускае ССР за 20 міжперапісных гадоў можна бачыць, што, нягледзячы на вялізарныя ваенныя зьнішчэньні, усе месты ня толькі дасягнулі сваіх даваенных лікаў жыхарства, але іх і перавысілі. Выняткам з гэтага гледзішча ёсьць толькі адзін Віцебск, які ў 1939 годзе меў 167 000, а цяпер усяго 148 000, ці 89% даваеннага. Калі, аднак-жа, прыраўнаць тэмпа росту местаў Беларускае ССР да такога-ж тэмпа ў іншых рэспубліках СССР, дык выяўляецца, што яно ў Беларусі значна павальнейшае, на што паказвалі ўжо й раней пададзеныя нізкія працэнтныя лічбы росту меставога жыхарства ў Беларускай ССР. Вынятак у гэтым правіле станавілі толькі Менск дый месты былое Заходняе Беларусі — Баранавічы, Берасьце й Горадзень.

Асабліва шпаркім тэмпам росту адзначыўся Менск. Зь места вялічыні ніжэй чверці мільёна ў 1939 годзе, ён падняўся да рангі местаў вышэй поўмільёна. Можна падаць колькі прычынаў гэтага хуткага паваеннага росту Менску. Адна зь іх, гэта значнае ўзбуйненьне Беларускае ССР, сталічным адміністрацыйным цэнтрам якое ёсьць Менск. У выніку далучэньня да Беларускае ССР у часе Другое Сусьветнае Вайны земляў былое Заходняе Беларусі, ранейшая тэрыторыя рэспублікі павялічылася на 60%, і блізу на толькі-ж падняўся лік жыхарства. Гэты факт, бясспрэчна, мусіў адбіцца на раптоўным росьце адміністрацыйнага цэнтру рэспублікі, асабліва ў сыстэме гэтак выбуялае адміністрацыйнае бюракрацыі, якою ёсьць савецкі палітычны рэжым дый савецкі эканамічны лад. Шпаркі рост Менску — адбітак гэтага. Гэта непрапарцыянальна вялікая савецкая бюракратычная галава, што выбуяла на целе мала індустрыялізаванага дый слаба ўрбанізаванага краю.

Прычына другая, гэта тое, што ў выніку падзеяў і пераменаў Другое Сусьветнае Вайны Менск апынуўся на асабліва важным, бадай найважнейшым камунікацыйным шляху між імпэр'яльным цэнтрам Масквою, самою імпэрыяй, дый цэнтральнаю Эўропаю, дзе сяньня савецкія акупацыйныя арміі дый сатэлітныя дзяржавы. Эканамічныя й палітычныя сувязі зь імі, а таксама з краямі вольнымі Заходняе Эўропы, адбываюцца сяньня галоўна праз тэрыторыю Беларусі й Менск. Гэта, бязумоўна, адбілася таксама на росьце паваеннага Менску, як важнага камунікацыйна-транзытнага вузла імпэрыі на шляху ў цэнтральна-заходнюю Эўропу. Значна меншага значэньня для росту Менску быў трэйці факт — закладзіны ў ім колькі большых хвабрыкаў, як трактарнага дый аўтамабільнага заводаў.

Разглядаючы пералік местаў Беларускае ССР, кідаецца ў вочы, што на землях былое Заходняе Беларусі, якія сяньня ў складзе рэспублікі, няма аніводнага места ў раньзе больш ста тысячаў. Усе чатыры месты рэспублікі гэтае рангі, й дарастаючае пятае, Бабруйск, знайходзяцца на тэрыторыі старой, даваеннай БССР. Сталася гэта таму, што абодва большыя гаспадарчыя й культурныя гістарычныя меставыя цэнтры Заходняе Беларусі, — і Вільню, і Беласток, — Масква адрэзала ад тэрыторыі рэспублікі. Вільня яшчэ ад кастрычніка 1939 году была перададзеная Летуве, а Беласток, абвешчаны сталічным местам Заходняе Беларусі ў гадох 1939-1941, пры канцы апошняе сусьветнае вайны быў пераказаны новапаўсталай сатэлітнай Польшчы. У выніку, заходнія прасторы сучаснае Беларускае ССР аказаліся адрэзанымі ад сваіх натуральных гістарычна разьвітых, культурных і гандлёва-прамысловых асяродкаў. У Вільні перапіс 15 студзеня 1959 году вы-

казаў 236 000 жыхароў. Беласток, ваяводзкі цэнтр сучаснае Польшчы, у тым-жа часе меў 116 000 жыхароў.

Магчыма, што ў шпарчэйшым росьце местаў былое Заходняе Беларусі — Берасьця, Горадні дый Баранавічаў, — у некаторай ступені зазначыўся працэс кампэнсацыйнага іх павялічэньня на месцы страчаных натуральных меставых асяродкаў тэрыторыі, Вільні ды Беластоку. Галоўнаю, аднакжа, прычынаю хуткага росту местаў заходніх акругаў рэспублікі быў, бясспрэчна, працэс саветызацыі новазанятых Масквою тэрыторыяў, зь неадлучнаю ў дадзенай сыстэме бюракратызацыяй адміністрацыйнага й гаспадарчага апарату. На ўсходніх землях гэтая бюракратызацыя адбылася ўжо значна раней, на заходніх-жа ў паваенныя гады міжперапіснага пэрыяду, што й праявілася ў шпарчэйшым росьце местаў заходніх акругаў рэспублікі. Факт раптоўнага росту Менску ды колькі меншых заходнябеларускіх адміністрацыйна-камунікацыйных цэнтраў не мянае аснаўное агульнае тэндэнцыі паваеннага разьвіцьця местаў Беларускае ССР: павольнага тэмпа іх росту калі прыраўнаць яго да сярэдняга тэмпа росту местаў у іншых рэспубліках СССР. Часткова павольны тэмп росту местаў Беларусі — вынік вялікіх іх зьнішчэньняў у часе Другое Сусьветнае Вайны. Дый галоўная прычына — савецкая штучная дэпапуляцыя тэрыторыі рэспублікі масавымі дэпартацыямі й высяленьнямі.

ЛІЧБЫ НАТУРАЛЬНАГА РУХУ ЖЫХАРСТВА

Разам зь некаторымі агульнымі дадзенымі перапісу 1959 году ЦСУ апублікавала й сярэднія лічбы натуральнага руху жыхарства для ўсяго СССР на час перапісу. Ніякіх, нажаль, публікацыяў такіх-жа лічбаў па рэспубліках ЦСУ не дала, дзеля гэтага няма іх і для Беларускае ССР. Не падаюць ніякіх сучасных лічбаў натуральнага руху жыхарства на тэрыторыі Беларускае ССР і менскія паваенныя статыстычныя публікацыі,[47] як не падавалі іх і ў міжваенную пару ад 1928 году. Пададзеныя ЦСУ сярэднія лічбы натуральнага руху жыхарства для ўсяго СССР на час перапісу гэткія: на 1000 жыхароў больш 25 нараджэньняў у год і 7,5 памерлых, што дае лічбу натуральнага гадавога прыросту 17,5 на 1000. Пры сталых масавых вывазах рэпрадукцыйна найбольш вартаснага жыхарства, трэба дапускаць, што ў Беларускай ССР лічбы нараджэньняў, а разам і лічбы натуральнага прыросту істотна ніжэйшыя за сярэднія ўсяго СССР, а лічбы сьмяротнасьці вышэйшыя. Калі-ж яны аказаліся-б і прыблізна тае-ж вышыні, дык трэба адцеміць вялікі спад лічбы нараджэньняў, якая й на пачатку гэтага стагодзьдзя, і ў першую дэкаду міжваеннае пары на тэрыторыі ўсяе Беларусі трымалася каля 40 на 1000 у год.

ЦСУ, прыводзячы лічбы натуральнага руху, між іншым, піша: «у паваенныя гады былі рэалізаваныя меры па далейшым павялічэньні матар'яльнай помачы цяжарным жанчынам, шматдзетным і адзінокім маткам, заахвочваньню да шматдзетнасьці, узмацьненьню аховы мацярынства й дзяцей, разьвіцьцю аховы здароўя й узмацненьню мэдыцынскай помачы жыхарству. Гэтыя мерапрыемствы й нясупынны рост дабрабыту савецкага на-

[47] Прыкладам: Народное хозяйство Белорусской СССР за 40 лет.

роду забясьпечылі высокую нараджальнасьць . . .».[48] Наўсуперак гэтаму вось цьверджаньню ЦСУ, у Беларускай ССР, як і ўва ўсім СССР, сучасная лічба нараджэньняў сьветчыць не аб яе вышыні, а аб вялікім спадзе, спадзе з 40 да 25 на тысячу, ці на 37,5% ад сярэдняе для тэрыторыі ў спакойныя гады першых трох дэкадаў XX стагодзьдзя. У савецкай палітычнай сыстэме, дзе публікуецца блізу вылучна толькі тое, што выдаецца дадатнім з гледзішча партыйнае камуністычнае прапаганды, яўны яскравы спад лічбы нараджальнасьці у СССР быў аднэй з прычынаў непублікаваньня доўгі час ніякіх лічбаў натуральнага руху жыхарства наагул. Толькі ў паваенную пару, калі адначасны значны спад сьмяротнасьці ізноў істотна павысіў лічбу натуральнага прыросту, ад 1950 году ЦСУ ўжо пачало публікаваць лічбы натуральнага руху жыхарства, але ізноў толькі сярэднія для ўсяго СССР, а не для паасобных рэспублікаў, каб не выяўляць дэтальней сваіх плянавых дэмаграфічных мерапрыемстваў па паасобных нацыянальных рэспубліках, накіраваных, як правіла, на лічбовае паслабленьне жыхарства нацыянальнасьці нерасейскай, а павялічэньне ліку жыхарства расейскага.

З пачаткам публікацыі лічбаў натуральнага руху ў гадавікох ЦСУ, ад 1956 году, перад савецкімі дэмаграфамі паўстала нялёгкае заданьне высьніць дый з гледзішча марксізму ўматываваць факт сталага вялікага спаду нараджальнасьці ў «сацыялістычным грамадстве». Г. М. Максімаў высокія лічбы нараджальнасьці ў дасавецкую пару паясьняе «шырокім тарнаваньнем працы дзяцей і падросткаў у дробнатаварнай сялянскай гаспадарцы» дый тым, што «пры перадзелах прыдатнае да карыстаньня сялянскае зямлі быў браны на ўвагу лік ядуноў», і дзеля гэтага існавала «імкненьне сялянства да павялічаньня свае сям'і».[49] Дык цьверджаньне Максімава прызнае, што ў савецкім ладзе спад нараджальнасьці паясьняецца эканамічнай незацікаўленасьцяй сялянства ў дзецях і вялікай сям'і. Калі ходзе пра тэрыторыю Беларускае ССР, тут прыпушчэньне Максімава не адказвае запраўднасьці натолькі, што ў Беларусі ніколі ня існавала абшчыннае карыстаньне сялянскаю зямлёю дый не праводзілася ніякіх перадзелаў зямлі ані па ядунох, ані па ліку працуючых. Абшчынны лад, гэта чыста расейская форма землякарыстаньня, чужая для сялянства беларускае тэрыторыі. Тлумачэньне Максімава недастатковае яшчэ й дзеля гэтага, што спад нараджальнасьці ў СССР зазначыўся ня толькі сярод сялянскага жыхарства, але й сярод жыхарства меставога. Больш правільнае ягонае агульнае фармуляваньне прычынаў спаду лічбы нараджальнасьці словамі, што «Прынцыпы гэтага крыюцца ў сацыяльна-эканамічных умовах жыцьця краіны», а таксама ў «вялізарных перамяшчэньнях жыхарства». Дый усё гэта Максімаў тарнуе толькі да факту «крыху зьніжанае нараджальнасьці» пары г. зв. савецкае «рэканструкцыі 1930-х гадоў». Максімаў пару разоў падчырквае, што зьніжэньне гэтае было «часовым», «абумоўленым спэцыфічнымі абставінамі рэарганізацыйнага пэрыяду», а пра далейшы спад нараджальнасьці й у паваенную пару наагул нічога не ўспамінае, быццам яно ня існавала. Гавора ён, наадварот, аб «стабілізацыі» нараджальнасьці.[50]

Накш намагаецца падыйсьці да пытаньня, а навет яго прааналізаваць

[48] «Правда», «Известия», 10. 5. 1959.

[49] Г. М. Максимов — Движение и состав населения СССР. «История СССР», № 1, Академия Наук СССР. Институт Истории. Москва, 1961, б. 33.

[50] Тамсама, б. 34.

А. А. Дольская.[51] Найперш яна не хавае яўнага факту сталага спаду нараджальнасьці ў СССР. Паменшыць затое ягоную вагу Дольская стараецца цьверджаньнем, што «Сацыялістычнае грамадзтва змагаецца не за высокі ўзровень нараджальнасьці . . .».[52] Аналізуючы прычыны сталага спаду лічбы нараджальнасьці ў СССР, Дольская пералічае гэткія: 1) значнае працэнтнае зьніжэньне ліку сялянскага жыхарства СССР у вагульным ліку жыхарства краіны; 2) зьнішчэньне абшчыннае перадзельна-выраўноўваючай сыстэмы сялянскага землякарыстаньня дый пераход на калгасныя «працадні»; 3) памяншэньне ліку сужэнстваў і скарачэньне даўжыні рэпрадукцыйнага іх часу забаронаю раньніх, да 18 гадоў, сужэнстваў; 4) памяншэньне ліку сужэнстваў дзеля вялікіх ваенных стратаў жыхарства ў некаторых катэгорыях веку; 5) памяншэньне ліку сужэнстваў дзеля вялікіх ваенных стратаў мужчынаў і лічбовае непрапарцыянальнасьці жыхарства на полу; 6) вялізарныя перамены ў эканоміцы ў выніку індустрыялізацыі й калектывізацыі; 7) масавыя перамяшчэньні жыхарства, «часовы разрыў сямейнае лучнасьці»; 8) зьмены характару жаночае працы з хатняе на працу ў адлучэньні ад сям'і; 9) недастаткі ў жыльлі, грамадзкім харчаваньні, дзіцячых дый іншых грамадзкіх уладжаньнях; 10) рэзкі спад сьмяротнасьці дзяцей і ў выніку задаваленьне патрэбы сям'і ў дзецях; 11) распадзел грамадзкіх даброт паводля працы, а не па патрэбе; 12) рост дабрабыту некаторых слаёў жыхарства, у выніку чаго адпадае патрэба ў дзецях, як у работніках і карміцелях на старасьць; 13) «павышэньне культуры й вызваленьне часьці жыхарства ад існуючага яшчэ ўплыву рэлігійных догмаў, што забараняюць нутрасямейную рэгуляцыю цяжарнасьці й радоў».[53]

Пералік Дольскаю прычынаў, дзеля чаго ў савецкім «сацыялістычным грамадзтве» лічба нараджэньняў рэзка спала й далей падае, хоць і ня поўны, але не малы, і ён паказвае на тое, што зьява гэтая не часовая й прыпадковая, а сталая прыкмета савецкага ладу, — гэта адзін з «сацыялістычных законаў народанасяленьня».

Сярод пералічаных прычынаў спаду нараджальнасьці ў СССР, Дольская, як і іншыя савецкія дэмографы, не падае аднае вельмі важнае й характэрнае для пары Сталінскае дыктатуры: масавага палітычнага тэрору й дэпартацыяў у канцэнтрацыйныя лягеры. Толькі мо' укосна Дольская намякае пра гэта ў сваей фразе пра «часовы разрыў сямейнае лучнасьці».[54] Куды выразьней пра гэта гавора ўжо Максімаў: «заўзяты супраціў клясавых ворагаў, і асабліва кулацтва, — усё гэта . . . прывяло да зьніжэньня нараджальнасьці».[55]

У наяўнасьці факту вялікага сталага спаду лічбы нараджальнасьці, савецкае партыйнае й дзяржаўнае кіраўніцтва рабіла ня мала захадаў, каб гэты непажаданы сабе працэс адвярнуць або, найменш, стрымаць. У 1936 годзе Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам і Саветам Народных Камісараў СССР была прынятая пастанова пра ўвядзеньне пакараньня як за крымінальны праступак за выкананьне аборту без адпаведных лекарскіх па-

---

[51] А. А. Дольская. Социалистический закон народонаселения. Москва, 1959.
[52] Тамсама, б. 127.
[53] Тамсама, б. 130.
[54] Тамсама, б. 125.
[55] Г. М. Максимов — Движение и состав населения СССР, б. 34.

казаньняў. Вынік гэтае пастановы аказаўся невялікім. У 1935 годзе нараджальнасьць у СССР была 30,1, у 1940 годзе — 31,7 на 1000 жыхароў.[56] Калі ў паваенную пару адбываўся далейшы спад нараджальнасьці, указам прэзыдыюму вярхоўнага савету СССР з 23 лістапада 1955 г. забарона абортаў была ізноў скасаваная, дый ізноў бязь ніякага паважнейшага ўплыву на самую лічбу нараджальнасьці ў СССР, паказваючы савецкаму кіраўніцтву яўны факт, што працэс сталага спаду нараджальнасьці ў «сацыялістычным грамадзтве» не паддаецца рэгуляцыі ані дзяржаўнымі, ані партыйнымі «ўказамі».

Засталіся бяз вынікаў і іншыя мерапрыемствы савецкае ўлады, накіраваныя на стымуляцыю павышэньня нараджальнасьці, як абкладаньне падаткам сужэнстваў бязьдзетных ад 20-га году іх веку, прэміі шматдзетным маткам за кажнае новароджанае дзіцё, пачынаючы ад трэйцяга, дый штомесячныя дзяржаўныя дапамогі, пачынаючы ад кажнага чацьвертага дзіцяці. Адначасна шматдзетным маткам былі ўстаноўленыя ганаровыя дыплёмы «Маці-гераіні», ордэны «Мацярынская слава» і «Мэдалі мацярынства». Таксама было забаронена ня прыймаць жанчынаў на працу дзеля іх цяжарнасьці, ці зьніжаць ім дзеля гэтага заработную плату. Працуючым-жа цяжарным даваліся платныя звальненьні з працы на час радоў дый у перадрадавы пэрыяд цяжарнасьці. Для кормячых матак былі ўстаноўленыя перапынкі ў працы для кармленьня іх дзяцей.

На патрэбу павышэньня нараджальнасьці налягала ўвесь час і партыйная прапаганда. Хрушчоў на нарадзе камсамольцаў і моладзі зьвярнуўся ў гэтай справе з канкрэтным заклікам: «Калі кажная сям'я будзе абмяжоўвацца адным-двумя дзяцьмі, тады жыхарства нашай краіны пойдзе на ўбытак... Дзеля гэтага трэба мець у сям'і хоць-бы трое дзяцей...»[57] Дый, як факты статыстыкі паказалі, нягледзячы на ўсе захады й мерапрыемствы, і наўсуперак агітацыі і заклікаў самых высокіх партыйных кіраўнікоў, нараджальнасьці ў СССР, як дагэтуль, не ўдалося ані павысіць, ані навет стрымаць яе далейшага спаду. Камуністычнае кіраўніцтва імпэрыі ў канцы, відаць, пераканалася, што лічба нараджальнасьці не паддаецца агітацыі, прапагандзе, ані партыйным ці дзяржаўным заклікам. У выніку ўсяго, у сярэдзіне 1950-х гадоў былі дазволеныя публікацыі лічбаў натуральнага руху жыхарства СССР з паказаньнем нізкіх лічбаў нараджэньня, а савецкія дэмографы, як А. А. Дольская, ужо ў 1959 годзе прабавалі аналізаваць і прычыны спаду нараджальнасьці, дамагаючыся «ацэны гэтага факту з гледзішча заданьняў савецкага грамадзтва».[58] Дык, хоцькі-няхоцькі, факт спаду лічбы нараджэньняў у СССР і савецкім дэмографам даводзіцца прызнаць за адну з «аснаўных законамернасьцяў разьвіцьця народанасяленьня СССР» паводля тэрміналёгіі Максімава, ці ўвесьці ў свой «сацыялістычны закон народанасяленьня» паводля азначэньня Дольскай.

У выніку вялікага спаду нараджальнасьці у СССР панізілася істотна й гадавая лічба натуральнага прыросту. Калі пададзеная ЦСУ на час перапісу лічба 17,5 на тысячу тарнуецца й для Беларускае ССР, дык тут яна ніжэйшая на 2,5 ад тыповае сярэдняе для тэрыторыі ў спакойныя неваенныя гады ў першыя тры дэкады XX стагодзьдзя. Пры праводжаньні сталых

[56] А. А. Дольская — Социалистический закон народонаселения, б. 126.
[57] Тамсама, б. 129.
[58] Тамсама, б. 132.

масавых перасяленьняў з тэрыторыі рэспублікі кантынгэнтаў жыхарства найперш маладога й рэпрадукцыйна найбольш актыўнага, трэба лічыцца з магчымасьцяй значна ніжэйшае лічбы натуральнага прыросту ў рэспубліцы за сярэднюю для ўсяго СССР.

Адцеміць затое трэба нізкую сярэднюю для СССР лічбу сьмяротнасьці — 7,5 на 1000 у часе перапісу. Нізкая лічба сьмяротнасьці дае рэлятыўна высокую лічбу натуральнага прыросту жыхарства СССР, нягледзячы на вялікі спад нараджальнасьці. Калі гэтая лічба адказвае запраўднасьці, дык у яе нізкой вышыні адбіваецца ня толькі поступ у галіне аховы здароў'я й лячэньня на прасторы паваеннага СССР, спыненьне масавага тэрору, некаторае палепшаньне ўмоваў быту, але й той факт, што ў мінулыя цяжкія гады Сталінскае дыктатуры, сталых эканамічных нястачаў дый ваенных нягодаў вялікія масы старых і фізычна слабейшых вымерлі, выжылі больш вытрывалыя фізычна, здаравейшыя. Гэта й адбіваецца цяпер у часова нізкіх паваенных лічбах сьмяротнасьці ў СССР. На гэта, як на прычыну сучаснае нізкое сьмяротнасьці ў СССР, паказваюць і дэмаграфы захаду,[59] хоць дэмаграфы савецкія, бясспрэчна важны для разьвіцьця жыхарства СССР масавы тэрор Сталінскае пары, адмаўляюцца браць на ўвагу як дэмаграфічны фактар наагул.[60]

Непублікаваньне савецкімі афіцыйнымі дзейнікамі ніякіх лічбаў натуральнага руху жыхарства па рэспубліках, ані адначасна з публікацыяй дадзеных перапісу, ані паза імі, у гадавіках ЦСУ ці ў адпаведных рэспубліканскіх статыстычных выданьнях, паказвае на яўную намеранасьць гэтага. Наяўнасьць лічбаў натуральнага руху жыхарства па рэспубліках пазваляла-б дакладней аблічыць у іх лічбовыя памеры ўсіх масавых дэпартацыяў і прымусовых перасяленьняў жыхарства, падобных тым, якія апошнімі гадамі стала праводзіцца з тэрыторыі Беларускае ССР. Гэта давала-б аснову для лепшае лічбовае ар'ентацыі ў плянах і намерах, якімі кіруецца Масква пры перамяшчаньні людзкіх масаў імпэрыі шляхам прымусовае міграцыі. Гэта-ж, ізноў-жа, яўна зусім не ляжыць у інтарэсе сучасных кіраўнікоў расейскага савецкага рэжыму імпэрыі й дзеля гэтага яны факты гэтыя намагаюцца скрыць і перад вокам сьвету, і перад жыхарамі імпэрыі, дый асабліва — перад самымі нерасейскімі народамі СССР.

ПАДЗЕЛ ЖЫХАРСТВА ПАВОДЛЯ ПОЛУ Й ГРУПАЎ ВЕКУ

І ў галіне падзелу жыхарства паводля полу дый групаў веку публікацыі ЦСУ вынікаў усесаюзнага перапісу 1959 году, як дагэтуль, таксама не падаюць ніякіх лічбаў па паасобных рэспубліках, а толькі сярэднія для ўсяго СССР.

Паводля ЦСУ, на тэрыторыі СССР перапіс на пачатку 1959 году выявіў 55% жанчынаў і 45% мужчынаў. У 1939 годзе прапорцыя гэтая выяўлялася лічбамі: жанчынаў 52%, мужчынаў 48%. Як паясьняе ЦСУ, дыспрапорцыя лічбаў жыхарства паводля полу паўстала ў выніку вялікае розьніцы ў лічбах мужчынаў і жанчынаў у групах веку вышэйшых за 32 гады.

---

[59] Erik Boettcher. Die Sowjetische Wirtschaftspolitik am Scheidewege. Tübingen, 1959, b. 26.

[60] Г. М. Максимов — Движение и состав населения СССР, б. 29.

У групах маладзейшага веку лічбовы расклад жыхарства паводля полу прыблізна роўны, зь невялікаю праваагаю мужчынаў над жанчынамі, праваагаю агульнае вышыні 240 000.[61] У другой сваей публікацыі, пад параграфам 10-м ЦСУ падае дадзеныя прапарцыянальнага ліку мужчынаў і жанчынаў паводля паасобных групаў веку для ўсяго СССР у ліках на 1000 жыхароў.[62] Лікі гэтыя пададзеныя ў таб. 12.

Табл. 12: Лік жанчынаў і мужчынаў на 1000 жыхароў па групах веку ўва ўсім СССР паводля стану на 15 студзеня 1959 г.

Групы веку	Роджаныя ў гадох	На 1000 жыхароў прыпадае Мужчынаў	Жанчынаў
0 — 9 год	1958 — 1949	509	491
10 — 19 „	1948 — 1939	505	495
20 — 24 „	1938 — 1934	494	506
25 — 29 „	1933 — 1929	490	510
30 — 34 „	1928 — 1924	453	547
35 — 39 „	1923 — 1919	391	609
40 — 44 „	1918 — 1914	384	616
45 — 49 „	1913 — 1909	384	616
50 — 54 „	1908 — 1904	384	616
55 — 59 „	1903 — 1899	334	666
60 — 69 „	1898 — 1889	349	651
70 і старэйшыя	1888 —	319	681
Усяго		450	550
У гэтым ліку ў веку:			
0 — 31 год		501	499
32 год і старэйшыя		375	625

За прычыну вялікае дыспрапорцыі ў лічбах мужчынаў і жанчынаў веку старшага за 32 гады ЦСУ падае войны, а галоўна апошнюю сусьветную вайну. Гэтае паясьненьне, аднак-жа, не раскрывае ўсяе праўды. Другім і вельмі важным фактарам спрычыніўшым дыспрапорцыю быў тэрор савецкага рэжыму ў пару Сталінскае дыктатуры. Масавыя прасьледы, фізычныя нішчэньні «ворагаў народу», «кулакоў», «буржуазных нацыяналістых», масавыя дэпартацыі й ссылкі іх у канцэнтрацыйныя лягеры на фізычнае зьнішчэньне, — заўсёды больш тарнаваліся да мужчынаў, як жанчынаў, хоць агульна ведама, што палітычнаму прасьледу й дэпартацыям ня раз падлягалі й цэлыя сем'і, разам зь цяжарнымі жанчынамі, старымі, дзецьмі дый сысункамі. Пацьвярджае факт палітычнага тэрору як фактару спрычыніўшага павышэньне дыспрапорцыі лічбаў паводля полу, й наступнае: гадавік ЦСУ на 1959 год падае, што паводля перапісу 1926 году мужчынаў у СССР тады было 48%, жанчынаў 52%. Дыспрапорцыю гэтую можна паясьняць стратамі Першае Сусьветнае Вайны дый вайны грамадзянскае. Як, аднак-жа, той-жа гадавік там-жа падае,[63] і перапіс 1939 году выказаў дакладна тую-ж дыспрапорцыю — 48% мужчынаў, 52% жанчынаў. Нармальна за 12 міжперапісных неваенных гадоў, у часе 1927-1938, трэба было-б спадзявацца ўжо істотнага выраўнаньня дыспрапорцыі. Калі-ж яно не на-

[61] Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 12.
[62] «Правда» і «Известия», 4. 2. 1960. Таксама ў: Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 12.
[63] Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 12.

ступіла, гэта сьветчыць, што ў міжперапісныя гады мусіла існаваць нейкая прычына значна вышэйшае сьмяротнасьці мужчынаў за жанчынаў. Прычыну гэтую дае нам гісторыя: Сталінскі тэрор 1930-х гадоў.

З гэтага-ж гледзішча цікава зьвярнуць увагу й на катэгорыю веку 55-59 гадоў, катэгорыю, якая выказвае асабліва нізкую лічбу мужчынаў: усяго 334 на 666 жанчынаў, што практычна значыць, што ў гэтай групе веку на дзьве жанчыны выжыў толькі адзін мужчына. Як табл. 12 паказвае, асобы гэтай групы радзіліся ў гадох 1903-1899. З пачаткам Першае Сусьветнае Вайны мужчыны ў гэтых гадох дайшлі да веку 11-15 год., а зь яе канцом да веку 15-17 год, значыцца былі яшчэ ў веку немабілізацыйным, і дзеля гэтага Першая Сусьветная Вайна не магла адбіцца на нізкім ліку мужчынаў гэтых гадавікоў. Крыху пацярпець яны маглі ўжо затое пазьней ад рэвалюцыі, грамадзянскае вайны дый вызвольных змаганьняў народаў імпэрыі. Пры пачатку Другое Сусьветнае Вайны гадавікі гэтае групы веку мелі ўжо 35-40 год, значыцца былі ў мабілізацыйным веку, хоць і не належылі да катэгорыі, у якой можна было-б спадзявацца найбольшых стратаў. Паколькі мужчыны гэтых гадавікоў маглі браць удзел толькі ў ваднэй, — Другой, — сусьветнай вайне, дык лягічна й ваенныя страты сярод іх павінны быць ніжэйшыя за страты гадавікоў крыху старэйшых, якія маглі быць удзельнікамі абедзьвюх сусьветных войнаў. Дык найвышэйшыя страты сярод гэтых якраз гадавікоў ваеннымі прычынамі не даюцца высьніць. Будуць аднак-жа яны зразумелымі, калі зьвернем увагу на факт, што гэтая акурат група веку перажыла сваю сталасьць у гады самага жорсткага Сталінскага тэрору 1930-х гадоў.

Калі, дзеля адсутнасьці адпаведных лічбаў для Беларускае ССР, дапусьціць, што прапорцыя мужчынаў і жанчынаў сярод жыхарства рэспублікі сяньня прыблізна такая самая, як і ўва ўсім СССР, тады кругла 8 мільёнаў сучаснага жыхарства Беларускае ССР складалася-б з 3 600 000 мужчынаў і 4 400 000 жанчынаў. Практычна гэта значыла-б, што на кажных 11 жанчынаў прыпадала-б толькі 9 мужчынаў. Дый у запраўднасьці на тэрыторыі Беларускае ССР трэба лічыцца з значна большаю дыспрапорцыяй полаў. На гэта існуе колькі паважных прычынаў. Папершае, у адваротнасьці некаторым іншым рэспублікам СССР, тэрыторыя Беларускае ССР была ўся гадамі ахопленая **беспасярэднімі** дзеяньнямі Другое Сусьветнае Вайны й дзеля гэтага дазнала асабліва вялікіх стратаў жыхарства, і, у першую чаргу, стратаў сярод мужчынаў. Падругое, савецкі тэрор забіраў тут значна больш ахвяраў, як прыкладам у Расеі, бо расейска-бальшавіцкі рэжым у Беларусі ня толькі змагаўся з «ворагамі народу» пад палітычнымі ці сацыяльнымі лёзунгамі, але й у роўніцы нацыянальнай. Колькі разоў на тэрыторыі рэспублікі праводзіліся масавыя арышты й дэпартацыі за «нацыянальныя ўхілы» — за «нацыянал-дэмакратызм», за «буржуазны нацыяналізм». Гэтакія прасьледы беларускага нацыянальнага элемэнту ў беларускай-жа рэспубліцы асабліва масава праводзіліся ў гадох 1930, 1933, 1936-37, 1940-41 (у Заходняй Беларусі), у паваенныя гады. Масавых дэпартацыяў дзеля гэтых прычынаў тэрыторыя Расеі ніколі ня мела, там за нейкі расейскі «нацыяналізм» ніякіх рэпрэсіяў расейскі камуністычны рэжым не праводзіў. Патрэйцяе, — як выяўляе й перапіс 1959 году, дэпартацыі й перасяленьні жыхарства з тэрыторыі Беларускае ССР былі найбольшыя, асабліва ў паваенную пару, а яны таксама краналі

лічбова больш мужчынаў, як жанчынаў. Тое самае трэба сказаць і аб палітычных уцекачох. Сярод беларускае эміграцыі лічбова мужчыны пераважаюць значна лік жанчынаў. Вось усе вышэй пералічаныя факты прамаўляюць за тым, што на тэрыторыі Беларускае ССР трэба лічыцца з фактам значна вышэйшае дыспрапорцыі полаў, як гэта ёсьць у сярэднім на прасторы ўсяго СССР.

Беспасярэднім вынікам значнае лічбовае дыспрапорцыі полаў ёсьць і дыспрапорцыя лічбаў сужэнства мужчынаў і жанчынаў. Паводля ЦСУ, перапіс выказаў, што на пачатку 1959 году на прасторы СССР прыпадала ў год 12 сужэнстваў на 1000 жыхароў.[64] Аднак-жа на 1000 мужчынаў старэйшых за 16 год, у 1959 годзе ў сужэнстве было 695, калі на 1000 жанчынаў у тымсамым часе й веку ў сужэнстве было ўсяго 522.[65] Істотна будзе тут адцеміць, што падобная дыспрапорцыя паводля полу ў лічбах сужэнстваў выступала яскрава й перад выбухам Другое Сусьветнае Вайны, ужо ў 1939 годзе, калі на 1000 мужчынаў у сужэнстве было блізу столькі-ж, што й цяпер, бо 690, а тымчасам на 1000 жанчынаў было ў сужэнстве тады толькі 605, ці менш на 85 за мужчынаў.[66] І гэты факт паказвае на тое, што важным фактарам у сучаснай вялікай лічбовай дыспрапорцыі паводля полу жыхарства СССР былі ня толькі войны, але й доўгатрывалы масавы савецкі тэрор Сталінскае пары.

ЗЬМЕНЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СКЛАДУ ЖЫХАРСТВА БЕЛАРУСКАЕ ССР

Склад па нацыянальнасьці жыхарства СССР і паасобных яго рэспублікаў, паводля стану ў часе ўсесаюзнага перапісу 15 студзеня 1959 году, першы раз быў апублікаваны ЦСУ 4 лютага 1960 году.[67] У гадавіку ЦСУ на 1959 год лічбы нацыянальнага складу пададзеныя таксама, дый зь некаторымі зьменамі ў іх вялічыні, праўдападобна ўдакладненьнямі. Паводля дадзеных гадавіка ЦСУ, нацыянальны склад жыхарства Беларускае ССР у часе перапісу 1959 году выглядаў так, як паказана на таб. 13.[68]

Табл. 13: Нацыянальны склад жыхарства Беларускае ССР паводля перапісу 15 студзеня 1959 году

Нацыянальнасьць	Лік у тысячах	У % усяго жыхарства
Беларусы	6 532	81,1
Расейцы	659	8,2
Палякі	539	6,7
Жыды	150	1,9
Украінцы	133	1,7
Іншыя	42	0,5
Усяго	**8 055**	**100,0**

[64] «Правда» і «Известия», 10. 5. 1959.
[65] «Правда» і «Известия», 4. 2. 1960.
[66] Тамсама.
[67] Тамсама.
[68] Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 17.

У публікацыях ЦСУ апошняе групы — «Іншыя» — не падаецца. Паколькі, аднак-жа, сума лічбаў для пяці пералічаных ЦСУ нацыянальнасьцяў становіць 8 013 000, з гэтага вынікае, што на дробныя нацыянальныя групы павінна прыпадаць 42 000, што, ізноў-жа, становіць ня 0,4% усяго жыхарства рэспублікі, як выпадала-б з сумы працэнтных лічбаў ЦСУ для іншых, пералічаных, нацыянальнасьцяў, а 0,5%. Розьніца паўстае дзеля таго, што працэнтныя лічбы ЦСУ не дакладныя, а закругленыя да дзесятых. Новыя перапісныя — працэнтныя й абсалютныя — лікі нацыянальнага складу жыхарства Беларускае ССР, калі прыраўнаць іх да падобных лікаў пары міжваеннае й ранейшых, у некаторых нацыянальных групах выяўляюць вялікія зьмены.

I. Беларусы

Апублікаваныя ЦСУ дадзеныя перапісу 15 студзеня 1959 году падаюць Беларусаў на тэрыторыі свае Беларускае ССР 6 532 000, ці 81,1% усяго жыхарства.[69] Для часу 20 год раней, для пачатку 1939 году, нейкіх дакладных **перапісных** лічбаў ліку Беларусаў для ўсей сучаснай тэрыторыі рэспублікі ня існуе, паколькі польская перапісная статыстыка па нацыянальнасьці на прасторы Заходняе Беларусі, нагінаная для польскіх мэтаў палітычных, калі ходзіць аб Беларусаў, не адказвала фактычнаму стану на толькі, што з дадзенымі яе ня лічыліся паважна й польскія дасьледнікі.[70] Існуюць затое дакладныя статыстычныя лікі па нацыянальнасьці для тэрыторыі даваеннае Беларускае ССР з часу першага ўсесаюзнага савецкага перапісу 17 сьнежня 1926 году. Перапіс гэты выказаў на тэрыторыі тагачаснае рэспублікі 80,6% Беларусаў. Калі прыраўнаць гэтую лічбу да выказанае сучасным перапісам 81,1%, дык можна бачыць, што на працягу мінулых трох дзесяцігодзьдзяў працэнтна Беларусы захавалі сваю пазыцыю, а навет быццам яе крыху й узмоцнілі, нягледзячы на масавыя савецкія дэпартацыі. Павялічэньне гэтае, аднак-жа, ня трэба прыпісваць нейкаму большаму натуральнаму прыросту сярод жыхароў рэспублікі Беларусаў, хоць і яно магло быць. Паўстала яно галоўна дзеля вялікага працэнтнага абніжэньня жыхарства рэспублікі некаторых іншых нацыянальнасьцяў, прыкладам Жыдоў.

Дык у гадох 1959 і 1926 працэнтны лік Беларусаў у рэспубліцы трымаўся на той самай вышыні, каля 80%. Паводля савецкае афіцыйнае ацэны, і на заходніх частках тэрыторыі рэспублікі, былых землях Заходняе Беларусі, пасьле іх улучэньня ў БССР, «Беларусы складалі больш 80% жыхарства».[71] Бяручы гэта на ўвагу, можна прыняць працэнтную лічбу 80 за выходную для абазначэньня прыблізнага ліку Беларусаў на ўсей сучаснай тэрыторыі рэспублікі, але паводля стану на пачатку 1939 году. Паколькі, як раней падавалася, агульны лік жыхарства сучаснае тэрыторыі Беларускае ССР на пачатку 1939 году аблічэньнем быў азначаны на 9 344 000, дык Беларусаў між імі, пры 80%, павінна было на той час быць

---

[69] Тамсама.

[70] K. Srokowski. Sprawa narodowościowa na Kresach Wschodnich. Warszawa, 1925. St. Paprocki. Minority affairs in Poland. Warszawa, 1935. Яго-ж: Poland und das Minderheitenproblem. Warszawa, 1935, б. 100—101.

[71] БСЭ, т. 4. 1950, б. 476.

прыблізна 7 475 000. Блізу дакладна такую-ж лічбу на той-жа час, бо 7 466 000, падае й дэмограф П. Міраненка.[72]

З прыраўнаньня лічбаў жыхарства беларускае нацыянальнасьці рэспублікі ў 1939 годзе 7 475 000, а ў 1959 годзе 6 532 000, бачым, што недалік за 20 міжперапісных гадоў жыхароў Беларускае ССР беларускае нацыянальнасьці выносіць высокую лічбу **943 000.** Дык, хоць працэнтна Беларусы на тэрыторыі рэспублікі й захавалі прыблізна свой стан, дык у вабсалютных ліках за міжперапісны пэрыяд яны згубілі 12,6% свайго ліку пачатку 1939 году. Трэба яшчэ мець наўвеце, што апрача страчаных 943 000 Беларусаў рэспублікі, быў страчаны разам і ўвесь дваццацігодні прырост беларускае нацыянальна часьці жыхарства. Калі гаварыць аб агульным ліку Беларусаў у СССР, дык трэба мець наўвеце, што значны лік Беларусаў знайходзіцца й паза тэрыторыяй Беларускае ССР, а таксама, што за межамі тае-ж рэспублікі апынуліся й вялікія абшары беларускае этнічнае тэрыторыі.

2. Расейцы

Расейская нацыянальная меншыня на тэрыторыі сучаснае Беларускае рэспублікі рэлятыўна нядаўнага паходжаньня, у кажным выпадку яна тут значна пазьнейшая за меншыню жыдоўскую й польскую, бо Расейцы першы раз у паважнейшым ліку на тэрыторыі паявіліся толькі каля пачатку XVIII ст., калі з Маскоўшчыны, ад рэлігійнага тамака прасьледу, у Вялікае Княства Літоўскае ўцякала тысячы раскольнікаў. На беларускіх землях раскольнікі знайшлі сабе супакой, прытулак, умовы да існаваньня й эканамічнага разьвіцьця, а галоўна — рэлігійную й нацыянальную свабоду. Народ празваў іх тут старaверамі. Стараверскія рэлігійныя грамады ў Беларусі праіснавалі да пачатку XX стагодзьдзя, а на заходніх яе частках — аж да Другое Сусьветнае вайны. У часе перапісу 1897 году на беларускай тэрыторыі жыло 26 647 старавераў, бальшыня з чаго, бо 20 123 чалавек, знайходзілася ў Віцебскай губэрні, 2 878 было ў Магілеўскай, а 1548 у Віленскай.

Ад канца XVIII ст., посьле распадзелу Рэчыпаспалітае й далучэньня тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага да Расейскае імпэрыі, пачынаецца сталы наплыў на тэрыторыю Беларусі жыхарства расейскае нацыянальнасьці, галоўна ў характары імпэр'яльнага адміністрацыйнага чынавецтва, а ў меншым ліку, у ролі ўладальнікаў большае зямельнае маемасьці, прыдзялянае ім царскаю ўладаю з ранейшых дзяржаўных маёнткаў, ці зь земляў сканфіскаваных ад мясцовых земляўласьнікаў за іхнае варожае да Масквы настаўленьне. Гэткая практыка асабліва шырака тарнавалася посьле супроцьрасейскіх паўстаньняў 1831 й 1863 гадоў. Царскаю ўладаю робяцца спробы пасяленьня на тэрыторыі Беларусі й расейскіх сялян-каляністых, але вынікі гэтае акцыі аказаліся ніякія.

Нягледзячы на ўсе натугі расейскага царскага рэжыму ў кірунку калянізацыі расейскім жыхарствам тэрыторыі Беларусі, а таксама русыфікацыі мясцовага жыхарства беларускага, намаганьні гэтыя заставаліся бязь

---

[72] Ю. П. Мироненко. Национальный состав населения СССР по данным советской статистики. «Вестник Института по изучению СССР», № 2, Мюнхен, 1958, б. 47.

нейкіх паважнейшых вынікаў. Насланы расейскі элемэнт або беларушчыўся ў вакружаючай беларускай народнай стыхіі, або проста адплываў з часам з тэрыторыі назад у Расею, дзеля таго, што чуўся чужа й няўтульна сярод адрознага сабе па псыхіцы, мове, звычаях і традыцыях, а ня раз і веры, жыхарства. З другога боку, зьведзеная расейскаю каляніяльнаю палітыкаю эканоміка краю да стану найбольш заняпалае ўва ўсей імпэрыі, ня суліла насланым і ніякіх пэрспэктываў лёгкага дасяганьня дабрабыту, ці хоць-бы бястурботнага самастойнага бытаваньня. Вось дзеля гэтых прычынаў, нягледзячы на ўсе спробы й намаганьні царскае Масквы, расейская нацыянальная мяншыня на тэрыторыі сучаснае Беларускае ССР аж да часу Першае сусьветнае вайны лічбова ўзрастала паволі, і па сваім агульным ліку знайходзілася на трэйцім месцы, пасьля мяншыні жыдоўскае дый польскае. У міжваенную пару на тэрыторыі тагачаснае БССР адбываецца далейшы ўзрост ліку жыхарства расейскае нацыянальнасьці. Перапіс 1926 году выказвае ў межах тагачаснае Беларускае рэспублікі 383 806 Расейцаў, ці 7,7% ўсяго жыхарства. На землях Заходняе Беларусі, пад Польшчаю, у тым-жа часе працэнт расейскага жыхарства быў значна меншы, усяго 2%, што на пачатак 1939 году для тэрыторыі, якая пазьней увайшла ў склад сучаснае Беларускае ССР, дае прыблізную лічбу 75 000.

Як перапіс 1939 году паказаў, жыхарства тагачаснае БССР у часе ад перапісу 1926 году павялічалася у сярэднім ўсяго на 1% у год. Калі гэтую рату росту прыняць за аснову, дык на тэрыторыі тагачаснае рэспублікі з 383 806 Расейцаў 1926 году, на пачатку 1939 году павінна ўжо быць ня менш 430 000. А гэтая лічба, разам з 75 000 Расейцаў далучанае пазьней тэрыторыі Заходняе Беларусі, для ўсяе сучаснае тэрыторыі рэспублікі, але на пачатак 1939 году, дае лічбу **505 000**, ці кругла поўмільёна, што ў працэнтах усяго жыхарства складае 5,4%. ЦСУ, публікуючы першы раз тымчасовыя вынікі перапісу 1959 году па нацыянальнасьці, падало лік Расейцаў на тэрыторыі Беларускае ССР як 729 000, ці 9,2% усяго жыхарства.[73] У гадавіку ЦСУ на 1959 год лік гэты, аднак-жа, зьніжаны на цэлых 70 000 да **659 000**, што становіць **8,2%** жыхарства рэспублікі. Праўдападобна гэта й ёсьць канчаткова ўдакладненая лічба жыхарства расейскае нацыянальнасьці на тэрыторыі Беларускае ССР.

Пры гэтай нагодзе варта адцеміць факт, што, як вынікае зь лічбаў нацыянальнасьці пададзеных у гадавіку ЦСУ, і прыраўнаньня іх да папярэдня публікаваных лічбаў тымчасовых вынікаў перапісу тымсамым ЦСУ, пры першай публікацыі блізу ўва ўсіх рэспубліках СССР расейская нацыянальная група падаецца ў значна вышшых лічбах, і коштам нацыянальнасьцяў нерасейскіх. Разам па ўсім СССР у тымчасовых выніках было пададзена Расейцаў больш ледзь не на поўмільёна, бо на 474 000, ад таго, што перапіс у запраўднасьці выявіў. І гэткая вялікая розьніца-памылка ўверх здарылася блізу вылучна з аднэй расейскай нацыянальнасьцяй. Лікі, прыкладам, Жыдоў ці Палякаў засталіся й у другой публікацыі ЦСУ, у гадавіку, дакладна тыя-ж самыя. Як гэта можна, пры тымчасовым навет аблічаньні вынікаў перапісу, дайсьці да сталае памылкі ўверх ліку аднае, пануючае ў імпэрыі, нацыянальнасьці, — лягічна выясьніць ня лёгка. Факт гэты застаецца адным з сакрэтаў савецкае перапіснае тэхнікі. Паколькі перапіс 1959 году ўстанавіў для тэрыторыі Беларускае ССР лічбу Расейцаў

[73] «Правда» і «Известия», 4. 2. 1960.

у вышыні 659 000, а, як мы бачылі з папярэдняга, на пачатку 1939 году на тэй-жа тэрыторыі было 505 000 Расейцаў, дык з супастаўленьня гэтых двух лічбаў вынікае, што ў часе, калі ўсё жыхарства рэспублікі выказвае дэфіцыт вышыні 1 279 000, ці 13,4%, расейская меншыня можа наадварот пахваліцца, значным павялічэньнем свайго лічбовага стану на 154 000, ці на 30% папярэдняга свайго ліку. Гэтае павялічэньне, зразумела, магло адбыцца толькі шляхам сталага насыланьня Масквою ў межы Беларускае ССР Расейцаў, галоўна ў ролі кіруючага палітычнага й адміністрацыйна-гаспадарчага каляніяльнага апарату рэспублікі. Дарогаю русыфікацыі мясцовага беларускага жыхарства павялічэньне гэтае не магло паўстаць, бо-ж 20 гадоў, менш як век аднаго пакаленьня, — замалы адрэзак часу на паважныя лічбовыя зьмены гэтым шляхам. Супроць гэтага сьветчыць і захаваны працэнтны стан беларускага жыхарства рэспублікі ў вышыні больш 80%.

З розных гледзішчаў вельмі важна высьніць, колькі за міжперапісныя гады гэтага расейскага жыхарства было ў межы рэспублікі накіравана. Калі лік жыхарства рэспублікі за 20 міжперапісных гадоў спаў на 13,4%, дык трэба дапусьціць, што й лік тых Расейцаў, што на пачатку 1939 году жылі на сучаснай тэрыторыі рэспублікі зь ліку 505 000, мусіў адпаведна зьнізіцца на 68 000, ці спасьці да лічбы 437 000 на пачатак 1959 году. Калі-ж заміж гэтага перапіс выказаў 659 000, ці на **222 000** больш, дык гэта й ёсьць тая нечаканая надвыжка Расейцаў, якая не даецца высьніць нармальным натуральным прыростам, ці, гэта й будзе лік нова насланага расейскага жыхарства на тэрыторыю рэспублікі ўлучна зь нейкаю доляю паўсталага ў гэтым часе натуральнага ад яго прыросту. Практычна, насыланьне ў межы рэспублікі расейскага элемэнту магло ў дадзеным адрэзку часу адбывацца блізу вылучна ад рэакупацыі тэрыторыі рэспублікі ад нямецкае арміі ўлетку 1944 году, да часу перапісу 1959 году, значыцца на працягу чатырнаццаці з паловаю гадоў. Рассійцаў, насыланых асабліва масава ў гадох 1939-1941 на новаакупаваныя землі былое Заходняе Беларусі можам практычна ня браць на ўвагу, паколькі пры нямецкім наступе ў пачатку савецка-нямецкае вайны ўсе насланыя ўцяклі з тэрыторыі. Калі цяпер падзелім 222 000 надвыжкі Расейцаў на час 14 з паловаю гадоў, дык атрымаем, што сярэдняя гадавая лічба іміграцыі расейскага жыхарства ў межы рэспублікі, разам з натуральным ад яго прыростам за гэты час, будзе ў гадавой вышыні 15 310, ці, у закругленьні, 15 000 чалавек. Гэта вельмі важная цыфра, бо гэта ня што іншае, як **сярэдні гадавы каафіцыент расейскае калянізацыі Беларускае рэспублікі ў гадох 1945-1958.**

Выяўленая перапісам надвыжка Расейцаў у межах рэспублікі ў вышыні 222 000 вельмі важная й зь іншага гледзішча, бо пазваляе нам удакладніць лічбу дэмаграфічнага дэфіцыту рэспублікі за 20 міжперапісных гадоў. Каб адзначыць гэты дэфіцыт, трэба ад выяўленага ліку жыхарства рэспублікі на час перапісу адняць лік імігрантаў, што ўехалі ў межы рэспублікі ў міжперапісным пэрыядзе. Паколькі іміграцыя складалася блізу вылучна з Расейцаў, дык выяўленая дэмаграфічная надвыжка ў расейскай нацыянальнай групе ў вышыні 222 000 і ёсьць прыблізнаю лічбаю гэтае іміграцыі. Адпаведная карэктура, на гэтай аснове, і была зробленая ў вадным з папярэдніх разьдзелаў гэтае працы, дзе аблічаецца дэмаграфічны дэфіцыт рэспублікі за 20 міжперапісных гадоў.

Працэнтная вага расейскага жыхарства рэспублікі за 20 міжперапісных

гадоў узрасла таксама істотна — з ранейшых 5,4% на пачатку 1939 году, да 8,2%, ці на 2,8%. У выніку расейская нацыянальная меншыня тэрыторыі з свайго раней трэйцяга па лічбовай сіле месца, посьле меншыняў жыдоўскай дый польскай, перасунулася цяпер на месца першае. Як расейская меншыня разьмяшчаецца тэрытарыяльна ў рэспубліцы, па акругах дый раёнах, пакульшто немагчыма нічога сказаць, паколькі ЦСУ, як дагэтуль, перапісных лічбаў па нацыянальнасьці ані па акругах, ані па раёнах не публікавала. Можна толькі дапускаць, што Расейцы сканцэнтраваныя пераважна па меставых цэнтрах дый адміністрацыйна-прамысловых асяродках рэспублікі, паколькі сацыяльна яны становяць галоўны кіраўніча-чынавецкі стрыжень дзяржаўна-палітычнае й гаспадарчае адміністрацыі краіны. Дзеля таго, што ўсе большыя месты сучаснае Беларускае ССР, улучна з найбольшым сталічным Менскам, знайходзяцца на тэрыторыі акругаў даваеннае БССР, дык і працэнт Расейцаў там і цяпер напэўна значна вышэйшы, як на землях былой Заходняй Беларусі.

Цікава зьвярнуць увагу на абсалютныя й працэнтныя лікі Расейцаў у іншых рэспубліках СССР, асабліва рэспубліках суседніх беларускай, дый прыраўнаць іх да ліку ў БССР. Лічбы гэтыя, паводля публікаваных ЦСУ вынікаў перапісу 1959 году дае табл. 14.

Табл. 14: Абсалютныя й працэнтныя лікі расейскага жыхарства рэспублікаў СССР паводля стану на 15.1.1959 году

Рэспублікі	Лікі ў тысячах	Лікі ў % жыхарства
Расейская СФСР	97 864	83,3
Украінская	7 091	16,9
Казахская	3 974	42,7
Узбэкская	1 091	13,5
Беларуская	**659**	**8,2**
Кіргіская	624	30,2
Латвійская	556	26,6
Азэрбайджанская	501	13,6
Грузінская	408	10,1
Малдаўская	293	10,2
Туркменская	263	17,3
Таджыкская	263	13,3
Эстонская	240	20,1
Лятувіская	231	8,5
Армянская	56	3,2
СССР	**114 114**	**54,6**

Лічбы табл. 14 паказваюць, што паводля ступені расейскае калянізацыі й русыфікацыі, блізу ўсе рэспублікі СССР знайходзяцца ў значна горшым палажэньні ад Беларускае ССР. У Казахскай ССР, дзе Расейцаў цяпер 42,7%, яны становяць ужо найбольшую лічбаю нацыянальную групу, перавышаючы значна сваім лікам і намінальных гаспадароў рэспублікі, аўтахтонных Казахаў, якіх тамака цяпер усяго 30,0%. Падобнае палажэньне й у Кіргіскай ССР, дзе Расейцаў цяпер 30,2%, а Кіргізаў хоць і большы працэнт, бо 40,5%, дый яны не становяць ужо абсалютнае бальшыні ў сваей

рэспубліцы. Кідаецца ў вочы й вялікі ўзрост Расейцаў у трох прыбалтыйскіх рэспубліках — Летуве, Латвіі й Эстоніі. У Летуве ў 1940 годзе было толькі 2,2% Расейцаў, цяпер 8,5%, значыцца блізу ў чатыры разы болей. Латвія, якая яшчэ ў 1939 годзе мела 10.6% Расейцаў, цяпер мае іх ужо 26,6%, ці больш у два з паловаю разы. Тое-ж у Эстоніі, з працэнтам расейцаў 8,2% у 1935 годзе, а цяпер 20,1%. У факце нязвычайна вялікага ўзросту ліку Расейцаў у прыбалтыйскіх рэспубліках праяўляецца бясспрэчна плянавае намаганьне Масквы магчыма хуткаю калянізацыяй і русыфікацыяй праз тэрыторыі гэтых рэспублікаў вымасьціць беспасярэдні шырэйшы доступ Расеі да Балтыйскага мора, да чаго імпэрыяльная Масква напірае найменш ужо ад чатырох стагодзьдзяў — ад пары Івана Грознага. Меншы працэнт расейскага жыхарства ад Беларускае ССР сяньня мае адна толькі Армянская ССР, дзе Расейцаў 3,2%.

Рэлятыўна ня гэткі высокі працэнт расейскае нацыянальнае мяншыні ў Беларускай ССР, хоць і павышаны за паваенныя толькі гады на 2,8%, не перашкаджае гэтаму, што мяншыня гэтая займае сяньня вельмі важную, бо пануючую палітычную, дзяржаўную, эканамічную й культурную пазыцыю ў рэспубліцы. Расейцамі цяпер у Беларускай ССР абсаджаныя блізу ўсе важнейшыя кіраўнічыя партыйныя, дзяржаўна-адміністрацыйныя й прамыслова-гаспадарчыя становішчы ня толькі на ўзроўні рэспубліканскім, акруговым дый раённым, але навет і ў сельсаветах ды калгасах. З Расейцаў рэкрутуецца й блізу ўся міжнародная дыпляматычная й палітычна-прапагандная рэпрэзэнтацыя рэспублікі, прыкладам «беларускія» прадстаўніцтвы й дэлегацыі ў Задзіночаных Нацыях.

Заведзеная савецкая сыстэма дзяржаўнага валаданьня й адміністраваньня ўсіх багацьцяў і рэсурсаў нацыянальнае гаспадаркі дае Маскве магчымасьць насаджваць на тэрыторыі Беларускае рэспублікі ня толькі сваю імпэр'яльную, каляніяльнага тыпу, адміністрацыю, як гэта было ў імпэрыі й у царскую пару, але, у дадатак, і ўсю кіраўнічую гаспадарчую адміністрацыю. Гэткім шляхам Масква сяньня падмяніла Расейцамі ў гандлёва-прамысловых галінах народнае гаспадаркі жыдоўскую нацыянальную мяншыню, а Расейцы, на месца жыдоў, сталі галоўнаю масаю жыхарства сучасных большых местаў Беларусі.

Для гэтае пануючае нацыянальнае мяншыні й яе каляніяльна-русыфікацыйных заданьняў у рэспубліцы, у якой больш 90% жыхарства не Расейцы, сяньня друкуецца больш кніжак парасейску, як пабеларуску, хоць Беларусаў тут больш 80%. Гэтак, у 1959 годзе ў межах рэспублікі было надрукавана 744 кніжак парасейску, а толькі 571 пабеларуску, ці, у працэнтах, 57% расейскіх, 43% беларускіх, хоць яшчэ ў гадох 1930-1935, у Беларускай ССР друкавалася сярэдня 85% кніжак пабеларуску, а толькі 5% парасейску.[74] У гэтым-жа годзе ў рэспубліцы выдавалася 66 пэрыядычных друкаў парасейску, а толькі 24 пабеларуску (улучна із зборнікамі і бюлетэнямі, якія выходзяць пэрыядычна), хоць, як паказваюць лічбы агульнага іх тыражу, — 2 135 000 для расейскіх пэрыёдыкаў, а 5 807 000 для беларускіх, — само жыхарства куды ахватней чытала друк беларускі, як расейскі.[75] Кры-

[74] Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 781. Лічбовыя дадзеныя аб друку Беларускае ССР у гадох 1930—1935 у «Летапіс друку БССР» за адпаведныя гады, Менск.

[75] Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 783.

ху накшае палажэньне было з газэтамі, зь якіх на тэрыторыі рэспублікі 212 (улучна з калгаснымі газэтамі), друкавалася пабеларуску, а толькі 43 парасейску.[76] Галоўны сяньня ў Беларускай ССР прэсавы ворган расейскае каляніяльнае адміністрацыі, — аснаўнога пануючага стрыжня новае сацыяльнае эксплятуючае клясы савецкага грамадзкага ладу, — гэта менскі расейскі штодзёньнік «Советская Белоруссия».

Падобнае вышэйшаму, палажэньні й у іншых галінах культурнага жыцьця рэспублікі, у якіх расейская меншыня займае ня то што ўпрывіліяваную, а проста дамінуючую пазыцыю. Гэтак, бальшыня тэатраў рэспублікі карыстаецца ня моваю бальшыні жыхарства рэспублікі, беларускаю, а моваю расейскаю.[77] Тое-ж і з праграмамі радыястанцыяў БССР. Падобна ёсьць і з вышэйшым школьніцтвам рэспублікі. Навет і сэсіі г. зв. вярхоўнага савету БССР, найвышэйшае заканадаўчае ўстановы рэспублікі, яе парлямэнту, для выгады пануючае ў рэспубліцы нацыянальнае расейскае меншыні, у «сувэрэннай» і беларускай намінальна дзяржаве, праводзяцца сяньня парасейску, а не на мове народу, які складае больш 80% жыхарства рэспублікі.

3. Палякі

Сваімі пачаткамі польская нацыянальная меншыня на тэрыторыі Беларусі старэйшая за расейскую. Яна розьніцца ад меншыні расейскае й сваім паходжаньнем. Расейцы ў Беларусі ў сваей масе, гэта экстратэрытар'яльны элемэнт, іміграніы або іхныя нашчадкі. Толькі ў значна меншым ліку сярод расейскае нацыянальнае меншыні сустрэнем і зрушчаных мясцовых жыхароў. Польская-ж нацыянальная меншыня на тэрыторыі Беларусі, наадварот, у сваей масе паходжаньня аўтахтоннага, із спалянізаванага ад пакаленьняў мясцовага жыхарства, і, толькі выняткова, будуць гэта імігранты з Польшчы ці іхныя нашчадкі.

Магчымасьці іміграцыі на тэрыторыю Беларусі для польскага этнічна жыхарства з Польшчы адкрыліся ўжо ад Крэўскае вуніі 1385 году, вынікам якое была створаная супольная Рэчыпаспалітая Польшчы й Вялікага Княства Літоўскага. Пазьней магчымасьці гэтыя, аднак-жа, былі моцна абмежаныя адмысловымі пастановамі й законамі Вялікага Княства, у першую чаргу Літоўскімі Статутамі. У выніку, польскае іміграцыі на тэрыторыі Беларусі, як працэсу масавага, гісторыя ня знае. Часовым, кароткатрывалым выняткам у гэтым правіле былі міжваенныя гады, калі на тэрыторыю Заходняе Беларусі, што ўходзіла тады ў склад павэрсальскае Польшчы, польская ўлада насылала сотні тысячаў польскіх урадоўцаў ды цывільных і вайсковых асаднікаў. Гэткім спосабам у міжваенную пару на землях былое Заходняе Беларусі апынулася каля 265 000 этнічна польскага жыхарства.[78] Дый гэтыя масы польскіх імігрантаў, у вабставінах далейшых гістарычных падзеяў, на беларускіх землях ня здолелі ўтрымацца. Вялікая іх частка ўцякла з тэрыторыі ўжо ў восені 1939 году, пасьле ваеннага раз-

[76] Тамсама, б. 784.

[77] Культурное строительство СССР. Центральное Статистическое Управление. Москва, 1956, б. 298.

[78] Мікола Волацiч. Насельніцтва Заходняе Беларусі... «Беларускі Зборнік», кн. 4. Інстытут для вывучэньня СССР. Мюнхэн, 1956, б. 13.

грому Польшчы нямецкімі арміямі. Тыя, што засталіся, былі пазьней дэпартаваныя ўглыбкі Савецкае імпэрыі бальшавіцкаю акупацыйнаю ўладаю, асабліва грунтоўна асаднікі. Невялікая астача ліквідавалася посьле, шляхам афіцыйнае вымены польскага жыхарства Беларускае ССР на беларускае з Польшчы, у пачаткавых паваенных гадох.

Ня існуе ў межах сучаснае Беларускае ССР і ніякае польскае этнічнае тэрыторыі з аўтахтонным польскім жыхарствам. Масква, як ведама, сучасную заходнюю мяжу Беларускае ССР з сатэлітнаю Польшчаю на ўсім яе прабегу правяла па тэрыторыі беларускай, пакідаючы па польскім баку значныя часткі беларускае Беласточчыны й Падляшша. Тамака сяньня існуе каля сотні беларускіх праваслаўных прыходаў, дзеюць беларускія культурна-асьветныя гурткі, працуюць беларускія пачатковыя й сярэднія школы, выдаецца беларускі пэрыядычны друк. Дык Палякі польскага этнічнага паходжаньня на тэрыторыі сучаснае Беларускае ССР, як правіла, ня існуюць. Мясцовыя жыхары, што падаюць сваю нацыянальнасьць як польскую, гэта толькі ў большай ці меншай ступені палянізаваныя Беларусы, этнічна адналіта га паходжаньня з рэштаю беларускага жыхарства рэспублікі. Працэс палянізацыі на тэрыторыі Беларусі паважней зазначыўся ад XVII стагодзьдзя. Найперш пальшчэлі сацыяльныя «вярхі» — магнаты, замажнейшая шляхта, багацейшае мяшчанства каталіцкага веравызнаньня. Нашчадкі іхныя на пачатку XX ст. былі ўжо натолькі спалянізаваныя, што чуліся вялікімі польскімі патрыётамі, і, па сваім перакананьні дый палітычнай дзейнасьці, былі часта больш шавіністычна настроеныя ад Палякаў этнічных.

Крыху пазьней, палянізацыя пранікла й у масы беларускага каталіцкага мяшчанства, а таксама дробнае шляхты, якая аднак-жа, ведала звычайна добра й мову сваіх прашчураў, беларускую мову. Найменш палянізацыйны працэс крануў беларускае сялянства каталіцкага веравызнаньня. За выняткам нешматлікіх селішчаў пры пары заходнябеларускіх местаў, у сваей масе ўся «пальшчыня» сялян-каталікоў зводзілася да таго, што былі яны «польскае», значыцца каталіцкае веры. Польскае каталіцкае духавенства, інтэлігенцыя, а ў міжваенную пару й польская ўлада, дзеля палітычных мяркаваньняў, на тэрыторыі Беларусі сьведама праводзіла ідэнтыфікацыю каталіцтва з польскаю нацыянальнасьцяй, прапагуючы формулу: каталіцтва — польская вера, хто каталік — той Паляк.

Тое-ж самае праз ўсё XIX стагодзьдзе цьвердзіла, з другога боку, і расейская палітычная прапаганда, а навет ня раз і афіцыйныя расейскія дзейнікі, якія ўпісвалі ў Палякі ўсіх Беларусаў каталікоў. Для прыкладу, адна зь першых статыстыкаў і картаў беларускае этнічнае тэрыторыі, складзеная палкоўнікам расейскае арміі Р. Ф. Эркертам у 1863 годзе, была абапертая на прынцыпе, што падзел па веры ў Беларусі адказвае падзелу й нацыянальнаму на Палякаў і Беларусаў. Гэткім шляхам усе каталікі Беларусі былі аўтаматычна залічаныя ў Палякі. Палкоўнік Эркерт пісаў: «У Заходняй Расеі . . . усе славянскія жыхары праваслаўнага веравызнаньня павінны ўважацца Расейцамі, а ўсе тыя, што вызнаюць каталіцкую рэлігію, — Палякамі . . . Выказаны намі пагляд . . . падзяляюць і расейскі дый польскі «прасталюдзін», таксама як цывільныя й ваенныя ўлады, духавенства, памешчыкі, дый усё нашае кватэраванае там войска».[79] Калі на

[79] R. F. Erkert: Atlas ethnographique des provinces, habitées en totalité ou en partie

гэткі прынцып пры азначэньні нацыянальнасьці апіраліся навет расейскія аўтары, няма дзіва, што асабліва шырака тарнавалі яго ў сваей статыстыцы й публікацыях аўтары польскія й польскія ўрадовыя дзейнікі міжваеннае пары, якія запісавалі ў Палякі ўжо ня толькі ўсіх Беларусаў каталікоў, але немалую частку й праваслаўных. На аснове правіла: «каталіцтва — польская вера», на землях Заходняе Беларусі польскімі перапісамі й статыстыкамі ў міжваенныя гады й стваралася «польская бальшыня» тэрыторыі.

З пашырэньнем беларускае нацыянальнае сьведамасьці сярод масаў сялянства ў XX ст., гэтая прышчэпліваная вякамі з польскага й расейскага боку ідэнтыфікацыя рэлігіі з нацыянальнасьцяй ужо губляла на сваей сіле й значаньні. Здарылася аднак-жа гэтак, што падзеі Другое Сусьветнае Вайны неспадзеўкі змушалі беларускае каталіцкае сялянства да навароту да гэтага прынцыпу дзеля звычайнага самазахаваньня. Пры канцы вайны, пасьля рэакупацыі тэрыторыі Заходняе Беларусі савецкаю арміяй, склалася такое палажэньне, што, каб пакінуць падсавецкую тэрыторыю дый вымкнуцца з-пад беспасярэдняга засягу савецкага тэрору, адзінаю радаю было падаць сваю каталіцкую веру за азнаку польскае нацыянальнасьці й атрымаць гэтак права на пераезд у сатэлітную Польшчу. Ведама сяньня, што з гэтае магчымасьці тады скарыстала шмат сотняў тысячаў беларускага сялянства былое Заходняе Беларусі як каталіцкага, так і праваслаўнага. Сьветчыць пра гэта, між іншым, і колькі дзесяткаў праваслаўных прыходаў, што рассыпаныя сяньня на былых нямецкіх тэрыторыях сучаснае Польшчы.[80] Ведама таксама, што яшчэ пазьней, тысячы сасланых у савецкія канцэнтрацыйныя лягеры Беларусаў зь земляў былое Заходняе Беларусі, каб вырвацца з гэтых лягераў, а разам і з самога Савецкага Саюзу, скарысталі з падпісанае ўрадам Гамулкі дамовы з савецкім урадам аб рэпатрыяцыі ў Польшчу палітычных зьняволеных Палякаў, дый, падаючы сваё былое польскае грамадзянтва, ці ізноў каталіцкае веравызнаньне за аснову, пераехалі ў Польшчу. Колькі год раней, падобным спосабам у вольны сьвет, на свабоду, з канцэнтрацыйных савецкіх лягераў і ссылак, вырваліся, запісаўшыся ў польскую армію генэрала Андэрса, тысячы іншых зьняволеных Беларусаў.

Перапіс 1959 году на тэрыторыі Беларускае ССР выявіў 539 000 Палякаў, што становіць 6,7% жыхарства рэспублікі. Важна пры гэтым адзначыць, што паводля апублікаваных ЦСУ дадзеных перапісу, толькі 45,5% усіх жыхароў СССР, што 15 студзеня 1959 году падалі сваю нацыянальнасьць за польскую, падало адначасна й польскую мову за сваю родную. Гэта значыць, што бальшыня Палякаў СССР, бо 54,5%, за родную мову ўважае ня польскую, а нейкую іншую. Нажаль, падобная статыстыка, як дагэтуль, не апублікаваная па рэспубліках, і дзеля гэтага немагчыма сказаць, колькі жыхароў Беларускае ССР, што падалі сваю нацыянальнасьць за польскую, адначасна падало й польскую мову за сваю родную.

Калі значнае павялічэньне ліку жыхарства расейскае нацыянальнасьці на тэрыторыі рэспублікі, а памяншэньне жыдоўскае, можна было прадба-

---

par les Polonais. S.-Peterbourg, 1863. Перавыдадзены ў 1864 годзе парасейску: Р. Ф. Эркерт. Взгляд на историю и этнографию западных губерний России (С атласом). С.-Петербург, 1864.

[80] Православный календарь на 1961 год. Варшава, 1961, б. 62—72.

чыць і спадзявацца, дык рэлятыўна высокая лічба Палякаў — больш поўмільёна — для знаючых беспасярэдня тэрыторыю, яе жыхарства й гістарычныя падзеі апошніх гадоў, была ў вялікай меры неспадзеўкаю. Была не адна, а колькі важных прычынаў, якія паказвалі на тое, што лічба Палякаў на тэрыторыі павінна значна спасьці, магчыма навет да вышыні, якую выказваў савецкі перапіс 1926 году на тэрыторыі тагачаснае БССР — 2%.

Найперш, як спаміналася ўжо раней, усё насланае за міжваенныя гады польскае этнічна жыхарства ў ваенную пару цалком шчэзла з тэрыторыі Заходняе Беларусі й яно не магло адбіцца на вышыні сучаснай лічбы Палякаў у Беларускай ССР. Падругое, як ведама, савецкі рэжым дэпартаваў з тэрыторыі заходнябеларускіх земляў усіх большых польскіх земляўласьнікаў, блізу ўсіх каталіцкіх сьвятароў дый значную частку іншых Палякаў, калі яны самі ня справіліся перад гэтым уцячы на захад. Замажнейшыя сацыяльна клясы, галоўна апора польшчыны на тэрыторыі, практычна перасталі існаваць ужо посьле першае савецкае акупацыі Заходняе Беларусі ў гадох 1939-1941. З рэшты Палякаў тэрыторыі значны іх лік эміграваў на захад перад контрнаступам савецкае арміі ў 1944 годзе. Частка гэтых уцекачоў затрымалася на этнічна польскіх землях і сяньня знайходзіцца ў межах польскае дзяржавы. Частка паддалася далей на захад і цяпер рассыпаная, як эмігранты, па краёх заходняе Эўропы, Амэрыкі, у Аўстраліі. За хваляй уцекачоў, прыйшла й другая масавая эміграцыйная хваля з тых-жа земляў былое Заходняе Беларусі на аснове праведзенае афіцыйнае вымены жыхарства між Польшчаю й Беларускай ССР. Ведама, што з гэтае нагоды скарыстала больш 300 000 жыхароў Заходняе Беларусі.[81] Хоць сярод гэтых перасяленцаў-«Палякаў» быў вялікі лік найчысьцейшых Беларусаў, ды ўсё-ж ня мала тады выехала й Палякаў пераконаных. Да ўсяго трэба яшчэ дадаць, што абодва вялікія месты Заходняе Беларусі, дзе жылі большыя масы палянізаванага мяшчанства, — Вільня й Беласток, — былі адрэзаныя Масквою ад тэрыторыі Беларускае ССР ды перададзеныя Польшчы (Беласток), або Летуве (Вільня).

Вось пры ўлічэньні ўсіх гэтых фактаў цяжка было спадзявацца, каб у межах рэспублікі мог застацца яшчэ паважнейшы лік Палякаў. Гэтак думалі й некаторыя польскія аўтары, што паходзілі самі зь беларскіх земляў і добра іх ведалі.[82] Калі на тэрыторыі даваеннае БССР, на аснове дадзеных перапісу 1926 году, у 1959 годзе можна было лічыцца зь лічбаю Палякаў каля 100 000, дык для значна меншых прасторам і жыхарствам заходніх земляў можна было спадзявацца мала больш. Калі-ж перапіс 1959 году выявіў лічбу на 300 000 вышэйшую ад гэткае ацэны, дык гэта магло стацца толькі дзеля таго, што ў дадзеных гістарычных умовах частка беларускага каталіцкага сялянства знайшла мэтазгодным падаваць сваю нацыянальнасьць не за беларускую, а польскую, карыстаючы з старое формулы: каталік — значыцца Паляк.

Калі заходнябеларускае сялянства ў пэўнай сваей часьці гэтак зрабіла, дык яно, з свайго боку, мела на гэта ня мала прычынаў. Каб глыбей зразумець гэты крок, трэба зьвярнуць увагу на раней ужо спамінаны факт,

[81] Мікола Волацiч. Насельніцтва Заходняе Беларусі..., б. 26.

[82] Stanisław Świaniewicz. Pozycja gospodarcza Ziem W. Ks. Litewskiego. Dieje ziem Wielkiego Ksiestwa Litewskiego. Alma Mater Vilnensis. Londyn, 1953, b. 43.

што ў канцавой фазе вайны, калі было ясна, што бальшавіцкая армія нанава акупуе тэрыторыю Заходняй Беларусі, сярод сялянства Заходняе Беларусі, — і каталіцкага, і праваслаўнага, — зазначыўся спантанічны масавы ўзрух да ўцёку на захад. Ведама добра, што да гэтага роспачнага кроку ўрослае спрадвеку ў сваю зямлю сялянства штырхалі ня нейкі польскі патрыятызм, ці прапольскія сымпатыі, а стыхійны страх перад новаю пагрозаю бальшавіцкага палітычнага тэрору, памеры й жудасьці якога беларускаму сялянству давялося пазнаць у часе савецкае акупацыі тэрыторыі ўжо ў 1939-1941 гадох. Дык псыхалягічная аснова гэтага спантанічнага міграцыйнага руху беларускага жыхарства земляў Заходняе Беларусі ляжала ня ў роўніцы нацыянальнай, ані рэлігійнай, а — палітычнай. Гэта быў акт народнае прынцыповае нэгацыі расейскага камуністычнага рэжыму, ягонага антысялянскага сацыяльна-грамадзкага ладу, ягонае палітычнае дыктатуры й тэрору, ягонае прымусовае калектывізацыі й масавых дэпартацыяў. Выглядае, што частка тых, якія ў ваенную ці беспасярэднюю паваенную пару не наважыліся або ня мелі змогі пакінуць сваю спрадвечную зямлю, сваё адмоўнае становішча да існуючае ў Беларускай ССР і ўсім СССР расейскае камуністычнае ўлады задэманстравала цяпер паданьнем свае нацыянальнасьці польскаю ў часе перапісу. У гэтым кроку яўная дэманстрацыя супроць пануючага рэжыму, і, разам, хіба, некаторае палітычнае страхаваньне, каб, на выпадак, калі-б нейкая гістарычная магчымасьць «вымены» ці проста ўцёкаў на захад ізноў паўстала, была-б аснова паклікацца на сваю «каталіцка-польскую» нацыянальнасьць.

І для гэтага свайго кроку сялянства земляў былое Заходняе Беларусі мела даволі паважных прычынаў. Найперш — што, і ці шмат, здабыў селянін Заходняе Беларусі апынуўшыся ў межах «свае» Беларускае ССР? Заміж абяцанае даваеннымі лістоўкамі КПЗБ (Камуністычная Партыя Заходняе Беларусі) й савецкаю радыёваю прапагандаю зямлі дый дабрабыту, дастаў ён калектывізацыю, калгасную прыгонную сыстэму, мізэрна аплачваныя працадні, хранічныя недастаткі. Палітычна — заміж абяцанае свабоды, правоў і дэмакрацыі, прыйшлося зазнаць дыктатуру, тэрор ды савецкую фарсу «дэмакратычных» выбараў. У дадатак прыйшлі масавыя дэпартацыі й прымусовыя перасяленьні.

З нацыянальнага гледзішча «свая» Беларуская ССР на месца ранейшае паланізацыі пад Польшчаю прынесла русыфікацыю ў школе, друку, дзяржаўных установах. На свае вочы й на кажным кроку селянін можа назіраць, як на ўсіх адказных кіраўнічых становішчах пасаджаныя Расейцы, калі тым-жа часам сотні тысячаў Беларусаў кажны год вывозяцца на прымусовыя перасяленьні з тае «свае» дзяржавы, якая на практыцы аказалася ня чым іншым, як толькі інструмантам Масквы для палітычнага ўціску народу, эканамічна-сацыяльнага й каляніяльнага яго вызыску, дэнацыяналізацыі й русыфікацыі.

А адначасова гэтае-ж сялянства чуе й добра ведае, што непадалёк за мяжою, у Гамулкавай Польшчы, дзе знайшлі прытулак сотні тысячаў ягоных суродзічаў, зь якімі існуе сталая сувязь, — хоць жывуць таксама пад камуністычнаю дыктатурай, аднак-жа без калгаснага прымусу, без пагрозы дэпартацыяў і перасяленьняў. У выніку, у часе перапісу яно ў рубрыцы нацыянальнасьці й задэманстравала сваё прызнаньне той крысе людзкой свабоды, якое пазбавілі яго зусім у межах «свае-ж» Беларускае рэспублікі.

Дый якія-б тлумачэньні й камэнтары аб ліку Палякаў у Беларускай ССР не даваць, трэба прызнаць, што перапіс 1959 году паказвае, што польская нацыянальная меншыня на тэрыторыі рэспублікі яшчэ існуе і ў даволі паважнай лічбе. Па сваей лічбовай сіле яна сяньня займае другое месца сярод нацыянальных меншыняў рэспублікі, уступаючы сваім лікам толькі меншыні расейскай. Яшчэ ў мінулым і на пачатку гэтага стагодзьдзя лічбовыя пазыцыі гэтых меншыняў на тэрыторыі Беларусі былі адваротныя.

Другі важны выснаў, які з вышэй разгледжаных фактаў даводзіцца зрабіць, гэта той, што ў нацыянальнай перапіснай статыстыцы на беларускай тэрыторыі фактар рэлігійны не перастаў іграць свае паважнае ролі яшчэ й цяпер, у другой палове XX ст., дый навет пры існаваньні на тэрыторыі атэістычнага, антырэлігійнага расейскага рэжыму.

Пры канцы разгляду сучаснага лічбовага стану польскае нацыянальнае меншыні на тэрыторыі Беларускае ССР, цікава прыраўнаць лікі жыхарства польскае нацыянальнасьці па іншых рэспубліках СССР, як іх выявіў перапіс 1959 году. У табл. 15 гэтыя лікі, абсалютныя й працэнтныя, і пададеныя для ўсіх тых рэспублікаў, лічбы Палякаў у якіх ЦСУ апублікавала.

Табл. 15: Жыхарства польскае нацыянальнасьці ў СССР па рэспубліках паводля перапісу 15 студзеня 1959 году

Рэспублікі	Лікі ў тысячах	Лікі ў % жыхарства
СССР	1 380	0,7
Беларуская	**539**	**6,7**
Украінская	363	0,9
Лятувіская	230	8,5
Расейская СФСР	118	0,1
Латвійская	60	2,9
Казахская	53	0,6
Іншыя	17	—

Як відаць з табл. 15, на Беларускую рэспубліку ў СССР сяньня прыпадае найбольшы лік Палякаў. Кругла 40% усяго жыхарства СССР, што ў часе перапісу падало сваю нацыянальнасьць за польскую, жыве сяньня на тэрыторыі Беларускае ССР. На высокім працэнце Палякаў у Летувіскай ССР яўна заважыў факт далучэньня да гэтае рэспублікі Вільні з ваколіцамі. Там Масква зьліквідавала сяньня беларускае школьніцтва разам з праіснаваўшай да савецкай акупацыі на працягу цэлага чверцьвечча Віленскай Беларускай Гімназіяй, але падтрымлівае школьніцтва польскае дый насаджвае ўсімі сіламі школьніцтва расейскае. Вялікая частка Палякаў Летувіскае ССР, гэта сяляне Віленшчыны, тыя-ж Беларусы «польскае» каталіцкае веры. Падобнага часткова паходжаньня й лічба Палякаў у Латвійскай ССР, дзе беларускае каталіцкае сялянства Латгаліі й цяпер, як ня раз і раней, запісанае ў Палякі на аснове тае-ж «польскае веры».

4. Жыды

Жыды ў Беларусі — адна з найстарэйшых нацыянальных меншыняў. Існаваньне Жыдоў на тэрыторі можна сьцьвердзіць ад больш як тысячы гадоў, бо найменш ад VIII ст. нашай эры. Як відаць з правоў і прывілеяў дадзеных Вітаўтам Вялікім у канцы XIV ст. Жыдом местаў Берасьця, Горадні, Трокаў дый іншых, Жыды тады ўжо тварылі па местах Беларусі людныя, добра арганізаваныя й эканамічна бойкія грамады. Рэлігійная й нацыянальная талеранцыя, якая панавала ў Вялікім Княсьцьве Літоўскім за Ягайлавічаў, стварала асновы для далейшага эканамічна-культурнага разьвіцьця жыдоўскае меншыні ў Беларусі, пара красаваньня й дабрабыту якое прыпадае на XVI стагодзьдзе.

Сучасныя беларускія Жыды гістарычна склаліся зь дзьвёх розных па часе й месцы паходжаньня іміграцыйных плыняў. Старэйшая, першапачатная іміграцыя ішла некалі з краёў паўдня й блізкога Ўсходу. Жыды гэтага паходжаньня, праз доўгія стагодзьдзі сужыцьця зь беларускім жыхартсвам, значна асыміляваліся й гаварылі пабеларуску. Другая плынь жыдоўскае іміграцыі кіравалася на землі Беларусі, асабліва ад канца XVI ст., з краёў Заходняе Эўропы, галоўна Нямеччыны. Гэтыя Жыды культурна й моўна былі гэрманізаваныя й яны гэта прынесьлі з сабою нямецкую мову, зь якое разьвілася сучасная мова жыдоўская. На тэрыторыі Беларусі гэтая навейшая, заходняя іміграцыйная плынь з часам культурна перамагла, запанавала й накінула ўсім Жыдом Беларусі сваю нямецка-жыдоўскую мову.

Карыстаючы з рэлігійнае й эканамічнае свабоды на прасторы Вялікага Княства Літоўскага, жыдоўская нацыянальная меншыня з часам разраслася на толькі, што тварыла галоўную масу гандлёва-рамесьніцкага меставога жыхарства Беларусі. Некаторыя месты беларускіх земляў у XIX-XX ст. ст. мелі 50-70% і болей жыхароў жыдоўскае нацыянальнасьці. Факт лічбовае й гаспадарскае дамінацыі Жыдоў у местах Беларусі быў аднэй з прычынаў таго, што беларускае па нацыянальнасьці мяшчанства слаба разьвілося, а гэта ізноў мела свае немалыя кансэквэнцыі для культурнага й палітычнага жыцьця Беларусі апошніх стагодзьдзяў і асабліва беларускага нацыянальнага адраджэньня.

З часам эканамічнае й праўнае палажэньне Жыдоў на беларускіх землях значна пагоршала, асабліва посьле прылучэньня земляў Вялікага Княства Літоўскага да Расейскае імпэрыі ў канцы XVIII ст. Царскі ўрад вызначыў жыдоўскаму жыхарству г. зв. «черту оседлости», паза якую Жыдом было забаронена пераяжджаць і пасяляцца. У прастор «черты оседлости» ўходзілі й беларускія землі, за выняткам Смаленшчыны. Дзеля цяжкога гаспадарскага застою на беларускіх землях пасьля іх далучэньня да Расеі масы жыдоўскага жыхарства трапілі ў вельмі цяжкое эканамічнае палажэньне. Пры тым дакучалі й арганізаваныя па большых местах Беларусі чорнасоценцамі антыжыдоўскія пагромы. Дзеля гэтага ад канца XIX ст. пачынаецца масавая эміграцыя жыдоўскага жыхарства тэрыторыі на захад, галоўна ў Амэрыку.

Першы агульны перапіс жыхарства Расейскае імпэрыі 1897 году на прасторы тых пяці тагачасных беларускіх губэрняў, зь якіх сяньня выразаная тэрыторыя цяперашняе Беларускае ССР, — Менскай, Віленскай, Го-

радзенскай, Віцебскай і Магілеўскай, — сьцьвердзіў 14,1% жыдоўскага жыхарства.[83] У выніку масавай эміграцыі з гэтых губэрняў жыдоўскага жыхарства на пачатак Першае Сусьветнае Вайны лік Жыдоў на гэтай тэрыторыі спаў да 10%. Гэткі прыблізна працэнт жыдоўскага жыхарства існаваў на тэрыторыі былое Заходняе Беларусі ў межах Польшчы, і праз міжваенныя гады. Падчас польскага перапісу 1931 году на прасторы 4-х этнічна беларускіх ваяводзстваў — Віленскага, Наваградзкага, Палескага й Беластоцкага, — было выяўлена 9,7% Жыдоў.

На беларускіх землях у межах Беларускае ССР у міжваенныя гады адбываўся тымчасам далейшы працэнтны спад жыдоўскага жыхарства дзеля эміграцыі. Посьле залому царскага рэжыму ў Расеі, былі скасаваныя й законы аб г. зв. «черте оседлости» жыдоўскага жыхарства. Адначасна былі пастароненыя ўсякія праўныя абмежаньні жыдоўскага жыхарства й Жыдом пры новай камуністычнай уладзе імпэрыі сталі даступныя ўсе адміністрацыйныя становішчы. У выніку гэтага пачалася масавая эміграцыя Жыдоў з тэрыторыі даваеннае Беларускае ССР на ўсход, найперш у Маскву, Ленінград і іншыя адміністрацыйна-эканамічныя цэнтры савецкае імпэрыі. У выніку гэтай эміграцыі працэнт жыдоўскага жыхарства ў тагачаснай БССР далей падае. Перапіс 17 сьнежня 1926 году ў межах рэспублікі знайходзіць іх 8,2%. Спад гэты адбываецца й далей аж да пачатку Другое Сусьветнае Вайны. У некаторай часьці быў ён спрычынены й намерам Сталіна арганізаваць у савецкай Азіі жыдоўскую аўтаномную рэспубліку — Біробіджан.

Пасьля далучэньня, у верасьні 1939 году, да Беларускае ССР земляў Заходняе Беларусі на тэрыторыі рэспублікі ў сучасных яе межах у сярэднім было прыблізна 8% жыдоўскага жыхарства, з тым, што вышэйшы працэнт, 9,7%, быў на навадалучаных заходніх прасторах, а ніжэйшы на тэрыторыі даваеннае БССР. Пры 8% у сярэднім, на пачатку 1939 году на тэрыторыі Беларускае ССР у сучасных яе межах мусіла быць каля 750 000 жыхароў жыдоўскае нацыянальнасьці.

Агульна ведама, што жыдоўскае жыхарства панесла нязвычайна вялікія страты ў часе нямецкае акупацыі тэрыторыі рэспублікі падчас апошняе сусьветнае вайны ў выніку гітлераўскага масавага нішчэньня Жыдоў. Вынікі перапісу 1959 году й даюць магчымасьць азначыць прыблізна памеры гэтых гітлераўскіх зьнішчэньняў у канкрэтных лічбовых вялічынях. Паводля ЦСУ, 15 студзеня 1959 году на тэрыторыі Беларускае ССР было запісана кругла 150 000 жыхароў жыдоўскае нацыянальнасьці, што становіць 1,9% сучаснага жыхарства рэспублікі. Калі, як відаць з папярэдніх аблічэньняў, на пачатку 1939 году на той-жа тэрыторыі іх было 750 000, значыцца недалік за перапісны час выносіць 600 000. З гэтае лічбы вынікае, што лік Жыдоў тэрыторыі рэспублікі, зьнішчаных акцыяй Гітлера ў часе нямецкае акупацыі тэрыторыі ў гадох 1941-1944, трэба ацэньваць прыблізна на поўмільёна. Рэшта 100 000 прыпадзе на тых, што перад нямецкім наступам змаглі ўцячы на ўсход, ды на тых, што ўжо посьле вайны эмігравалі на захад — у краі Эўропы, Амэрыкі, у Ізраэль.

Дзеля эміграцыі, а галоўна дзеля гітлераўскае акцыі масавага нішчэнь-

[83] Первая всеобщая перепись населения Российской імперии 1897 года, под ред. Н. А. Тройницкого. Общий свод по империи результатов разработки данных первой всеобщей переписи населения произведенной 28 января 1897 года, том II, б. 20.

ня, жыдоўская нацыянальная група на тэрыторыі Беларусі згубіла сваю ранейшую пазыцыю наймацнейшае лічбаю нацыянальнае мяншыні, пазыцыю, якую яна займала ў Беларусі ад стагодзьдзяў. Але для дакладнасьці трэба адцеміць, што ў паваенныя гады, з нарастаньнем Сталінскага антысэмітызму, і камуністычны рэжым рэспублікі на загад з Масквы праводзіў дэпартацыі, а навет фізычнае нішчэньне Жыдоў з тэрыторыі Беларускае ССР. Фізычнаму зьнішчэньню падпала тады галоўна жыдоўская нацыянальная інтэлігенцыя. Ведамая шырэй савецкая расправа з жыдоўскімі пісьменьнікамі й журналістымі ў 1948 годзе. Як у міжваенную, гэтак і ў паваенную пару, Масква праводзіла далей сыстэматычную дэнацыяналізацыю й русыфікацыю, дый, наагул, пляновую акцыю раскладу й ліквідацыі Жыдоў у СССР, як рэлігійна-нацыянальнае групы. На тэрыторыі Беларускае ССР сяньня няма аніводнае жыдоўскае школы, ніводнае жыдоўскае газэты, ня выдаецца ніводная жыдоўская кніга, і не дапускаецца тварэньня ніякіх жыдоўскіх культурных ці рэлігійных арганізацыяў. Адзіныя існуючыя сяньня жыдоўскія асяродкі, гэта колькі сынагогаў па большых местах Беларускае ССР.

Расейскія камуністычныя кіраўнікі імпэрыі сяньня выразна намагаюцца давесьці да канца справу ліквідацыі Жыдоў на тэрыторыі СССР, распачатую Гітлерам, хоць і іншымі спосабамі: дэнацыяналізацыяй і русыфікацыяй. Вынікі гэтых намаганьняў паказвае й перапіс 1959 году, які сьцьвердзіў, што цяпер толькі 21,1% Жыдоў СССР за сваю родную мову падае яшчэ мову жыдоўскую. У часе перапісу 1926 году лік Жыдоў з жыдоўскаю моваю як роднаю быў яшчэ ў вышыні 76%. Гэтак на працягу ўсяго 32 гадоў 55% жыдоўскае мяншыні ў СССР згубіла сваю жыдоўскаю мову. Дык пры ацэне нізкіх лічбаў жыхарства жыдоўскае нацыянальнасьці на тэрыторыі Беларускае ССР трэба мець наўвеце, што гэта ня толькі вынік гітлераўскіх нішчэньняў. Часткова на нізкіх лічбах Жыдоў адбіліся й савецкія лквідацыі жыдоўскага жыхарства Сталінскае пары дый кансэквэнтна праводжаная іх дэнацыяналізацыя. Яны таксама вынік і эміграцыі, як дабравольнае, гэтак і прымусовае, што трывае ўжо ад канца XIX ст.

На табл. 16 супастаўленыя Беларуская зь некаторымі іншымі рэспублікамі СССР паводля ліку жыдоўскага ў іх жыхарства на аснове пададзеных ЦСУ лічбаў перапісу. Аб ліку Жыдоў у рэспубліках тут не пералічаных ніякіх лічбаў ЦСУ, як дагэтуль, не публікавала.

Вялікі лічбовы й працэнтны спад жыхарства жыдоўскае нацыянальнасьці, гэта найбольшая зьмена нацыянальнага складу рэспублікі, якую выявіў савецкі перапіс 1959 году. У выніку, жыдоўская нацыянальная мяншыня на тэрыторыі Беларускае ССР лікам спала із свайго раней першага месца, на месца трэйцяе. Пры тым спад аказаўся на толькі вялікім, што мяншыня гэтая наагул выпала зь ліку трох «вялікіх» мяншыняў тэрыторыі — жыдоўскае, польскае й расейскае, і перайшла да катэгорыі мяншыняў меншых лічбаю й значаньнем, да якіх, побач жыдоўскае мяншыні, на тэрыторыі рэспублікі належаць яшчэ Ўкраінцы.

У сувязі з памяншэньнем лічбовым, зразумела, моцна зьменшылася й удзельная вага жыдоўскае мяншыні ў жыцьці рэспублікі. На памяншэньне палітычна-гаспадарскае вагі жыдоўскае мяншыні тэрыторыі, апрача вялікага лічбовага яе спаду, заважыў моцна яшчэ й той факт, што пры сучасным савецкім сацыяльна-эканамічным ладзе, пры ліквідацыі прыватнага

гандлю, рамясла й промыслу, жыдоўская меншыня згубіла й сваю ранейшую спэцыфічную пазыцыю сацыяльна адналітае гандлёва-прамысловае й рамесьніцкае клясы тэрыторыі.

Табл. 16: Жыхарства жыдоўскае нацыянальнасьці па рэспубліках СССР паводля перапісу 15. 1. 1959 году

Рэспублікі	Лікі ў тысячах	Лікі ў % жыхарства
СССР	2 268	1,1
Расейская СФСР	875	0,7
Украінская	840	2,0
Беларуская	**150**	**1,9**
Малдаўская	95	3,3
Узбэкская	94	1,2
Грузінская	52	1,3
Латвійская	37	1,7
Лятувіская	25	0,9
Эстонская	5	0,5
Іншыя	90	—

Праз усё апошняе паўтысячагодзьдзе жыдоўскае жыхарства Беларусі станавіла галоўны стрыжэнь мяшчанскае клясы й канцэнтравала ў сваіх рукох фінансавы капітал дый важнейшыя гандлёва-прамысловыя функцыі краю. Гэтая важная пазыцыя ў нацыянальнай эканоміцы Беларусі для жыдоўскае меншыні сяньня страчаная й, відаць, беспаваротна. Галоўныя прычыны гэтага дзьве. Адна, гэта новы савецкі сацыяльна-эканамічны лад, у працэсе заводжаньня якога ўсе важнейшыя кіраўнічыя функцыі гаспадарскага жыцьця рэспублікі Масква пастаралася перадаць у рукі насланае свае расейскае каляніяльнае адміністрацыі. У выніку, гэтая адміністрацыя й заняла сяньня месца жыдоўскага жыхарства па меставых і прамысловых асяродках рэспублікі, становячы галоўную масу мяшчанства большых местаў тэрыторыі. Другая прычына ляжала ўжо ў самым драматычным спадзе лічбовае сілы жыдоўскага жыхарства тэрыторыі ад канца XIX да паловы XX ст., спадзе на больш 12%, з 14,1% у 1917 годзе, да 1,9% у паваенную пару. Больш паловы гэтага спаду спрычыненая эміграцыяй. Рэшта — вынік гітлераўскага нішчэньня Жыдоў у часе апошняе сусьветнае вайны.

5. Украінцы

Украінцы, чацьвертая сяньня па лічбовай вялічыні нацыянальная меншыня на тэрыторыі Беларускае ССР, не належаць да меншыняў вялікіх лікам. Згодна з дадзенымі, апублікаванымі ў гадавіку ЦСУ на 1959 год, на тэрыторыі рэспублікі перапіс выявіў 133 000 Украінцаў, ці 1.7% усяго жыхарства.

У часе перапісу 1926 году, у межах тэрыторыі тагачаснае Беларускае ССР, за ўкраінскую сваю нацыянальнасьць падало 35 000 асоб, што складала тады 0.7% жыхарства рэспублікі. З пазьнейшым тэрытар'яльным павялі-

чэньнем Беларускае ССР шляхам далучэньня земляў былое Заходняе Беларусі, зусім зразумела, што й абсалютны лік Украінцаў мусіў на тэрыторыі рэспублікі ўзрасьці. Калі, як паказваюць лічбы апошняга перапісу, гэтая мяншыня ўзрасла адначасна й працэнтна да 1.7%, дык, трэба дапушчаць, гэта адбітак тых масавых перамяшчэньняў народаў СССР, якія апошнімі дзесяцігодзьдзямі Масква сьведама й сыстэматычна праводзіць зь яўнаю мэтаю большага іх расьцярушаньня й нацыянальнага аслабленьня. Для прыраўнаньня варта адцеміць, што жыхароў беларускае нацыянальнасьці на тэрыторыі Украінскае ССР той-жа перапіс 1959 году выявіў 291 000, ці больш як удвая ад ліку Украінцаў у Беларускай ССР. Рэлятыўна невялікі лік на тэрыторыі рэспублікі Украінцаў, народу суседняга беларускаму, сьветчыць адначасна й пра тое, што ніякае тэрытар'яльнае ўкраінскае этнічнае мяншыні ў межах Беларускае ССР ня існуе.

6. Меншыя нацыянальныя групы

У вапублікаваных ЦСУ дадзеных савецкага перапісу 1959 году, паза расейскаю, польскаю, жыдоўскаю ды ўкраінскаю мяншынях Беларусі, не даецца ніякіх лічбаў аб іншых, драбнейшых нацыянальных групах рэспублікі. Аднак-жа вялічыню агульнага іх ліку можам даведацца шляхам адняцьця сумы лічбаў жыхарства нацыянальнасьці беларускай і чатырох пералічаных вышэй нацыянальных мяншыняў, якая становіць 8 013 000 ад агульнага ліку жыхарства рэспублікі 8 055 000. Гэткім спосабам дойдзем да 42 000 астачы, лічбы, якая й ёсьць агульным лікам усіх іншых дробных нацыянальных групаў. Працэнтна яна становіць 0.5% усяго жыхарства. У часе перапісу 1926 году, у межах тагачаснае БССР, усе дробныя нацыянальныя мяншыні станавілі разам 0.8% жыхарства рэспублікі, ці на 0. 3% больш як цяпер.[84] З гэтага працэнтнага ліку 0.3% прыпадала тады на Латышоў, 0.1% на Немцаў, 0.1% на Лятувісаў, 0.1% на Татараў дый 0.2% на ўсе іншыя, яшчэ драбнейшыя лікам нацыянальнасьці.

Зь ліку вышэй названых нацыянальнасьцяў, дзеля «рэпатрыяцыі» ў Нямеччыну ў ваенныя гады, з тэрыторыі рэспублікі хіба цалкам ці блізу цалкам, зьліквідавалася нямецкая нацыянальная група. У якіх іншых групах і якія працэнтныя зьмены паўсталі за 20 міжперапісных гадоў — пакульшто няма ніякіх дадзеных. Аульна аднак-жа трэба сьцьвердзіць факт, што, як паказвае ніжэйшая працэнтная лічба дробных нацыянальнасьцяў Беларускае ССР, зазначаецца выразная тэндэнцыя іх лічбовага памяншэньня й зьніканьня, што, хіба, вынік натуральнага працэсу асыміляцыі ў пераважаючай масе іншанацыянальнага асяродзьдзя.

Сьцьверджаны апошнім перапісам ніжэйшы працэнтны лік жыхарства дробных нацыянальнасьцяў рэспублікі пацьвярджае важны факт, што насыланы ў межы рэспублікі Масквою бюракратычна-чыноўніцкі элемэнт складаецца блізу вылучна з асоб расейскае нацыянальнасьці. Калі-б гэтак ня было, дык мы мелі-б не паніжэньне, а павышэньне працэнтнае лічбы дробных нацыянальнасьцяў. Факт гэты таксама пярэчыць дапушчэньням, быццам у межы рэспублікі ў паваенныя гады было навезенае ў вялікім ліку

[84] Белорусская ССР в цифрах к 10-летию существования БССР. 1919—1929. БССР, Центральное Статистическое Управление. Минск, 1929, б. 62.

жыхарства азійскіх краінаў савецкае імпэрыі. З апублікаваных перапісных лічбаў 1959 году гэткае масавае іміграцыі на тэрыторыі рэспублікі не сьцьвярджаецца.

БЕЛАРУСЫ Ў СССР ПАЗА ТЭРЫТОРЫЯЙ БЕЛАРУСКАЕ ССР

У гадавіку ЦСУ на 1959 год пададзена, што перапіс 15 студзеня 1959 году на тэрыторыі ўсяго СССР, улучна зь Беларускаю ССР, выявіў 7 913 000 Беларусаў. Паколькі тым самым часам у межах Беларускае ССР было 6 532 000 Беларусаў, з гэтага вынікае, што паза межамі рэспублікі, у рэшце СССР, у часе перапісу знайходзілася 1 381 000 Беларусаў, ці 17,5%.

Разьмяшчэньне Беларусаў на тэрыторыі ўсяго СССР па паасобных рэспубліках, паводля дадзеных ЦСУ, у часе перапісу 1959 году было выяўлена такім, як паказана на табл. 17. На гэтай табліцы пералічаюцца толькі тыя сем рэспублікаў СССР, лікі Беларусаў у якіх апублікаваныя ЦСУ. У 8-мі іншых рэспубліках у часе перапісу было запісана Беларусаў вельмі мала, бо агульная іх сума становіць усяго 42 000.

Табл. 17: Беларусы па рэспубліках СССР паводля стану на 15 студзеня 1959 г.

Рэспублікі	Лік у тысячах	Лік у % жыхарства	У % усіх Беларусаў
СССР	7 913	3,8	100,0
Беларуская	6 532	81,1	82,5
Расейская СФСР	844	0,7	10,7
Украінская	291	0,7	3,7
Казахская	107	1,2	1,4
Латвійская	62	2,9	0,8
Лятувіская	30	1,1	0,4
Эстонская	11	0,9	0,1
Іншыя	42	—	0,5

Як раней ужо спаміналася, сталыя масавыя вывазы беларускага жыхарства з тэрыторыі свае-ж рэспублікі трываюць ужо ад самага пачатку трыццатых гадоў. Дакладней, калі адкінуць тры гады нямецкае акупацыі, яны праводзіліся на працягу 26-ці даперапісных гадоў. Калі мець наўвеце гэты факт, дык трэба прызнаць, што лік 1 361 000 Беларусаў, выяўленых быццам у СССР перапісам 1959 году паза межамі свае рэспублікі, аб'ектыўна бяручы, ня можа адказваць праўдзе. Ён павінен быць значна вышэйшы. На правільнасьць такога цьверджаньня паказвае нам і той факт, што ўжо савецкім перапісам 1926 году на тэрыторыі СССР, але паза межамі Беларускае ССР, было выяўлена 722 000 Беларусаў. З гэтага 320 000 жыло ў Сібіры, 250 000 у эўрапэйскай часьці РСФСР.[85] Ліку Беларусаў паза тэрыторыяй свае рэспублікі, выяўленага перапісам 1939 году, савецкія публікацыі не падалі.

[85] Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 года. Краткия сводки. Вып. IV. Народность и родной язык населения СССР. Москва, 1928, б. VII.

Калі ад сьцьверджанага апошнім перапісам 1 381 000 Беларусаў паза сваей рэспублікай адыймем найперш усіх Беларусаў з новадалучаных да СССР у часе вайны тэрыторыяў трох прыбалтыйскіх рэспублікаў, дый Заходняе Украіны, разам каля 175 000, а посьле ад 1 206 000 астачы адыймем яшчэ й 722 000 Беларусаў, якія жылі паза межамі БССР ужо й у 1926 годзе, дык акажыцца, што за 32 гады, ад перапісу 1926 году, нягледзячы на нясупынныя масавыя дэпартацыі Беларусаў, лік іх паза сваей рэспублікай узрос усяго на 484 000. Гэта яўная супярэчнасьць з фактамі. За 32 гады ўжо самым натуральным прыростам з 722 000 у 1926 годзе, да 1959 году, трэба было-б чакаць каля 1 206 000. Значыцца масава дэпартаваных, вывожаных, перасяляных у гэтым часе ў іншыя краі СССР Беларусаў, якіх трэба было-б спадзявацца мільёны, наагул няма — яны шчэзьлі да апошняга чалавека.

Дык лік Беларусаў паза тэрыторыяй свае рэспублікі, дадзены апошнім савецкім перапісам, яўна не згаджаецца ані зь ведамымі гістарычнымі фактамі масавых дэпартацыяў з тэрыторыі, ані з дадзенымі папярэдніх савецкіх перапісаў. Прычыны гэтага могуць быць дзьве: або значны іх лік сяньня на толькі русыфікаваўся, што ў часе перапісу яны самі запраўды падалі й сваю нацыянальнасьць, а ня толькі мову, за расейскую. Або — другая магчымасьць — перапіснымі савецкімі ворганамі тэндэнцыйна й знамерана вялікі лік Беларусаў, што жывуць цяпер за межамі свае бацькаўшчыны, быў прыпісаны да пануючае нацыянальнасьці імпэрыі — Расейцаў. Выглядае, што галоўную ролю мусіў іграць тут другі фактар, паколькі нацыянальная асыміляцыя нармальна патрабуе значна большага часу, дый звычайна не адбываецца масава на працягу ўсяго аднаго пакаленьня. Тымбольш гэтае дапушчэньне выглядае правільным дзеля таго, што рубрыкі савецкае перапіснае статыстыкі пакідаюць-жа магчымасьць падаваць сваю беларускую нацыянальнасьць і тым, што ўжо згубілі сваю беларуску мову.

У дагэтуляшніх публікацыях ЦСУ не пададзена, як разьмешчаныя па акругах, краёх ды «аўтаномных» рэспубліках РСФСР выяўленыя тамака 844 000 Беларусаў. А гэтыя лічбы маглі-б даць адказ на вельмі важнае пытаньне: куды, у якія краіны РСФСР дэпартаваныя Беларусы пераважна кіраваліся. Ужо ў часе перапісу 1926 году ў некаторых акругах Сібіру Беларусы станавілі 14-16% жыхарства. Масавыя дэпартацыі Беларусаў у гадох посьле гэтага перапісу павінны былі-б гэтыя лікі яшчэ значна павысіць. Гэты факт пацьвярджае й афіцыйны савецкі друк. Прыкладам, савецкая «вялікая» энцыкляпэдыя ў 1955 годзе пра гэта кажа: «Даволі шмат Беларусаў у Сібіры (прыкл. у Красноярскім краі)».[86]

Бяз дадзеных аб лічбовым тэрытар'яльным разьмяшчэньні Беларусаў у РСФСР немагчыма пакулыпто адказаць і на гэткія цікавыя й важныя пытаньні: якая частка Беларусаў у Сібіры й азійскіх прасторах РСФСР, а якая ў эўрапэйскіх. Якая сканцэнтраваная ў большых местах і цэнтрах імпэрыі, Маскве, Ленінградзе й іншых, а якая знайходзіцца паза меставымі й індустрыяльна-адміністрацыйнымі асяродкамі. Каб адказаць на гэтыя важныя пытаньні, давядзецца пачакаць на публікацыі лічбаў апошняга перапісу аб разьмяшчэньні жыхарства розных нацыянальнасьцяў па

[86] БСЭ, т. 37, 1955, б. 39.

акругах, местах і селішчах, калі такая публікацыя будзе калі-небудзь нагул зробленая.

Што да іншых савецкіх рэспублікаў і лічбы ў іх Беларусаў, дык трэба падчыркнуць значнейшы іх лік на сучаснай тэрыторыі Украінскае ССР — 291 000, што, выглядае, звычайны вынік праводжанага ў СССР перамешваньня жыхарства розных нацыянальнасьцяў па паасобных рэспубліках. Непраўдападобна нізкі, затое, лік Беларусаў падала ЦСУ для Казахскай ССР. Усяго 108 000 тамака, куды ўжо блізу 30 год праводзяцца індывідуальныя й масавыя ссылкі Беларусаў і Сталінам, і Хрушчовам.[87] Самою русыфікацыяй выясьніць шчэзьненьня масаў дэпартаваных у Казахстан Беларусаў немагчыма, бо на гэта быў за кароткі час. Вачавідкі маем гэтта прыклад звычайнага прыпісваньня бальшыні Беларусаў, як і іншых навезеных у Казахстан нацыянальнасьцяў, да Расейцаў не чакаючы навет на іхную русыфікацыю. На гэта паказвае й нязвычайна вялікі ўзрост Расейцаў у Казахскай ССР, дзе іх цяпер, паводля апошняга перапісу, 3 974 000 або 42.7%. У 1933 годзе Расейцаў там было толькі 1 280 000 ці 19.8%. Выходзе так, што вывозіцца ў Казахскую ССР галоўна Беларусаў, Украінцаў ды іншыя нерасейскія нацыянальнасьці, а перапіс знайходзіць тамака найбольш Расейцаў. Тое самае, што аб Казахскай ССР, можна сказаць і аб іншых азійскіх рэспубліках ды краінах СССР.

Зварачвае на сябе ўвагу й даволі малы лік Беларусаў у дзьвёх, суседніх Беларускай, прыбалтыйскіх рэспубліках — Лятувіскай і Латыскай, хоць у межы гэтых рэспублікаў уходзяць і часткі беларускае этнічнае тэрыторыі — частка Віленшчыны ў Лятувіскай ССР, Дзьвіншчына з Латгаліяй у Латвійскай ССР. У Лятувіскай ССР перапіс знайшоў усяго 30 000 Беларусаў, 1.1% усяго жыхарства, што паказвае на тое, што Беларусы Віленшчыны ў сваей масе былі запісаныя або Расейцамі або, каталікі, Палякамі. Палякоў у Лятувіскай ССР апошні перапіс падае 230 000, ці 8.5%, хоць у гадох, 1944—1947, у часе вымены жыхарства між Польшчаю й СССР, з тэрыторыі Лятувіскае ССР было ўжо пераселена, як Палякаў, 180 000 чалавек.[88]

Падобнае зусім палажэньне й у Латвійскай ССР, дзе перапіс падае 61 000 або 2.9% Беларусаў. У гэтай лічбе ўжо часткова адчуваецца існаваньне ў межах рэспублікі беларускае этнічнае тэрыторыі, хоць сама лічба й далёкая ад запраўднае. Як у Лятувіскай ССР, гэтак і ў Латвійскай, усе беларускія школы, якіх было тамака колькі дзесяткоў, савецкая расейская ўлада зьліквідавала, разам із дзьвінскаю й рыскаю беларускімі сярэднімі школамі. На іх месца адкрытыя школы расейскія.[89]

Сумуючы свой агляд лічбаў Беларусаў у СССР і Беларускай ССР на аснове публікаваных дадзеных савецкага перапісу, трэба зрабіць колькі высноваў. Найперш, трэба падчыркнуць факт, што перапіс сьцьвердзіў ня прырост, а памяншэньне агульнага ліку Беларусаў за 20 міжперапісных гадоў, памяншэньне ў вышыні 362 000, ці на 4.1%, калі за лічбу Беларусаў на пачатку 1939 году прыймем афіцыйны савецкі лік 8 275 000. Гэткі лік, як устаноўлены «па канчатковых падліках перапісу 1939 году», падае

---

[87] Genocide in the USSR. Institute for the Study of the USSR. Munich, 1958, b. 87. The Crimes of Krushchew. Part 6. Committee on Un-American Activities. House of Representatives. Washington, 1960, b. 19-24.

[88] Мікола Волаціч. Насельніцтва Заходняе Беларусі..., б. 26.

[89] Культурное строительство СССР. Москва, 1956, б. 186—187.

савецкая вялікая энцыклапэдыя.[90] Перапіс выказаў затое ўзрост лічбы Беларусаў паза тэрыторыяй сваe рэспублікі, але ў межах СССР. Але лікі перапісу яўна не адбіваюць сапраўднае сучаснае лічбовае вялічыні Беларусаў паза Беларускаю ССР. Зь лічбаў ЦСУ відаць, што апошні савецкі перапіс зарэгістраваў беларускую нацыянальнасьць толькі часткі ўсей той масы Беларусаў, што была вывезеная з тэрыторыі рэспублікі на працягу апошніх блізу 30-ці даперапісных гадоў. Бальшыня-ж іх, відаць, была прыпісаная да расейскае нацыянальнасьці. Трэба адцеміць, што факт масавага вывазу жыхарства з тэрыторыі Беларускае ССР наагул вельмі неахвотна й рэдка прызнаецца ў навуковым савецкім друку. Пераважна-ж савецкія аўтары цяперашняе большае расьцярушаньне жыхарства беларускае нацыянальнасьці паза сваею этнічнаю тэрыторыяй намагаюцца паясьняць масавымі ўцёкамі жыхарства зь Беларусі перад нямецкім наступам улетку 1941 году. Гэткае выясьненьне ня згоднае з праўдаю. Найперш, уцёкі гэтыя ня былі гэткімі масавымі. Уцякала галоўна савецкая партыйная й дзяржаўная адміністрацыя, пераважна расейскае нацыянальнасьці. Навет і Жыды ў сваей масе заставаліся на месцы, паколькі яны ня былі сьведамыя факту, што гітлераўская акупацыя нясе ім фізычнае зьнішчэньне. Аб гэтым цалком і, відаць, знамерана, праз увесь час вайны маўчала ўся савецкая прэса дый радыё.

Тая-ж частка жыхарства рэспублікі, якая й уцякла перад Немцамі, у сваей масе пазьней вярнулася на тэрыторыю Беларускае ССР назад. У выніку, уплыў уцёкаў жыхарства перад нямецкаю арміяй ня мог паважней заважыць на сучасных ліках Беларусаў паза межамі свае рэспублікі. Вялікія масы беларускага жыхарства, раськінутыя сяньня па тэрыторыі СССР, апынуліся тамака ня дзеля ўцёкаў із свае тэрыторыі, а ў выніку савецкіх дэпартацыяў і прымусовых перасяленьняў сталінскае й хрушчоўскае пары.

Для нагляднага ўсьведамленьня, якую пазыцыю па сваім ліку займаюць сяньня Беларусы сярод іншых народаў СССР, на табл. 18 пададзеныя лікі 22 большых нацыянальнасьцяў СССР, як іх падае ЦСУ на час савецкага перапісу 1959 году.[91] Разам пададзена, і які працэнт іх лічыць за родную мову — мову свае нацыянальнасьці.

З табл. 18 відаць, што нягледзячы на ўсе вялікія лічбовыя страты Беларусаў у міжперапісную пару дзеля вайны, савецкага тэрору дый русыфікацыі, беларускі народ па сваім ліку захаваў за сабою трэйцяе месца сярод іншых народаў СССР, пасьля народаў расейскага і ўкраінскага. На чацьвертым месцы за Беларусамі знайходзяцца Ўзбэкі зь лікам 6 015 000, і на пятым Татары ў ліку 4 968 000. Трэба падчыркнуць, што трэйцяе месца па сваім ліку Беларусы захавалі паміма таго, што ў тым-жа часе Беларуская ССР, як дзяржава, дзеля масавых дэпартацыяў, па ліку свайго жыхарства спала з ранейшага трэйцяга месца на месца пятае, апярэджаная ў міжперапісным часе Казахскаю й Узбэкскаю ССР.

У рубрыцы аб працэнце з роднаю моваю на табл. 18 бачым, што 84,2% усіх Беларусаў, што жылі ў часе перапісу на тэрыторыі СССР, улучна з БССР, падало за сваю родную мову мову беларускую. Да якой роднай мовы прызналася рэшта 15.8% Беларусаў, ЦСУ нічога ня кажа, хоць лёгка

[90] БСЭ, т. 50 Москва, 1957, б. 108.
[91] Народное хозяйство СССР в 1959 году, б. 13.

дагадацца, што пераважна была гэта мова расейская. ЦСУ таксама пакульшто не падало, які гэта працэнт Беларусаў прызнаецца да беларускае мовы як роднае ў межах Беларускае ССР, а які працэнт паза яе межамі. Лягічна, зразумела, трэба спадзявацца большага працэнту Беларусаў з роднаю мовою небеларускаю паза сваей рэспублікай, як у яе межах. Аднак-жа, для пацьверджаньня гэтага дапушчэньня, у дасюлешніх публікацыях ЦСУ не стае адпаведных лічбовых паказаньняў. Паводля моўнае русыфікацыі Беларусы, з захаванаю роднаю моваю ў 84.2%, займаюць сярэдняе палажэньне ў прыраўнаньні да іншых народаў СССР. Як відаць з табл. 18, найвышэйшую ступень русыфікацыі выказваюць нацыянальнасьці нетэрытар'яльныя: Жыды — усяго 21.1% з роднаю моваю, Палякі — 45.5%. З тэрытар'яльных нацыянальнасьцяў найбольш моўна русыфікаванымі аказаліся Башкіры. Зь іх толькі 61.9% захавала родную мову. Іншыя, пералічаныя ў табліцы, большыя лікам, народы СССР выказваюць значна меншую ступень русыфікацыі, а найменшую з усіх — Туркмэны, зь якіх 98,9% прызнаецца да свае мовы, як роднае.

Табл. 18: Лічбовы стан большых народаў СССР паводля перапісу 15 студзеня 1959 году

Народы	Лік у тысячах	Зь іх за родную мову падало мову свае нацыянальнасьці (у %)
Расейцы	114 114	99,8
Украінцы	37 253	87,7
Беларусы	**7 913**	**84,2**
Узбэкі	6 015	98,4
Татары	4 968	92,1
Казахі	3 622	98,4
Азарбайджанцы	2 940	97,6
Армяне	2 787	89,9
Грузіны	2 692	98,6
Лятувісы	2 326	97,8
Жыды	2 268	21,1
Малдаўцы	2 214	95,2
Немцы	1 620	75,0
Чувашы	1 470	90,8
Латышы	1 400	95,1
Таджыкі	1 397	98,1
Палякі	1 380	45,5
Мардва	1 285	78,1
Туркмэны	1 002	98,9
Башкіры	989	61,9
Эстонцы	989	95,2
Кіргізы	969	98,7
Іншыя	5 267	—
СССР	208 827	94,3

Вельмі важныя й цікавыя высновы ў гістарычнай 60-цігадовай пэрспэктыве насоўвае прыраўнаньне сучаснага ліку Беларусаў у Савецкай імпэрыі

— 7 913 000 — да такога-ж ліку з часу перапісу 1897 году. Першы перапіс Расейскае імпэрыі 1897 году, у часе якога рэгістравалася родная мова жыхарства, а не нацыянальнасьць, Беларусаў па мове запісаў 5 886 000. Лік гэты яўна не адказваў запраўднаму, дзеля таго, што ў часе перапісу жыхарства вялікае часткі бясспрэчнае беларускае моўнае тэрыторыі — Смаленшчыны, паўдзённае Пскоўшчыны, Берасьцейшчыны дый Піншчыны, у сваей масе было запісанае да жыхарства не беларускага па мове. Ці сталася гэта зь ініцыятывы перапісчыкаў, ці кіраўнікоў перапісу ў цэнтры, справа ня высьсьненая. Ведама толькі, што перапісныя лічбы «роднае мовы» мянялі й у цэнтральнай імпэрскай перапіснай установе, аб чым гэтая-ж установа сама падае ў сваім «Общим своде» ў гэткіх словах: «Дзеля таго, што рубрыка аб роднай мове пры праводжаньні перапісу мела за галоўную мэту высьсьніць акурат нацыянальнасьць жыхарства, дык у шмат якіх выпадках пры распрацоўваньні перапіснага матар'ялу было прызнана за мэтазгоднае паддаць дадзеныя азначанай рубрыкі адпаведным папраўкам, карыстаючыся пры гэтым другімі паказьнікамі й азнакамі, што былі ў тых-жа перапісных лістох».[92]

Ведамы мовавед і беларусавед Яўхім Карскі адразу-ж пасьле перапісу зрабіў папраўку перапіснага ліку 1897 году й на 1903 год устанавіў лік Беларусаў паводля мовы ў вышыні 8 318 000.[93] І карэктура Карскага ня была яшчэ поўнаю, бо ня брала на ўвагу Берасьцейшчыны й Піншчыны, але ягоны лік усё-ж быў значна бліжэйшым запраўднаму ад перапіснага ліку 1897 году. Удакладненая лічба Карскага, 8 318 000 на 1903 год, паказвае, што 6 гадоў раней, у 1897 годзе, лік Беларусаў па мове (разам зь Берасьцейшчынай і Піншчынай), быў ня меншы 8 мільёнаў. Калі гэтую лічбу прыраўнаем да афіцыйнага савецкага ліку Беларусаў «па канчатковым падліку перапісу 1939 году 8 275 000»,[94] і да ліку апошняга савецкага перапісу 1959 году ў вышыні 7 913 000 па нацыянальнасьці, а па мове ўсяго 6 663 000, дык пабачым, у якім кірунку адбываецца лічбовы «рост» беларускага народу ў складзе раней царскае, а цяпер камуністычнае Расейскае імпэрыі. Калі навет і правесьці ізноў карэктуру цяперашняга перапісу, тую-ж, якую Карскі ў 1903 годзе зрабіў для перапісу 1897 году, ды дадаць да 6 663 000 сучасных Беларусаў паводля мовы ўсё неместавое жыхарства Смаленшчыны й іншых бясспрэчна беларускіх моўных тэрыторыяў, дык і так дойдзем да ліку каля 8 мільёнаў, значыцца таго-ж ліку, што быў і шэсьцьдзесят год таму, або ў 1897 годзе.

З гэтага супастаўленьня лікаў жыхарства зь беларускаю роднаю моваю ў 1897 і 1959 гадох даводзіцца зрабіць канкрэтны высноў, што й у умовах расейскага камуністычнага ладу, як і ранейшага царскага, лічбовы рост беларускага народу ў складзе Маскоўскае імпэрыі паралiжуецца. Факт сучаснае сталае дэпартацыі зь межаў Беларускае ССР усяго натуральнага прыросту жыхарства рэспублікі сьветчыць пра тое, што паралiжаваньне лічбовага росту рэспублікі, а разам і беларускага народу расейскімі камуністычнымі валадарамі імпэрыі праводзіцца знамерана, плянова й сыстэматычна. У гэткі спосаб савецкая імпэр'яльная Масква намагаецца падсеч

[92] Общий свод по империи результатов разработки данных всеобщей переписи населения, произведенной 28 января 1897 года. Под ред. Н. А. Тройницкого. Том II, С.-Петербург, 1905, б. 1.

[93] Е. Ф. Карский. Белоруссы, т. I. Варшава, 1903, б. 189—190.

[94] БСЭ, т. 50. Москва, 1957, б. 108.

у корані магчымасьці далейшага дэмаграфічнага росту беларускага народу, наканаваўшы яго, у найлепшым выпадку, на лічбовы застой, пры аднначасным шпаркім лічбовым узросьце — і натуральным, і праз русыфікацыю нерасейскіх народаў імпэрыі, — свайго народу расейскага.

Трэба ў канцы адцеміць, што, калі-б удалося ўстанавіць і дакладны запраўдны сучасны лік Беларусаў у межах СССР, пытаньне агульнага ліку ўсіх Беларусаў сьвету гэтым яшчэ не разьвязваецца дзеля таго, што й паза межамі СССР, у сатэлітнай Польшчы, існуе яшчэ беларуская этнічная тэрыторыя. Апрача гэтага, у гэтай-жа Польшчы, у краёх Заходняе Эўропы, Паўночнае й Паўдзённае Амэрыкі, Аўстраліі, існуе сяньня вялікая лікам, старая й новая, эканамічная й палітычная, беларуская эміграцыя. Азначэньне, навет і прыблізнае, ацэначнае, сучаснага агульнага ліку гэтае эміграцыі, заданьне ня лёгкае й яно выйходзіць паза межы намечаныя для гэтае працы аб дэмаграфічных ліках датычных Беларусаў і Беларускае ССР, выяўленых у часе савецкага перапісу 1959 году.

БЕЛАРУСКАЯ ЭТНІЧНАЯ ТЭРЫТОРЫЯ Ў СССР ПАЗА МЕЖАМІ БЕЛАРУСКАЕ РЭСПУБЛІКІ

Пры разглядзе дэмаграфічных лікаў перапісу 1959 году, датычных тэрыторыі Беларускае ССР, на месцы будзе адзначыць важны факт, што сучасныя межы рэспублікі далёка не абыймаюць усяе беларускае этнічнае тэрыторыі. Вялікія яе часьці знайходзяцца паза межамі Беларускае ССР, а некаторыя навет і за межамі СССР.

Гэтак, паза БССР і СССР, а ў межах сучаснае Польшчы, Беласток зь Беласточчынай і беларускае Падляшша. Тамака цяпер існуе больш ста пачаткавых школаў беларускіх і зь беларускаю моваю, як прадметам, тры школы сярэднія, больш ста гурткоў беларускае культурна-асьветнае арганізацыі й каля ста праваслаўных прыходаў. У межах СССР, але паза тэрыторыяй Беларускае ССР, Вільня й часьць Віленшчыны. У межах Латвійскае ССР Дзьвіншчына й беларуская частка Латгаліі. Да Украінскае ССР належаць беларускія моўна часткі паўночнае Чарнігаўшчыны.

Усе пералічаныя вышэй беларускія этнічныя тэрыторыі, аднак-жа, значна меншых памераў за тыя беларускія прасторы, якія Масква прырэзала да свае расейскае рэспублікі, да РСФСР. Пра далучаныя да РСФСР беларускія этнічна землі вось што ў 1927 годзе пісала Большая Советская Энцыклопедия: «Этнаграфічная Беларусь ці прастора, на якой Беларусы становяць абсалютную або рэлятыўную бальшыню, ахоплівае, апрача Беларускае ССР, таксама некаторыя часьці РСФСР, а пайменна часткі Бранскае, Смаленскае й Пскоўскае губэрняў».[95]

На этнаграфічных і моўных картах расейскіх навукоўцаў, пачынаючы ад «Этнаграфічнае карты эўрапэйскае Расеі» Рыттыха 1875 году,[96] Смаленск і Смаленшчына, заходняя Браншчына, Невельшчына й паўдзённыя часткі Пскоўшчыны адзначаюцца як тэрыторыі бясспрэчна беларускія. Гэтак ёсьць на картах Карскага з 1903,[97] 1917 ды іншых гадоў,[98] на карце Маскоўскае

[95] БСЭ, т. 5, 1927, б. 352.

[96] А. Ф. Риттих. Этнографическая карта Европейской России. Санкт-Петербург, 1875.

[97] Е. Ф. Карский. Белоруссы, т. I. Варшава, 1903.

[98] Е. Ф. Карский. Этнографическая карта белорусского племени. Россий-

Дыялекталягічнае Камісіі 1915 году,[99] на паваенных цяперашніх картах расейскіх моваведаў Аванесава з 1949,[100] Черных[101] і Кузняцова з 1954 і пазьнейшых гадоў.[102] Тэрыторыі гэтыя былі таксама азначаныя як беларускія пастановаю І-га зьезду Камуністычнае Партыі (бальшавікоў) Беларусі з 30 сьнежня 1918 году аб межах Беларускае савецкае рэспублікі. У параграфе 4-м гэтае пастановы гаворыцца, што ў склад Беларускае рэспублікі мае ўходзіць Смаленскі «раён» разам з падраёнамі Смаленскім, Бельскім, Духаўшчынскім, Парэцкім, (Дзямідаўскім), Дарагабускім, Ельнінскім, Красінскім і Рослаўскім; «раён» Гомельскі з падраёнамі Сураскім, Мглінскім, Старадубскім; «раён» Віцебскі з падраёнамі Вялiскім, Невельскім і Себежскім.[103] Вось усе гэтыя «падраёны» свае-ж «саюзнае» Беларускае рэспублікі Масква пазьней забрала й далучыла да Расейскае СФСР.

І вось, нягледзячы на шматлікія гістарычныя, этнаграфічныя й лінгвістычныя пацьверджаньні расейскіх навукоўцаў беларускасьці гэтых прастораў, асабліва паводля мовы, і, наўсуперак факту, што тэрытарыяльная маса жыхарства гэтых прастораў і сяньня гавора пабеларуску, у часе ўсіх расейскіх перапісаў — 1897, 1926, 1939 і 1959 гадоў — жыхары гэтых тэрыторыяў і расейскімі царскімі, і расейскімі савецкімі перапішчыкамі былі заўсёды й пагалоўна запісваныя ў Расейцы ня толькі паводля нацыянальнасьці, але й паводля мовы. Дый царскі перапіс 1897 году рубрыкі нацыянальнасьці наагул ня меў, а толькі рубрыку «роднае мовы». Мовавед Карскі, на аснове расейскіх-жа афіцыйных статыстычных публікацыяў,[104] адразу-ж посьле перапісу 1897 году, у 1903 годзе, устанавіў, што ў самой Смаленскай губэрні Беларусаў было тады 947 826 чалавек.[105] Гэтую яўную супярэчнасьць і царскіх, і савецкіх расейскіх перапісаў з фактамі мовы, этнаграфіі й гісторыі, расейскія дэмографы й раней, і цяпер, абыходзяць нейк моўчкі. Хоць лічбы нацыянальнасьці й мовы апошняга савецкага перапісу па акругах і раёнах яшчэ й не апублікаваныя, але ёсьць асновы дапускаць, што дакладна тое-ж паўтарылася й у часе сучаснага перапісу, ствараючы ізноў моўна-статыстычны парадокс: рэгістрацыю ў Смаленшчыне, Браншчыне, Пскоўшчыне мільённых масаў Расейцаў з расейскаю «роднаю моваю», хоць кажнаму моваведу ведама, што масы гэтыя гавораць пабеларуску. Што гэтак сталася й цяпер, на гэта паказвае той факт, што паводля публікацыяў ЦСУ, у часе апошняга перапісу 99.8% жыхароў СССР, што запісалі сваю

ская Академия Наук. Труды Комиссии по изучению племенного состава населения Росси. Петроград, 1917. Карта гэтая была перавыдадзеная ў гадох 1918, 1920, 1921.

[99] Дурново Н. Н., Соколов Н. Н., Ушаков Д. Н. Опыт диалектологической карты русского языка в Европе, с приложением очерка русской диалектологии. Труды Московской Диалектологической Комиссии, ч. V. Москва, 1915.

[100] Р. И. Аванесов. Очерки русской диалектологии, ч. I. Москва, 1949.

[101] П. Я. Черных. Историческая грамматика русского языка. Изд. 2-ое. Москва, 1954.

[102] П. С. Кузнецов. Русская диалектология, Изд. 2-ое. Москва, 1954. Изд. 3-е. Москва, 1960.

[103] Из истории установления советской власти в Белоруссии и образования БССР. Документы и материалы по истории Белоруссии, т. IV. Институт Истории Академии Наук БССР. Минск, 1954, б. 446—447.

[104] Обзор Смоленской губернии за 1901 год. Всеподданейший доклад губернатора. Смоленск, 1901.

[105] Е. Ф. Карский. Белоруссы, т. I. Варшава, 1903, б. 190.

нацыянальнасьць як расейскую, адначасна й за сваю родную мову падалі мову расейскую.

Што да вялічыні беларускае моўна-этнічнае тэрыторыі, дык «Большая советская энциклопедия» ў 1927 годзе азначала яе на 317 000 кв. км.,[106] з чаго відаць, што ў межах сучаснае Беларускае ССР з паверхняю 207 600 кв. км. знайходзіцца прыблізна толькі 2/3 беларускае этнічнае тэрыторыі. Дый на сьцьверджаньні факту існаваньня вялікіх беларускіх этнічна-моўных прастораў у межах РСФСР, пытаньне вялічыні беларускае нацыянальнае тэрыторыі яшчэ ня вычэрпваецца. Як першы раз было паказана на карце Маскоўскае Дыялекталягічнае Камісіі 1915 году,[107] а пазьней удакладнена на ўспомненых сучасных моўных картах Аванесава,[108] Черных,[109] Кузнецова,[110] за такімі чыста беларускімі з моўнага гледзішча прасторамі, як Смаленшчына, не пачынаецца яшчэ расейская этнічна-моўная тэрыторыя, бо між беларускімі й расейскімі моўнымі прасторамі існуе й на ўсходзе, і на поўначы яшчэ шырокая паласа г. зв. пераходных беларуска-расейскіх гаворак. Тэрыторыя гэтых пераходных гаворак цягнецца ўздоўж Смаленшчыны на ўсходзе, а на поўначы яна займае значную частку Пскоўшчыны з Псковам. Гэтыя «пераходныя» моўна прасторы паўсталі шляхам шматвяковых моўных расейскіх наслаеньняў на старой мясцовай беларускай мове. Дык моўная аснова ўсіх гэтых пераходных гаворак беларуская. З моўнага гледзішча прасторы гэтыя й сяньня ня менш беларускія, як расейскія. Дзеля гэтага й сучасныя, раней спамінаныя, расейскія мовазеды на сваіх дыялекталягічных картах землі гэтыя ня ўлучаюць у моўную тэрыторыю расейскую, а пакідаюць іх між беларускімі й расейскімі моўнымі прасторамі.

Аб беларускасьці «пераходных» моўных прастораў тая-ж «Большая советская энцыклопедия» 1927 году падавала: «...беларускія па аснове дыялекты пашыраныя й далей на ўсход ... у большай, паўдзённа-заходняй часьці Калужскай губэрні ... Беларускі ўплыў ... блізу ўва ўсей Пскоўскай губэрні (за выняткам Порхаўскага павету) і паўдзённа-заходняй часьці Цьверскае, і навет у паўдзённай памежнай паласе Ленінградзкае губэрні ...» (б. 352). Па сваей вялічыні гэтыя, пераходныя моўна, беларускія палосы даволі значныя. Іхная агульная паверхня дасягае каля 160 000 кв. км. Вось і гэтыя ўсе прасторы, якія й паважнейшыя расейскія мовазеды на сваіх картах да расейскага моўнага абшару не залічаюць, у часе ўсіх расейскіх перапісаў — і царскіх, і савецкіх, — падаюцца таксама за чыста расейскія ня толькі паводля нацыянальнасьці, але й паводля мовы.

На табл. 20 пададзенае, у квадратных кілямэтрах і мілях, супастаўленьне паверхні трох тэрытарыяльных прастораў: Беларускае ССР, беларускае чыстае моўнае тэрыторыі й усяго беларускага моўнага абшару, разам з гаворкамі пераходнымі. Адначасна падаецца й жыхарства гэтых тэрыторыяў на пачатак 1959 году, у мільёнах. Лікі жыхарства прастораў чыстага моўнага й усяго, разам зь пераходнымі гаворкамі, пададзеныя ацэначныя, прыблізныя, паколькі дагэтуляшнія публікацыі ЦСУ даюць перапісныя лічбы

---

[106] БСЭ, т. 5. 1927, б. 352

[107] Дурново Н. Н., Соколов Н. Н., Ушаков Д. Н. Опыт диалектологической карты русского языка в Европе, с приложением очерка русской диалектологии. Труды Московской Диалектологической Комиссии, ч. V. Москва 1915.

[108] Р. И. Аванесов. Очерки русской диалектологии, ч. I. Москва, 1949.

[109] П. Я. Черных. Историческая грамматика русского языка.

[110] П. С. Кузнецов. Русская диалектология.

жыхарства толькі па акругах, што не дае магчымасьці больш дакладнага азначэньня лікаў жыхарства дадзеных прастораў.

Табл. 20: Паверхня й жыхарства тэрыторыі Беларускае ССР, тэрыторыі беларускае чыстае мовы й беларускае моўнае прасторы з гаворкамі пераходнымі, у пачатку 1959 году

	Паверхня ў кв. км.	Паверхня ў кв. мілях	Жыхарства ў мільёнах
Беларуская ССР	207 600	80 200	8
Прастора беларускае чыстае мовы	320 000	120 000	12*)
Прастора беларускае мовы з гаворкамі пераходнымі	480 000	180 000	18*)

Зь лічбаў табл. 20 выяўляецца схэматычнае правіла: Беларуская ССР у сваіх межах абыймае толькі 2/3 тэрыторыі чыстае беларускае мовы, якая із свайго боку, становіць усяго каля 2/3 вялічыні ўсяго беларускага моўнага абшару, разам з гаворкамі пераходнымі. Паверхня тэрыторыі беларускае чыстае мовы на табліцы закругленая з 317 000, да 320 000 кв. км., на тэй аснове, што савецкая энцыкляпэдыя 1927 году сваімі этнаграфічнымі межамі Беларусі на захадзе не ахапіла забужанскага куска беларускае этнічна зямлі ў Белападляскім павеце.

На беларускай моўна-этнічнай тэрыторыі, што сяньня ў СССР, але паза межамі Беларускае ССР, знайходзяцца гэткія большыя месты: Вільня з жыхарствам на 15 студзеня 1959 году 236 000, Бранск 207 000, Смаленск 147 000, Чарнігаў 90 000, Пскоў 81 000, Дзьвінск 65 000, Вялікія Лукі 59 000. Зь іх Вільня ў Лятувіскай ССР, Дзьвінск у Латвійскай, Чарнігаў у Украінскай. Усе іншыя, пералічаныя вышэй, месты, сяньня ў межах Расейскае СФСР. Паза тэрыторыяй СССР, хоць таксама на беларускім этнічна-моўным прасторы, знайходзіцца Беласток, места, якое цяпер у межах сатэлітнае Польшчы, і якое на пачатку 1959 году мела 116 600 жыхароў.[111]

На аснове, хай сабе й прыблізных, ацэначных лікаў сучаснага жыхарства беларускае этнічна-моўнае тэрыторыі, можна зрабіць спробу азначыць і ўвесь дэмаграфічны дэфіцыт усяе беларускае нацыянальнае тэрыторыі ў 20-цігоднім міжперапісным часе. Хоць паверхня ўсіх трох тэрыторыяў была аднолькава абнятая дэструкцыйнымі дзеяньнямі Другое Сусьветнае Вайны й савецкім масавым тэрорам ды дэпартацыямі, ды, для дакладнейшага азначэньня недаліку тамака жыхарства за міжперапісны пэрыяд, трэба ўзяць на ўвагу й некаторыя іх спэцыфічныя рэгіянальныя дэмаграфічныя адрознасьці, дый, пры абліку ваеннага й неваеннага дэмаграфічнага дэфіцыту, парабіць адпаведныя карэктуры. Гэтак, Смаленшчына, Браншчына, Пскоўшчына, дый усе пераходныя моўныя тэрыторыі, за часоў царскага рэжыму ў імпэрыі знайходзіліся паза жыдоўскаю «чертой оседлости». Дзеля гэтага лік жыдоўскага жыхарства на гэтых тэрыторыях і на пачатку Другое Сусьветнае Вайны быў невялікі. У выніку, гітлераўскія нішчэньні Жыдоў на гэтых прасторах у часе вайны не маглі спрычыніць гэткіх высокіх лічбовых стратаў жыхарства, як на прасторы Беларускае ССР, дзе страты жыдоўскія становяць 1/3 усіх ваенных стратаў.

*) Лікі ацэначныя.

[111] Mały rocznik statystyczny 1960. Główny Urząd Statystyczny Polskiej Rzeczpospolitej Ludowej. Warszawa, 1960, b. 10.

Другі важны мамэнт, на які трэба мець увагу пры азначэньні дэмаграфічных стратаў неваеннага ўжо паходжаньня, гэта тое, што дзеля свайго геаграфічнага палажэньня із Смаленшчыны дый усіх беларускіх пrастораў гаворак пераходных жыхарства ня мела магчымасьці для масавых уцёкаў на захад перад наступам савецкіх арміяў, як гэта было на тэрыторыі Беларускае ССР, а асабліва тэрыторыі былое Заходняе Беларусі. Дзеля гэтага гэтыя тэрыторыі ня мелі й стратаў жыхарства дзеля масавае палітычнае эміграцыі-ўцёкаў на захад. Вось, улічаючы гэтыя мамэнты, ацэначныя лікі ваенных, неваенных і агульных дэмаграфічных стратаў для трох тэрыторыяў — Беларускае ССР, беларускае чыстае моўнае прасторы й моўнае прасторы зь беларускімі гаворкамі пераходнымі — выглядалі-б так, як паказана на табл. 21.

Табл. 21: Дэмаргафічныя страты жыхарства за гады 1939—1959 на тэрыторыях Беларускае ССР, беларускае чыстае мовы, і беларускае мовы з гаворкамі пераходнымі.

Дэмаграфічныя страты	Тэрыторыя Беларускае ССР	Тэрыторыя беларускае мовы	Моўная тэрыторыя з гаворкамі пераходнымі
Ваенныя	2 000 000	2 750 000	3 750 000
Неваенныя	4 045 000	5 170 000	7 420 000
Усяго	6 045 000	7 920 000	11 170 000

Лікі табл. 21, зразумела, маюць характар лікаў ацэначных, прыблізных. Як доўга дасьледнікам будуць недаступныя канкрэтныя лічбовыя дадзеныя пра ваенныя й неваенныя страты жыхасртва рэспублікі, пра натуральны рух гэтага жыхарства і пра дэтальнейшыя лікі апошняга перапісу на вышэй названых трох тэрытарыяльных вялічынях, датуль будзе немагчымае больш дакладнае азначэньне дэмаграфічных стратаў гэтых тэрыторыяў. Агульна бяручы, аднак-жа лікі гэтыя правільна паказваюць памеры таго вялізарнага дэмаграфічнага дэфіцыту, які беларуская нацыянальная тэрыторыя дазнала ў часе дваццаці міжперапісных гадоў.

Помніць яшчэ трэба, што ўсе ацэначныя лікі стратаў жыхарства на табліцы даюць толькі страты дваццацігодняе міжперапіснае пары, а не абыймаюць усіх стратаў жыхарства тэрыторыі за ўвесь час панаваньня на ёй расейскага савецкага рэжыму. Для азначэньня стратаў жыхарства беларускае тэрыторыі за ўвесь савецкі час, трэба, найперш, дадаць дэмаграфічны недалік міжперапіснага часу 1926—1939 гадоў, які для тэрыторыі тагачаснае БССР ў гэтай працы раней ужо быў аблічаны на 763 000. Калі ў тэй-жа прапорцыі аблічым дэмаграфічны дэфіцыт для тэрыторыяў чыстае беларускае мовы, вышыні 1 017 000, і беларускае мовы разам з гаворкамі пераходнымі, у вышыні 1 589 000, дык для трох розных тэрыторыяў у часе 1926—1959 адпаведныя лікі дэмаграфічнага дэфіцыту будуць выражацца лічбамі: БССР — 6 808 000, прастора чыстае беларускае мовы 8 937 000 і беларуская мова разам зь пераходнымі гаворкамі — 12 759 000.

ВЫСНАВЫ

Перад пераходам да абагульненьняў і выснаваў, найперш важна адказаць на пытаньне: ці і на колькі апублікаваныя ЦСУ дадзеныя перапісу 1959 году аб Беларускай ССР, асабліва ў галіне нацыянальнага яе складу,

і лічбы Беларусаў на тэрыторыі ўсяго СССР, адбіваюць запраўдны стан? На аснове папярэдняга аналізу вынікаў перапісу на гэтае пытаньне прыходзіцца даць два розныя адказы: іншы для дадзеных датычных тэрыторыі Беларускае рэспублікі, іншыя для ліку Баларусаў у іншых рэспубліках СССР.

Калі ходзіць аб перапісныя лікі Беларускае рэспублікі паводля нацыянальнасьці, дык із супастаўленьня іх зь існуючымі папярэднімі перапіснымі й няперапіснымі дадзенымі, зь ведамымі гістарычнымі падзеямі й фактамі міжперапісных гадоў, даводзіцца дайсьці да адказу, што апублікаваныя ЦСУ лічбы, агульна бяручы, могуць прыблізна адказваць запраўднаму стану. Для правільнейшае ацэны іх значэньня трэба мець, аднак-жа, наўвеце дзьве паважнейшыя засьцярогі.

Найперш, трэба помніць, што перапіс праводзіўся ў пару, калі ў СССР ад дзесяткоў ужо год, праз магутны апарат партыйнае прапаганды, Масква праводзіць нясупынную глёрыфікацыю свайго «вялікага рускага народу», расейскае мовы, культуры дый наагул усяго расейскага. Адначасна існуе яўная й сыстэматычная тэндэнцыя абсаджваць Расейцамі ўсе важнейшыя кіруючыя палітычна-адміністрацыйныя й гаспадарчыя становішчы ў нерасейскіх рэспубліках імпэрыі. У гэтай атмасфэры нацыянальнае няроўнасьці й назольлівых хваласьпеваў усяму, што расейскае, зусім натуральна, што некаторая частка жыхарства нерасейскіх народаў, зь мяркаваньняў асабістае кар'еры й лепшае матар'яльнае сабе пэрспэктывы, намагаецца «прытарнавацца» да палітычнага палажэньня ў гэткі спосаб, што заміж свае запраўднае нацыянальнасьці, падае нацыянальнасьць народу пануючага ў імпэрыі, расейскую. Рэч пэўная, што калі-б перапіс праводзіўся пры палітычнай атмасфэры запраўднае роўнасьці ўсіх народаў СССР, лікі жыхарства народаў нерасейскіх выпалі-б істотна вышшымі, а лік расейскага — адпаведна ніжшым.

Другая засьцярога датычыцца лічбы польскае нацыянальнае меншыні ў рэспубліцы, якая ў перапісе бясспрэчна выпала значна вышэйшаю ад запраўднае дзеля тае прычыны, што ў дадзеных палітычных умовах частка беларускага сялянства каталіцкага веравызнаньня — паводля ацэны аўтара каля 300 000 — падала сваю нцыянальнасьць за польскую, на аснове старога на тэрыторыі палітычна-прапаганднага прынцыпу: «каталіцкая вера — польская вера». Гэтае пытаньне шырэй разгледжанае ў разьдзеле аб польскай нацыянальнай меншыні на тэрыторыі рэспублікі.

Вось, улічаючы гэтыя засьцярогі, наагул трэба ўважаць апублікаваныя ЦСУ лічбы перапісу для тэрыторыі Беларускае ССР за прыблізна адказваючыя запраўднаму сучаснаму стану. Затое зусім адваротныя высновы трэба зрабіць з аналізы лічбаў перапісу аб ліку Беларусаў на прасторы СССР паза межамі Беларускае рэспублікі. Пры ведамых масавых дэпартацыях і вывазах на перасяленьні, якія праводзіліся з тэрыторыі Беларускае ССР ад пачатку 1930-х год, дый бяручы на ўвагу, што ў часе перапісу 1926 году за межамі рэспублікі, але на тэрыторыі СССР, было выяўлена 722 000 Беларусаў, лічба апублікаваная ЦСУ з апошняга перапісу — 1 381 000 — аніяк ня можа адказваць праўдзе. Калі навет мець наўвеце, што значны лік дэпартаваных у Сталінскую пару пагінуў па канцэнтрацыйных лягерах, дык усё-ж цяперашняя перапісная лічба Беларусаў паза межамі свае рэспублікі станоўка ня можа адбіваць запраўднасьці. Вывезеныя ў пару дыктатуры Сталіна, а асабліва Хрушчова, не маглі гэтак хут-

ка дэнацыяналізавацца й русыфікавацца. Пры тым, калі-б яны навет і пасьпелі згубіць сваю беларускую мову, рубрыкі перапісу давалі-ж ім магчымасьць падаваць і далей сваю нацыянальнасьць, побач расейскае мовы як роднае. Дый само паймо «родная мова», дакладна бяручы, можа тарнавацца да той толькі мовы, якою чалавек карыстаўся з свайго маленства, а не да мовы пазьней набытае.

Гэтыя ўсе мяркаваньні змушаюць зрабіць выснаў, што ў часе апошняга савецкага перапісу вялікія масы Беларусаў паза тэрыторыяй рэспублікі знамерана былі запісаныя ў Расейцы й па нацыянальнасьці, і па мове, для хутчэйшага павялічэньня ліку жыхарства пануючае расейскае нацыянальнасьці, коштам нерасейскіх, дзеля чаго прымусовыя масавыя перасяленьні ў СССР, між іншым, і праводзяцца. Што гэткія, а ня іншыя намеры Масквы, відаць гэта й з таго, што пераселеным у Казахстан, Краснаярскі край ці іншыя краіны савецкае Азіі й Эўропы, Беларусам, Украінцам ды іншым не дазволена мець тамака свае нацыянальныя арганізацыі, свае школы, сваей прэсы, свайго друку й наагул якіх-небудзь формаў свайго культурна-нацыянальнага жыцьця. Адразу-ж пасьля перасяленьня ўсім ім накідаецца расейская мова.

Другі яскравы факт, які пацьвярджае нязгоднасьць з запраўднасьцяй перапісных лічбаў Беларусаў паза тэрыторыяй Беларускае ССР, гэта яўнае запісваньне ўсіх Беларусаў Беларускае этнічнае тэрыторыі, што сяньня ў межах РСФСР, прыкладам Смаленшчыны, Расейцамі ня толькі па нацыянальнасьці, але й па мове, хоць усе — і царскія, і савецкія, — расейскія аўтары-моваведы сьцьвярджаюць факт, што мова Смаленшчыны — мова беларуская. З усяго гэтага відаць, што апублікаваная ЦСУ лікі жыхароў беларускае нацыянальнасьці перапісу 1959 году не адказваюць праўдзе, бо не падаюць у паўніні ліку дэпартаваных Беларусаў, Беларусаў беларускае этнічнае тэрыторыі ў РСФСР і Беларусаў тых, што жылі на прасторы Савецкае імпэрыі, а паза межамі свае рэспублікі, ужо ў часе перапісу 1926 году.

Пераходзячы да нацыянальнага складу жыхарства рэспублікі, трэба падчыркнуць, што найбольшыя зьмены, якія перапіс у гэтай галіне выявіў, датычацца зьменаў у лічбовым стане жыхарства нацыянальнасьці жыдоўскае й расейскае. У выніку, жыдоўская мяншыня лікам сваім спала з ранейшага першага месца на месца трэйцяе. Расейская-ж із свайго даваеннага месца трэйцяга, высунулася на месца першае. Польская-ж мяншыня, хоць і панесла значныя лічбовыя страты, усё-ж здолела захаваць сваю ранейшую пазыцыю другое па ліку нацыянальнае мяншыні.

Вялікі лічбовы спад жыхарства жыдоўскае нацыянальнасьці, гэта галоўна вынік нішчэньняў жыдоўскага жыхарства ў часе апошняе вайны гітлероўскімі акупацыйнымі ворганамі. У значна меншай меры спад гэты спрычынены эміграцыяй жыдоўскага жыхарства з тэрыторыі Беларусі. Вялікі-ж лічбовы ўзрост расейскае нацыянальнае мяншыні на тэрыторыі паўстаў у выніку бюракратычна-чынавецкае калянізацыі Беларусі, праводжанае Масквою плянава й сыстэматычна з мэтаю замацаваньня каляніяльнае ад сябе залежнасьці рэспублікі, яе нацыянальнага паслабленьня й прысьпяшэньня яе русыфікацыі. Зь лічбаў перапісу вынікае, што тэмпа расейскае калянізацыі рэспублікі ў паваенныя гады выражаецца сярэдняю гадавою лічбаю 15 000 чалавек. Гэткі гадавы каафіцыент сучаснае расейскае калянізацыі Беларусі.

Разам зь вялікімі зьменамі ў нацыянальным складзе жыхарства Беларускае ССР у міжперапісным пэрыядзе, зайшлі, зразумела, і немалыя зьмены ў складзе рэлігійным. Нажаль аб гэтым зь перапісу нічога ня можна даведацца дзеля тае прычыны, што савецкія перапісы веравызнаньня жыхарства не рэгіструюць. Улічаючы, аднак-жа, вялікае памяншэньне ліку жыхарства жыдоўскае нацыянальнасьці й веры, трэба ўважаць, што сучасны склад жыхарства рэспублікі па веравызнаньні павінен прыблізна выражацца гэткімі працэнтнымі вялічынямі: праваслаўных 75%, каталікоў 20%, Жыдоў 2%, іншых 3%. Перад апошняю сусьветнаю вайною склад жыхарства па веравызнаньні на той-жа тэрыторыі выглядаў прыблізна гэтак: праваслаўных 70%, каталікоў 20%, Жыдоў 8%, іншых 2%. Удзельная вага праваслаўных мусіла цяпер узрасьці дзеля вялікага спаду ліку жыхасртва іншых веравызнаньняў, галоўна жыдоўскага. Судзячы з прэсы БССР, у паваенную пару на тэрыторыі рэспублікі моцна лічбова ўзрасьлі драбнейшыя пратэстанцкія веравызнаньні — баптыстыя, сёмушнікі, мэтадыстыя, сьветкі Яговы й іншыя.

Неправоджаньне ніякое перапіснае рэгістрацыі па веравызнаньні ў СССР і прасьлед рэлігіі даводзяць да таго, што й кіраўнічыя партыйныя вярхі імпэрыі сяньня вельмі недакладна зар'ентаваныя ў веравызнавальным складзе жыхарства паасобных рэспублікаў ці нацыянальнасьцяў. Прыкладам гэтага можа служыць такая інфармацыя ў савецкай «вялікай» энцыкляпэдыі з 1957 году: «Па афіцыйным веравызнаньні бальшыня Расейцаў, Украінцаў і Беларусаў належала да праваслаўнай царквы, **частка заходніх** Украінцаў і **Беларусаў — да уніяцкае.**[112] Фактам-жа ёсьць, насуперак сказанаму, што ніякога паважнейшага ліку Беларусаў прыналежных да ўніяцкае царквы ня існуе. Ёсьць затое мільёны Беларусаў каталікоў, пра якіх рэдактары энцыкляпэдыі, відаць, нічога ня чулі.

Дый, гаворачы пра веравызнаньні на тэрыторыі сучаснае Беларускае ССР, трэба ўсьведаміць, што ў умовах войстрага камуністычнага прасьледу рэлігіі, закрываньня й нішчэньня цэркваў, інтэнсыўнае бязбожніцкае прапаганды й атэістычнага школьнага ўзгадаваньня моладзі, якія на бальшыні тэрыторыі рэспублікі праводзяцца на працягу болей 40-ка год, старыя поймы пра веравызнаньне й царкоўную прыналежнасьць сяньня наагул вельмі праблематычныя. У шмат якіх выпадках гэта ўжо больш традыцыя паходжаньня зь сям'і таго ці іншага веравызнаньня, як сучаснае прызнаваньне да яго.

Пераходзячы да агульнага ліку жыхарства Беларускае ССР, выяўленага перапісам у вышыні 8 055 000, трэба найперш падчыркнуць факт ня росту, павялічэньня жыхарства рэспублікі, а яго спаду, памяншэньня на 1 289 000 чалавек з 9 344 000 на пачатку 1939 году. Па стратах свайго жыхарства тэрыторыя Беларускае ССР за 20 міжперапісных гадоў выяўляе найвышэйшы працэнт дэмаграфічнага недаліку сярод усіх іншых рэспублікаў ССР. Агульная лічба дэмаграфічнага дэфіцыту за міжперапісны пэрыяд перавышае 6 мільёнаў. Нягледзячы на частыя войны на тэрыторыі гісторыя Беларусі апошніх стагодзьдзяў ня знае гэткіх вялікіх стратаў жыхарства ў гэткім кароткім адрэзку часу. Характэрна таксама, што толькі адна траціна дэмаграфічнага недаліку рэспублікі, 2 000 000, прыпадае на страты спрычыненыя Другою Сусьветнаю Вайною. Рэшта стратаў — 4 000 000 — гэта бес-

---

112 БСЭ, т. 50. 1957, б. 108.

пасярэдні ці пасярэдні вынік расейска-камуністычнага каляніяльнага гаспадараньня на землях беларускае рэспублікі на працягу 20-ці міжперапісных гадоў.

Гаворачы аб стратах ваенных, трэба адцеміць гэткі важны факт: імпэр'яльная Масква свае расейскія землі здолела акружыць паласою нерасейскіх краёў і народаў. У выніку, ваенныя зьнішчэньні заўсёды ў першую чаргу й найбольш кранаюць памежныя, ахопленыя ваеннымі дзеяньнямі, народы імпэрыі, а значна менш цэнтральна й стратэгічна выгадна паложаную Расею й расейскі народ. Гэтак і ў часе апошняе сусьветнае вайны расейская нацыянальная тэрыторыя ваеннымі дзеяньнямі была беспасярэдня закранутая толькі часткова, а тымчасам тэрыторыі ўсіх заходніх рэспублікаў імпэрыі, і асабліва Беларусі, былі гадамі й цалком ахопленыя зьнішчальнымі ваеннымі дзеяньнямі. У гэткі спосаб кажная падобная вайна аўтаматычна наносіць куды большыя зьнішчэньні й страты сярод жыхарства закранутых вайною нерасейскіх «акраінных» народаў імпэрыі, як сярод жыхарства цэнтральна паложанага народу расейскага, і ў выніку дае прапарцыянальны ўзрост лічбовае сілы пануючага расейскага народу, а разам спад ахопленых вайною народаў нерасейскіх.

Неваенныя страты жыхарства рэспублікі, спрычыненыя Сталінскім палітычным тэрорам і дэпартацыямі, наносяцца й далей акцыяй сталага масавага перасяляньня жыхарства зь Беларускае ССР. Існуюць дадзеныя, якія пазваляюць зрабіць і прыблізную ацэну гадавое раты вывазаў жыхарства з рэспублікі ў паваенныя перадперапісныя гады, у пару Хрушчоўскае дыктатуры. Гэтак, у статыстычным зборніку ЦСУ з 1956 году,[113] пададзеныя савецкія ацэначныя лікі жыхарства паасобных рэспублікаў СССР паводля стану на красавік 1956 году. Хоць гэтыя лікі й ня перапіснага паходжаньня, але ў гэткай татальна дзяржаўна кіраванай сыстэме, як савецкая, дзе ўсё на ўліку, яны звычайна даволі дакладна адбіваюць запраўдны стан, калі толькі не праводзіцца нейкіх знамераных дэфармацыяў для адмысловых прапагандных мэтаў. Як савецкі ўсесаюзны перапіс тры гады пазьней паказаў, ацэначныя лікі ЦСУ жыхарства паасобных рэспублікаў, як і цэлага СССР, былі даволі дакладныя й адказвалі тагачаснаму стану.

На табл. 22 пададзеныя ў супастаўленьні ацэначныя лікі ЦСУ жыхарства паасобных рэспублікаў СССР на красавік 1956 году, і, побач, лікі жыхарства ўстаноўленыя тры гады пазьней, падчас перапісу 1959 году.

З прыраўнаньня лікаў паводля ацэны ЦСУ на 1956 год да лікаў атрыманых шляхам перапісу блізу тры гады пазьней можна дайсьці да выснаву, што ацэначныя лікі ЦСУ на 1956 год былі вельмі блізкімі да запраўдных. Перапіс 1959 году пераважна ўсюдых выявіў адпаведны прырост жыхарства на паасобных рэспубліках: большы ад нармальнага там, куды кіраваліся гэтым часам масы перасяленцаў, прыкладам у Казахскай і Узбэкскай рэспубліках, меншы ў тых, скуль гэтыя вывазы пераважна праводзіліся — Беларускай, Украінскай ССР, рэспублік прыбалтыйскіх.

Лік жыхарства Беларускае ССР у 1956 годзе ЦСУ ацаніла на 8 мільёнаў. У часе перапісу, блізу тры гады пазьней, жыхарства рэспублікі было большым усяго на 55 000 чалавек, што дае гадавую рату прыросту ўсяго 19 000. Як у разьдзеле пра расейскую нацыянальную мяншыню ў Беларускай рэспубліцы было ўжо выяўлена, гадавы каафіцыент расейскае іміграцыі ў ме-

[113] Народное хозяйство СССР в 1956 году. б. 18.

жы Беларускае ССР у паваенныя гады сярэдня роўны 15 000 чалавек. Гэта значыць, што й гэты мізэрны прырост жыхарства рэспублікі — 55 000 у тры гады — паясьняецца лічбаю насыланых у межы рэспублікі кадраў савецкае кіраўнічае адміністрацыі й іхных сем'яў, асоб расейскае нацыянальнасьці. З гэтага можа быць толькі адзін лягічны высноў, што ў 1956—1958 гадох зь межаў Беларускае ССР савецкімі масавымі вывазамі на перасяленьні забіраўся дакладна ўвесь натуральны прырост жыхарства рэспублікі.

Табл. 22: Лікі жыхарства рэспублікаў СССР у 1956 і 1959

Рэспублікі	Лікі жыхарства ў мільёнах Ацэна ЦСУ на красавік 1956	Перапіс 15. 1. 1959
СССР	200,2	208,8
Расейская СФСР	113,2	117,5
Украінская	40,6	41,9
Беларуская	8,0	**8,1**
Узбэкская	7,3	8,1
Казахская	8,5	9,3
Грузінская	4 0	4,0
Азэрбайджанская	3,4	3,7
Лятувіская	2,7	2,7
Малдаўская	2,7	2,9
Латвійская	2,0	2,1
Кіргіская	1,9	2,1
Таджыкская	1,8	2,0
Армянская	1,6	1,8
Туркмэнская	1,4	1,5
Эстонская	1,1	1,2

Бліжэй азначыць лічбу натуральнага прыросту жыхарства Беларускае ССР у гадох 1956—1958 у ліках абсалютных справа ня лёгкая, дзеля таго, што савецкія афіцыйныя дзейнікі знамерана ня публікуюць ніякіх лічбаў натуральнага руху жыхарства рэспублікі праз усе паваенныя гады. ЦСУ падае толькі лічбы сярэднія натуральнага руху жыхарства для ўсяго СССР, а не для паасобных рэспублікаў. Сярэдняя-ж гадавая лічба натуральнага прыросту для ўсяго СССР у гадох 1956—1958, паводля публікацыяў ЦСУ, была 17,8 на 1000. Калі-б гэтая лічба адказвала прыблізна сучаснаму натуральнаму гадавому прыросту й для тэрыторыі Беларускае ССР, дык за тры няпоўныя гады — ад красавіка 1956 году да 15 студзеня 1959 году — сума агульнага натуральнага прыросту была-б роўнаю 396 000, ці па 142 000 у год. Вось 142 000 чалавек — гэта й ёсьць прыблізная лічбовая вышыня гадавых вывазаў жыхарства рэспублікі. Гэтая лічба, ці лічба крыху й ніжэйшая, але ей блізкая, гэта гадавы каафіцыент дэпапуляцыі Беларусі, што праводзіцца сыстэматычна Масквою ў пару дыктатуры Хрушчова. Сталае забіраньне зь межаў рэспублікі жыхарства ў вышыні ўсяго яе натуральнага прыросту ня толькі параліжуе дэмаграфічны рост рэспублікі. Дэпапуляцыя, бясспрэчна, адбіваецца й на гаспадарчым, культурным і нацыянальным жыцьці Беларусі. Коратка гэтта зьвернем увагу толькі на некаторыя важнейшыя аспэкты й вынікі сыстэматычнага вылюдненьня Беларускае ССР.

Найперш, у выніку вялікіх дэмаграфічных стратаў за час 20-ці міжперапісных гадоў, Беларуская ССР па ліку свайго жыхарства спала з ранейшага трэйцяга месца сярод рэспублікаў СССР на пятае. Разам з памяншэньнем ліку жыхарства, зразумела, падае й гаспадарчы, палітычны й нацыянальны патэнцыял рэспублікі дый яе рэлятыўная вага ў складзе Савецкае імпэрыі.

Вынік дэпапуляцыяў і сталыя адміністрацыйныя перадзелы рэспублікі зь ліквідацыяй акруговых, раённых і сельсаветных адміністрацыйных адзінак: менш жыхароў — менш акругаў і раёнаў. Вынікам спаду ліку жыхарства рэспублікі й паралізаваньня вывазамі далейшага дэмаграфічнага росту ёсьць і рэлятыўна павольнае тэмпа індустрыялізацыі й урбанізацыі рэспублікі. Беларуская ССР у часе перапісу 1959 году мела найніжэйшы працэнт меставога жыхарства ад усіх, за выняткам Малдаўскае, савецкіх рэспублікаў. У дзяржаве такое татальнае цэнтралізацыі, як Савецкая імпэрыя, дзе разьвіцьцё найменшае галіны народнае гаспадаркі й промыслу кажнае рэспублікі плянуецца й рэгулюецца зь імпэр'яльнага цэнтру, Масквы, такое павольнае тэмпа індустрыялізацыі й урбанізацыі сьветчыць аб знамераным тармажэньні разьвіцьця промыслу й эканомікі Беларусі зь яўнаю мэтаю дастаць у гэткі спосаб у сваё свабоднае распараджэньне мільённыя рэсурсы беларускага працоўнага жыхарства для прымусовых вывазаў-перасяленьняў у менш заселеныя й гаспадарча разьвітыя краі імпэрыі ў Эўропе й Азіі.

У выніку сыстэматычных вывазаў жыхарства Беларускае ССР у рэспубліцы адчуваецца й хранічная нястача працоўных рук, якая нарастае няраз да крытычнага палажэньня, загражаючы катастрофаю народнай гаспадаркі, асабліва ў галіне земляробства. Для прыкладу, у 1957 годзе, пасьля 4-х год асабліва інтэнсыўных Хрушчоўскіх вывазаў жыхарства Беларусі на «асваеньне цаліны» й засяляньня Сібіру, у калгасах Беларускае ССР дайшло да гэткае войстрае нястачы працоўных рук, што ў канцы жніўеня, калі нармальна ў Беларусі ўсе ўраджаі ўжо сабраныя, больш паловы сьпелых збажжовых культураў знайходзілася яшчэ на калгасных палёх, гніло на дажджы, а вялікая частка была ўжо наагул страчаная. Пры гэткім грозным для харчаваньня рэспублікі й дзяржаўных даставак палажэньні ў Менску давялося склікаць экстранае паседжаньне савету міністраў рэспублікі й ЦК Камуністычнае партыі БССР, якое выдала надзвычайныя загады аб мабілізацыі жыхарства для збору гінучых ураджаяў. Пастановы й мерапрыемствы гэтага паседжаньня верхавіны каляніяльнае ўлады рэспублікі былі апублікаваныя ў прэсе БССР 27 жніўеня 1957 году.[114] У гэтай пастанове, між іншым, даецца загад, каб для збору ўраджаяў на тэрыторыі рэспублікі мабілізаваць, на чале з настаўнікамі, і ўсіх школьнікаў дый піянераў, значыцца дзяцей у веку 10-14 год.

Іншы яскравы прыклад вынікаў дэпапуляцыі Беларусі масавымі дэпартацыямі, гэта зьява паўставаньня на тэрыторыі рэспублікі вялікіх абшараў цалінных земляў на месцы раней культываваных грунтаў. Аб гэтым маскоўская «Праўда» паведамляла яшчэ ў 1954 годзе.[115] Тое-ж сьцьверджаў ня раз на пленумах ЦК КПСС у Маскве першы сакратар ЦК КП БССР

---

[114] «Звязда», 27. 8. 1957.
[115] «Правда», 21. 10. 1954.

К. Мазураў, калі дакладваў аб «новай цаліне» ў Беларускай ССР дзеля закіданьня культываваных грунтаў дый неправоджаньня патрэбнае мэліярацыі. Той-жа Мазураў яшчэ ў 1957 годзе сьцьвердзіў, што ад 1950 году ў Беларусі пасяўныя плошчы збажжовых культураў скараціліся на 730 тысячаў гактараў. А, з другога боку, ён-жа ў 1961 годзе казаў: «пры адпаведнай дапамозе Беларусь можа прыбавіць да наяўных 6-ці мільёнаў гактараў ворнае зямлі каля 4-х мільёнаў гактараў выдатнае цаліны».[116]

Калі дакладней прыглядзіцца да праводжаных, ужо ад пары Сталінскае дыктатуры, масавых дэпартацыяў у СССР, дык даводзіцца сьцьвердзіць, што перасяленьнямі камуністычная Масква намагаецца дасягнуць не адну, а сваіх колькі важных імпэр'яльных мэтаў. Само здабываньне гэтым шляхам масаў таннае прыгоннае працоўнае сілы, гэта хоць і важны эканамічна, мамэнт, але далёка не адзіны й дэцыдуючы аспэкт савецкіх перасяленьняў. Дэпартацыі, найперш, асабліва ў Сталінскую пару, гэта адзін з шырака тарнаваных спосабаў расправы з палітычнаю й нацыянальнаю апазыцыяй да расейскага савецкага рэжыму. У паваенны час, пры помачы дэпартацыяў, гадамі праводзілася змаганьне з шырокім антысавецкім партызанскім рухам у Беларусі, Прыбалтыцы, Украіне. Некаторыя меншыя паўночна-каўкаскія народы, як Чэчэнцы й Інгушы, былі дэпартаваныя з свае спрадвечнае нацыянальнае тэрыторыі пагалоўна.

Далей, пры помачы сталых масавых вывазаў жыхарства, Масква намагаецца паслабіць тыя рэспублікі й народы, спасярод якіх масы дэпартаваных набіраюцца й вывозяцца. Гэта ня што іншае, як сталае «крывіпушчаньне» й абяскроўліваньне дадзеных народаў зь фізычна здаровага маладога й рэпрадукцыйна найбольш цэннага людзкога матар'ялу. Разам, гэта палягчае насыланай у тыя-ж рэспублікі расейскай каляніяльнай адміністрацыі скарэй і мацней перабраць у свае рукі кіраўніцтва палітычнага, эканамічнага й культурнага жыцьця народу, дый татальна й бяз рэшты ўзалежніць яго ад Масквы. З другога боку, і ў тых краёх, куды перасяленцы масава кіруюцца, адбываецца таксама паслабленьне аўтахтоннае нацыянальнасьці, спачатна праз яе разбаўленьне масаю перасяленцаў, а з часам і маёрызацыю, як гэта ўжо сталася, прыкладам, з Казахскаю рэспублікай, дзе Казахі сяньня апынуліся ў меншыні.

Праз высяленьні й перамешваньне масаў жыхарства рознае нацыянальнасьці Масква яўна намагаецца з часам маёрызаваць на іх-жа нацыянальнай тэрыторыі ўсе нерасейскія падсавецкія народы, каб некалі дасягнуць стану падобнага, як у Задзіночаных Стэйтах Паўночнае Амэрыкі, дзе тэрытар'яльных этнічных меншыняў няма. Вось, да падобнае «амэрыканізацыі» нацыянальнае структуры імпэрыі, як этапу да поўнае русыфікацыі, Масква сяньня й імкнецца.

Дык, хоць у афіцыйнай партыйнай прапагандзе за мэту масавых дэпартацыяў падаюцца пляны эканамічныя — асваеньне цаліны, індустрыялізацыя, засяленьне мала заселеных прастораў, то паслабленьне нерасейскіх народаў, — адных праз дыспэрсыю, другіх праз разбаўляньне й далейшую русыфікацыю, — гэта ў запраўднасьці адна з галоўных мэтаў савецкіх масавых перасяленьняў. Што не гаспадарчыя, а іншыя мяркаваньні дэцыдуючыя ў справе дэпартацыяў, відаць гэта на прыкладзе Беларусі. Ня раз, а дзесяткі разоў у савецкай прэсе, і на зьездах ЦК Камуністычнае Партыі

[116] «Звязда», 13. 1. 1961.

СССР паведамлялася аб тым, што ў Беларускай ССР, на Палесьсі, існуюць вялікія прасторы свае цаліны, дый, што ў выніку высяленьняў на тэрыторыі рэспублікі паўстаюць вялікія абшары новае цаліны дзеля нястачы працоўных рук для дагляду пасеўных грунтаў. Усе гэтыя факты Масква добра знае, і, калі, нягледзячы на гэта, і надалей з тэрыторыі рэспублікі ўсё-ж забірае ўвесь яе натуральны прырост жыхарства, каб перавозіць гэтыя людзкія масы колькі тысячаў кілямэтраў далей, на савецкія азійскія прасторы, гэта ўсё сьветчыць пра тое, што не эканамічныя мяркаваньні для Масквы галоўныя.

У перасяленчай акцыі, бясспрэчна, вялікае значэньне маюць і стратэгічныя пляны Масквы. І гэта ня толькі ў сэньсе нацыянальнага паслабленьня гэткім шляхам сваіх каляніяльных народаў дый замацаваньне свайго над імі панаваньня. Калі прыгледзіцца на карце да тэрыторыяў, куды ў сваей масе кіруюцца перасяленцы зь Беларусі, дык кідаецца ў вочы, што пераважна яны пасяляюцца ў паўдзённай паласе савецкае Азіі, уздоўж мяжы з камуністычным Кітаем. Сямісотмільённы Кітай належыць сяньня да найгусьцей заселеных краёў сьвету. Праз шпаркі натуральны прырост гушчыня засяленьня хутка далей узрастае. Гэткі працэс раней-пазьней можа давесьці да спробы пашырэньня межаў на рэлятыўна пустыя сумежныя азійскія прасторы Расейскае імпэрыі. Вось, масавым засяленьнем жыхарства на гэтых прасторах Масква, відавочна, і пробуе блякаваць загадзя шляхі магчымае экспансіі перанаселенага Кітаю на поўнач.

У суме-ж, савецкая масавая прымусовая міграцыя разьлічаная на замацаваньне расейскага панаваньня над нерасейскімі народамі, дый на падняцьце гаспадарчага й мілітарна-стратэгічнага патэнцыялу імпэрыі для лягчэйшага дасягненьня канчатковае мэты Масквы — дамінацыі над сьветам.

Калі ходзіць аб Беларусь, дык сыстэматычныя масавыя вывазы жыхарства бясспрэчна аслабляюць паважна ня толькі нацыянальна-палітычны патэнцыял рэспублікі, але й беларускага народу наагул. Дэпартаваныя з рэспублікі на мясцох свайго прызначэньня не пасяляюцца кампактнымі нацыянальнымі грамадамі, а раськідаюцца сярод жыхарства аўтахтоннага й перасяленцаў іншых нацыянальнасьцяў. Сяньня мільёны высяленцаў зь Беларусі параськіданыя па ўсім вялізарным прасторы імпэрыі ад Белага Мора на захадзе аж да Сахалінскае атокі Ціхага акіяну на ўсходзе. Беларускім перасяленцам, калі яны навет і акажуцца ў большай канцэнтрацыі ў нейкай акрузе, Масква не дазваляе мець сваіх беларускіх нацыянальных арганізацыяў, сваей прэсы, свайго друку, сваей беларускай школы. Гэтак, адарваныя ад свайго краю й этнічна-нацыянальнага асяродзьдзя, кінутыя на прасторы чужое зямлі, сярод няпрывычнае сабе прыроды й клімату, сярод чужых па мове, звычаях і псыхіцы людзей, беларускія перасяленцы сучаснымі камуністычнымі валадарамі Расейскае імпэрыі асуджаныя на хуткую дэнацыяналізацыю, русыфікацыю, на нацыянальную сьмерць.

Дый, як апублікаваныя ЦСУ вынікі перапісу 1959 году ў рубрыцы Беларусаў за межамі Беларускае ССР паказваюць, расейская партыйная адміністрацыя імпэрыі навет і ня чакае на тое, калі беларускія высяленцы запраўды зрусыфікуюцца. Іх ужо й цяпер запісваюць масава Расейцамі ня толькі па нацыянальнасьці, але й па мове, праўдападобна дапускаючы, што іхная доля і так наканаваная, шлях для захаваньня свае мовы й свае нацыянальнае апрычонасьці ім адсечаны. Гэткім спосабам дасягаецца шпаркае, найменш у лічбах статыстыкі, павялічаньне ліку пануючае ў імпэрыі

нацыянальнасьці расейскае, пры адначасным зьніжэньні лічбовае вялічыні народаў нерасейскіх.

Масавыя вывазы жыхарства Беларускае ССР, прыблізныя лічбовыя памеры якіх выяўляе перапіс 1959 году, ня спыняюцца й далей. Для праводжаньня вывазаў на перасяленьні ў рэспубліцы даўно існуе адмыслова пакліканая ўстанова: «Галоўнае ўпраўленьне па перасяленьню й арганізаванаму набору рабочых пры Савеце Міністраў БССР.» Гэтае «праўленьне» па ўсей рэспубліцы мае сетку сваіх акруговых і раённых аддзелаў, праз якія й праводзіцца набор жыхарства на вывазы. Кіраўніком гэтае цэнтральнае рэспубліканскае перасяленчае ўстановы гадамі быў Расеец М. І. Гусеў.

Для патрэбаў высяленчае акцыі каляніяльная адміністрацыя рэспублікі вядзе сталы ўлік «лішніх працоўных рэсурсаў». У публікаваным у 1957 годзе Акадэміяй Навук БССР гаспадарчым агглядзе Беларускае ССР увесь час адзначаюцца акругі й раёны рэспублікі, што маюць большыя ці меншыя «лішкі» працоўных «рэсурсаў». У той-жа публікацыі ёсьць і сьцьверджаньне ўплыву дэпартацыяў на агульны лік жыхарства рэспублікі: «У паваенныя гады, нягледзячы на хуткі натуральны прырост, лік жыхарства (Беларускае ССР) у сувязі зь перасяленьнямі ў раёны новага гаспадарчага асваеньня павялічаецца паволі».[117] Што вывазы ня спыняюцца, а праводзяцца масава й пасьле перапісу 1959 году, пра гэта паведамляе прэса БССР. Прыкладам, менская «Звязда» з 17 сакавіка 1961 году зьмясьціла інфармацыю БЕЛТА (Беларускае Тэлеграфічнае Агенцыі) аб тым, што на сталае пасяленьне ў саўгасы Казахстану 15 сакавіка было адпраўлена эшалонам 115 сем'яў з Горадзенскае акругі. У тым-жа паведамленьні гаворыцца: «У сакавіку эшалоны зь перасяленцамі адпраўляюцца з рэспублікі на цаліну праз кажныя два дні... 16 і 17 сакавіка адправяцца новыя эшалоны зь перасяленцамі зь Менскай, Берасьцейскай і Гомельскай акругаў».[118] З гэтых паведамленьняў відаць, што Масква й далей наважаная забіраць з рэспублікі ўвесь ейны натуральны прырост жыхарства й нішчыць гэтак магчымасьці яе росту, разьвіцьця, яе будучыню.

Гэтак, расейскія камуністычныя валадары імпэрыі Беларускую ССР сяньня яўна выкарыстоўваюць у ролі калёніі адмысловага прызначэньня: быць рэзэрвуарам працоўнае прыгоньніцкае сілы, зь якога Масква можа чэрпаць уволю патрэбныя сабе масы жыхарства для асвойваньня, індустрыялізацыі й засяляньня далёкіх прастораў імпэрыі, а разам дэнацыяналізацыі й русыфікацыі іншых каляніяльных народаў і краінаў.

Для Беларускае-ж ССР плянавае, сыстэматычнае вылюдненьне нясе спад яе дэмаграфічнага, гаспадарчага й нацыянальнага патэнцыялу, што сьпіхае рэспубліку да рангі менш важнае й палітычна й эканамічна Маскве падпарадкаванае татальна каляніяльнае правінцыі імпэрыі ў савецкую эпоху яе існаваньня.

---

[117] Белорусская ССР. Институт Экономики Академии Наук БССР. Москва, 1957, б. 71.

[118] «Звязда», 17. 3. 1961.